ІЛЬЯ ГУРСКІ

# ЗАРЫ НАСУСТРАЧ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК 1949

Б 8/29289

ІЛЬЯ ГУРСКІ

# ЗАРЫ НАСУСТРАЧ

АПАВЯДАННІ

Ба 29289
Бел. аддзел 1994 г.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
*Рэдакцыя мастацкай літаратуры*
Мінск 1949

*Вокладка мастака В. Мурашова*

25 4. 2009

## *Перад бурай*

Веялі жнівеньскія паўночныя вятры, пераганялі адна другую свінцовыя хмары, што плылі з узмор'я, засцілаючы блакітнае неба шэраватым убраннем. На адным баку балотнай поўнаводнай рэчкі, якая змейкай вілася сярод кустоў лазы, на невялічкай градзе, сярод шырокіх прастораў цёмназялёных сенажацяў, узвышаліся кудравыя бярозы. У сіняе возера ўпаў пажоўклы скарабачаны лісток, вецер пагнаў яго да чаротаў, што раслі навокал топкіх берагоў. Каля рэчкі, вада якой рабацела і пабліскввала на сонцы, стаяў на адной назе бусел. З-за куста выскачыў хлопчык, з адною падкасанаю да калена калашыною, у яго руках быў сухі аскабалак. Ён шпурнуў яго ў бусла; той, нібы падражніваючыся з падлеткам, пастаяў з паднятымі крыллямі, гатовы да ўзлёту, а потым сабраў іх і, паважна, як на спацыры, пайшоў у бок узвышша, на якім зелянелі прысадзістыя яліны з зубчатымі вершалінамі.

На паплавах, нібы на пасланых зялёных дыванах, узвышаліся крыху парыжэлыя ад дажджоў і сіверу стагі, пахла духмяным сенам. Каля шалаша, зробленага стараннымі рукамі, трымцелі на ветры рыбалоўныя снасці, дрыжэлі тонкія канцы вудзільнаў, ледзь прыкметна для

вока пагойдвалася на суку дубальтоўка, тырчэла каса, водбліск ад яе падаў на зямлю. Патрэскваў касцёр, шугала полымя, ляцелі ва ўсе бакі іскры, тухлі ў паветры і чорнымі кропкамі падалі на траву, абвіваліся чырвоныя істужкі навокал пачарнелага, падвешанага на палцы салдацкага кацялка, у якім варылася небагатая страва. З кацялка тырчэў пук зялёнай цыбулі, якая яшчэ не паспела змяніць свайго колеру. За шалашом, схаваўшыся ад ветру, схіліўшыся над паперамі, на пні сядзіць чалавек. Ён не адрываючыся піша і піша. Па ўсяму відно, што праца ідзе добра, бо чалавек ледзь паспявае запісваць свае думкі, ён піша старонку за старонкай. Чалавек да таго захапіўся работай, што ў задуменні падняў руку і хацеў пагладзіць лысіну, зусім забыўшыся, што ён у шапцы, пад якой была чорная шэвелюра. Не заўважаючы гэтага, ён працягваў пісаць. Роўнымі радкамі лажыліся літары, выкладалася на паперу мудрасць чалавека, стваралася кніга, якой суджана жыць вякі. Задаволены, чалавек прыжмурыў вочы, каля якіх сабраліся дробныя маршчынкі, хацеў было ўзяцца за бараду, нават падняў руку, а пасля апамятаўся, што яе няма; паглядзеў на сціснуты кулак і сам сабе ўхмыльнуўся. Ён, відаць, яшчэ не прызвычаіўся да таго, што барада пагалена. Потым чалавек зняў шапку і павесіў на сучок, крыху патрывожыў сваю чупрыну.

Хаваючыся ад агентаў Часовага ўрада, Владзімір Ільіч апынуўся ў шалашы паблізу станцыі Разліў. Ленін вымушаны быў пайсці ў падполле, таму што адразу-ж пасля ліпеньскіх падзей у Петраградзе быў выданы загад аб яго арышце. Сышчыкі збіліся з ног, каб знайсці месца, дзе хаваўся Ленін, але ім гэтага не ўдавалася зрабіць. Ітак, прайшло толькі пяць месяцаў, як быў скінуты царызм, а бальшэвікі ўжо вымушаны былі пайсці ў падполле, а Ленін — хавацца, рыхтуючыся да паўстання.

— Канстанцін Пятровіч! — занепакоілася жанчына,

што варыла яму абед,—яна ўгледзела незнаёмага рыбалова, які хадзіў каля рэчкі. — А чаму вы без шапкі?..

Владзімір Ільіч схамянуўся і стаў папраўляць чупрыну, з-пад якой відаць была лысая галава і вялікі лоб. Хлопчык, што ўвесь дзень круціўся каля маці, якая даглядала за Владзімірам Ільічом, нічога гэтага не заўважыў.

Закружыў вецер, падхапіў ліст рукапісу; хлопчык падняў ліст, спісаны дробным уборыстым косым почаркам і прачытаў: Ф. Ф. Іваноўскі. Загаловак: «Дзяржава і рэволюцыя». Падзагаловак: (Вучэнне марксізма аб дзяржаве і задачы пролетарыята ў рэволюцыі). Падлетак задаволена ўсміхнуўся — ён ведае сакрэт Канстанціна Пятровіча, пад якім прозвішчам выйдзе яго кніга. А хто такі Канстанцін Пятровіч? Бацькі хлопчыку не сказалі, аднак дзіцячая душа, відаць, нешта адчувала, падлетак праяўляў вялікую цікавасць да госця. Яны за апошні час так падружылі, што хлопчык гатоў быў дзень і ноч праводзіць з Канстанцінам Пятровічам, які расказваў хлопчыку шмат цікавага.

Владзімір Ільіч упершыню падпісваў свой твор псеўдонімам Ф. Ф. Іваноўскі, каб зблытаць карты агентам Керанскага, якія днём і ноччу яго шукалі; ён ведаў, што Часовы ўрад неадкладна канфіскаваў-бы кнігу, падпісаную Леніным, ці адным з яго вядомых псеўдонімаў.

У хлопчыка былі шчокі, як макаў цвет. Яго вочы ўсміхаліся, падлетак гатоў быў сваволіць. А маці непакоіла, што гэта за рыбалоў хадзіў па беразе, але яна не падавала віду, што хвалюецца.

Владзімір Ільіч паглядзеў на хлопчыка і заўважыў, што ў падлетка адбываецца на душы нешта такое, міма чаго даросламу ніяк нельга прайсці, або адмахнуцца, — можна пакрыўдзіць чуллівую дзіцячую душу, якая не церпіць абыякавасці. Ленін пільна паглядзеў на хлопчыка, жадаючы дазнацца, што ў яго за радасці.

— Канстанцін Пятровіч! — не вытрымаў падлетак. — Доўгія штаны...

— А-а-а, — сам сабе ўхмыльнуўся Владзімір Ільіч, падумаўшы: «Вось ты і залезь у душу дзіцяці», потым прагаварыў: — Ну, значыць, прыдзецца даць стрэліць... Ты ўжо амаль дарослы...

Хлопчык ад радасці аж падскочыў, Канстанцін Пятровіч разгадаў патаемныя думкі падлетка.

— Колькі радасці прынесла яму гэта абноўка, — гаварыла шчаслівая маці. — Дзе ён толькі сёння не быў, нават на станцыю хадзіў, мусіць, каб пахваліцца перад людзьмі...

— Нічога дзіўнага ў гэтым няма, — зазначыў Владзімір Ільіч. — Дзеці, яны жывуць сваім жыццём... У іх свае радасці...

— Канстанцін Пятровіч! — падумаўшы, запыталася жанчына. — Можа абедаць будзеце?

— Нешта не хочацца, — сказаў Владзімір Ільіч і, паглядзеўшы на гадзіннік, дадаў, — хоць ужо час. А як у вас з прадуктамі?

— Прадукты ёсць, Канстанцін Пятровіч, — жанчына паглядзела на хлопчыка, які басклапотна бегаў каля возера, а потым паведаміла. — Коба паклапаціўся.

— Коба з Піцера шле, там яму самому цяжка, — прагаварыў госць. — Я яшчэ крыху папрацую.

— Не, Канстанцін Пятровіч, — настойвала жанчына. — Вы з самай раніцы сёння працуеце. Адпачылі-б трохі, прагуляліся, ці схадзілі-б на паляванне. Колькі тут за вайну развялося ўсялякай дзічы! Мне і так будзе ад мужа за спазненне з абедам, ён правярае, як я нават ступлю. Дый абед, пэўна, астыў, хоць я яго ўкруціла і паставіла ў стог.

У голасе жанчыны гучэлі няўмольныя ноткі. Ільіч паглядзеў на яе добрыя, поўныя цеплыні, глыбокія, як мора, карыя вочы і згадзіўся паабедаць.

— Значыць абавязкова? — мыючы рукі, пытаўся Ільіч.

— Так, — падаючы ручнік сцвердзіла жанчына і паспяшыла ісці да стогу, дзе быў схаваны абед, каб ён не астыў. Жанчына сама сабе падумала: «Які ён просты і добры, а я баялася — як з ім гаварыць. Вялікія людзі, відаць, усе такія. Яны з кожным знойдуць агульную мову. А Ленін самы вялікі з вялікіх. Вось гэта чалавек!»

Уладзімір Ільіч, сеўшы на траве, дзе на пасланай белай сурвэтцы стаяла талерка з стравою, ад якое ішла пара, ляжаў пакроены хатняй выпечкі хлеб, абедаў. Ежа была на-дзіва смачнай, вядома, на свежым паветры. Жанчына з боку наглядала за сваім госцем, шчаслівая, што яму абед спадабаўся; яна была рада, што дагадзіла такому госцю.

Падлетак падбег да агню і стаў поркацца ў прыску, час-ад-часу хітра паглядаючы на Канстанціна Пятровіча, жадаючы звярнуць на сябе ўвагу.

— Дык як, Пятрусёк, — загаварыў Ільіч, адчуўшы што падлетак прагне размовы, — пасля абеду пойдзем на паляванне?

— Пойдзем,—ажывіўся хлопчык, разгортваючы прысак, і выпаліў: — А толькі я не Пятрусёк, а Віця Разліўцаў!

— Чаму? — здзівіўся Ільіч.

— А чаму вы Ф. Ф. Іваноўскі? — адказаў пытаннем на пытанне хлопчык, а пасля дадаў:—Віця між іншым, а Разліўцаў таму, што жывем недалёка ад станцыі Разліў.

Ільіч весела засмяяўся, аж неяк адкінуўся назад, а потым пасуравеў і нахмурыў бровы, якія сышліся на пераноссі. Маланкай пранеслася думка: «Патрэбна вялікая асцярожнасць: часамі людзі, зусім не жадаючы нічога зрабіць дрэннага, могуць прагаварыцца і гэтым пашкодзіць справе».

— А каб пра мяне хто распытваў,—выпрашыў праверыць Ільіч хлопчыка, — што-б ты сказаў?

Владзімір Ільіч зусім непрыкметна для сябе камячыў у руках палявую рамонку, а потым наводшыб адкінуў.

— Гэта наш дарагі госць, Канстанцін Пятровіч Іваноў, — усміхаючыся гаварыў хлопчык, а пасля прапанаваў. — Канстанцін Пятровіч! Бульбу печаную будзеце есці? Лепш любога кампоту!

— З прыемнасцю, — сказаў Ільіч, ён перакананаўся, што хлопчык не ведае, хто такі Канстанцін Пятровіч Іваноў, і заспакоіўся. Ён ахвотна ўзяў з рук падлетка падрумяненую сопкую скараспелку.—Ах, бульба! Выключна добрая!

— Канстанцін Пятровіч! — Пасля задумы загаварыў падлетак. — Вось вы жылі ў Піцеры, а ці бачылі вы Леніна?

— Бачыў, — насцярожна адказаў Ільіч і запытаўся. — А што?

— Ды раніцою на станцыі акружылі поезд, ва ўсіх правяраюць дакументы, кажуць—шукаюць Леніна. Сабралася многа людзей. А нейкая бабулька хрысціцца і просіць бога, хоць-бы не знайшлі Леніна. «Напакутаваўся, — кажа бабулька, — ён за нас пры цару, і брата яго цар павесіў, а цяпер гэты акаянны Керанскі хоча Леніна зноў у турму пасадзіць і зрабіць з ім расправу. Сцеражы яго бог!» А потым хтосьці крыкнуў: «— Не дадзім арыштаваць Леніна!» «— Не дадзім»—адказаў натоўп. А каб вы ведалі, як людзі былі рады, калі даведаліся, што Леніна не знайшлі.

— Рады? — перапытаў Ільіч.

— Так, — сцвердзіў падлетак. — А Лёнькін тата, стрэлачнік, сказаў: «Нашага Леніна не так проста ўзяць. Ён яшчэ пакажа Керанскаму, дзе ракі зімуюць!»

— Гэтак і сказаў, — усміхнуўся Ільіч.

— Агы, — прагаварыў хлопчык, у яго загарэліся вочы. — А які Ленін? Мусіць вялікі, вялікі? Большэвік?

— Большэвік, — сцвердзіў Ільіч.

— Канстанцін Пятровіч! — падышоўшы, запыталася жанчына. — Можа вы адпачнеце? Лезе ён да вас з сваімі размовамі.

— А мы з ім гаварылі пра тое, ці ведае ён, як зваць госця, калі-б хто пытаўся, — усміхаўся Ільіч. — А потым перайшлі на палітыку...

— А ён каб што і ведаў, дык нічога-б не сказаў, — з гордасцю за сына прагаварыла маці. — Ён умее трымаць язык за зубамі... да гэтага яго прывучыў бацька...

— Мы з ім пойдзем на паляванне, — Ільіч паглядзеў на пачырванелыя ногі хлопчыка і сказаў. — А толькі абуйся, холадна, дый трава колецца...

Хлопчык ускочыў і хутка пабег да стога, каб абуцца.

— Канстанцін Пятровіч, можа чайку вып'еце?

— Пасля, — Ільіч паглядзеў у бок шалаша і, звяртаючыся да хлопчыка, крыкнуў, крыху картавячы. — Ну як, Разліўцаў, гатоў!..

— Іду, Канстанцін Пятровіч!

— Возьмеш стрэльбу!

— Добра, — хлопчык быў рады, што яму даверылі дубальтоўку, ён ускінуў яе на плячо і важна прайшоў каля маці.

Жанчына заглянула ў шалаш, павесіла плашч, яна лічыла за шчасце, што даглядае за такім чалавекам. Яе толькі непакоіла тое, што пачыналіся дажджы, ноччу ў шалашы было холадна і вільготна, сям-там прасвечвала; яна агледзела шалаш, расправіла сена, падбіла падушку. «Такі чалавек,—падумала сама сабе жанчына, — вымушаны хавацца, туляцца ў гэтым шалашы. Якая-ж гэта рэволюцыя... На верх усплылі трэскі... Але разбушуецца мора людское і змяце ўсе перашкоды на сваім шляху... Страшны ў гневе народ... Народу варта дзьмухнуць—будзе бура...».

У Разліве, на станцыі, на розныя галасы перакліваліся паравозы. Жанчына паглядзела ў бок станцыі і

заўважыла чалавечую постаць — чалавек ішоў у гэты бок, яна зменшыла агонь, каб не выкіпела ў кацялку страва, узяла граблі і пайшла насустрач незнаёмаму. Ёй здалося, што ідзе нейкі ваенны,—яно так і было — ішоў чалавек у шынялі. Жанчына зусім неўзаметку для сябе стала кусаць пазногці. Як толькі незнаёмы параўняўся з жанчынай, ён прыветліва ўсміхнуўся і спытаўся:

— Вы што ўжо ўправіліся з сенам?

— Ды не яшчэ, пагода не падыходзячая, — адказала насцярожана жанчына і дадала, — клімат тут такі, што так хутка не ўхопіш. Раніцай сонца свеціць, а ўпоўдзень дождж ідзе. А ў вас як?

— А ў нас асабліва клімат благі, — націснуўшы на слове «клімат», шырока ўсміхаючыся, адказаў незнаёмы. — Але нічога, Марыя Іванаўна, перажывем. Будзе і на нашай вуліцы свята...

— Адкуль вы мяне ведаеце?

— Ад вашага мужа, Максіма, ён сказаў мне вашы прыкметы. Вось вам ад яго запіска, каб не сумняваліся,— і незнаёмы працягнуў канверт.

— Вы хто? — другім тонам запыталася жанчына.

— Серго. Чулі такога?

— Орджанікідзе. А як-жа! Мне Максім пра вас гаварыў.

— Вельмі добра, — вітаючыся сказаў Серго. — Мне трэба пабачыць Канстанціна Пятровіча. Як яго здароўе?

— Нічога.

— Чым вы яго корміце? Прадукты ёсць?

— Ёсць.

— Што ён цяпер робіць?

— Пайшоў з сынам на паляванне.

— Далёка?

— Не, бачыце, ён ходзіць каля возера.

— Я прайду туды.

— Калі ласка. А толькі адправіце адтуль сына, каб ён не перашкаджаў вам гаварыць. Серго, відаць, хацеў

штосьці сказаць, але Марыя яго перабіла. — А яму ўжо час ісці дадому. Сонца схавалася за лес. Я каля шалаша буду яго чакаць.

— Добра.

І Серго наперарэз пайшоў у напрамку да возера, дзе Ільіч хадзіў з хлопчыкам. Жанчына, ідучы, наглядала, як Серго лёгка перабіраўся з купіны на купіну, пераадольваючы дрыгву. А потым яго зусім не стала відаць, жанчына вярнулася да шалаша і стала рыхтаваць вячэру.

Калі Серго падыйшоў да Ільіча, дык застыў у нерашучасці, ён зусім разгубіўся: перад ім быў зусім не той чалавек, якім ён ведаў Леніна. Серго здзіўлена глядзеў, пераміналочыся з нагі на нагу.

— Што, не пазналі? — засмяяўся Ільіч.

— Зусім перамяніліся, — і Серго хутка пайшоў насустрач да Леніна. — Як вы тут сябе адчуваеце?

— А нічога, мяне ўжо прыходзяць наймаць касіць,— пасмейваючыся гаварыў Ільіч. — Вось толькі дажджы даймаюць, яны не даюць супакою.

— Коба даў заданне падшукаць вам кватэру. Магчыма прыдзецца пераехаць у Фінляндыю...

— А гэта ён правільна робіць.

— Канстанцін Пятровіч! — падбег хлопчык да Ільіча, уважліва разглядаючы з галавы да ног незнаёмага, а потым ледзь не шэптам вымавіў. — Унь там, за аерам, качар!

— Так і быць, адзін набой у нас яшчэ ёсць, паспрабуй ты сваё паляўнічае шчасце, — і Ільіч, падміргнуўшы, даў хлопчыку стрэльбу.

У Пятруся ад радасці засвяціліся вочы, сталі вялікімі, круглымі; падлетак, прыгінаючыся да зямлі, як добра спрактыкаваны паляўнічы, ішоў у бок невялікага азярка, якое зарасло кругом аерам. Владзімір Ільіч і Орджанікідзе, затаіўшы дыханне, сачылі за хлопчыкам. Падлетак злажыўся і стрэліў. Качар залапатаў крыллямі,

узняўся, нават не страціўшы ні аднаго пяра, і хутка падаўся ў бок.

— Ах ты, якая прыкрасць! — прагаварыў Ільіч.

Нездаволены промахам, збянтэжаны хлопчык падбег да Ільіча і спяшаючыся сказаў:

— Дазвольце мне пайсці да шалаша?

— А што ты там будзеш рабіць?

— Дапамагаць маме, — хітра адказаў хлопчык.

— Ну ідзі і стрэльбу занясі.

— Добра, — падлетак ускінуў дубальтоўку на плячо і хутка пайшоў у напрамку да шалаша.

— Хіцёр! — усміхнуўся Серго. — А маці, відаць, непакоілася, што ён сам не здагадаецца нас пакінуць, і прасіла яго накіраваць да яе.

— Заўзяты канспіратар, а які псеўдонім сабе выбраў. Разліўцаў!.. Ха-ха-ха!

— Хіцёр!—і Серго таксама голасна зарагатаў, што падлетак, які ўжо далёка адышоўся, пачуў і павярнуўся, а пасля хутчэй закрочыў.

Владзімір Ільіч і Орджанікідзе прыселі каля нахіленага стога сена, які здавалася не вытрымае моцнага напору ветра. Ільіч, пералістваючы паперы, — матэрыялы нелегальнага з'езда партыі, які толькі што адбыўся ў Петраградзе, — прывезеныя яму Серго, спыніўся на сказаных словах Сталіным і голасна іх прачытаў:

«Не выключана мажлівасць, што іменна Расія з'явіцца краінай, якая пралажыць шлях да соцыялізма... Трэба адкінуць аджыўшае ўяўленне пра тое, што толькі Еўропа можа паказаць нам шлях. Існуе марксізм дагматычны і марксізм творчы. Я стаю на глебе апошняга».

— Добра сказана, правільна, па-марксісцку, — заўважыў Владзімір Ільіч, перагортваючы старонкі. — Трэба трымаць курс на падрыхтоўку ўзброенага паўстання... Так, так... Вось іменна, саюз пралетарыята і бяднейшага сялянства, — умова перамогі соцыялістычнай рэво-

люцыі...,—і адарваўшыся ад матэрыялаў, запытаўся:— А які настрой у Піцеры?

— Рабочыя і салдаты масамі пакідаюць меншавікоў і эсэраў, пагардліва называюць іх «соцыял-турэмшчыкамі», — адказаў Серго.

— Гэта добра, — сказаў Ільіч і падумаўшы дадаў. — Нам трэба будзе браць уладу сілаю. А ўзяць уладу сілаю здолее толькі пролетарыят у саюзе з вясковай беднатой. А што ў Маскве, у Мінску?

— І ў Маскве і ў Мінску мы маем паварот народнага руху да нашай партыі.

— Так і павінна быць, — Уладзімір Ільіч падняўся і, ідучы з Серго ў кірунку да шалаша, уголас разважаў. — Паўстанне выспявае. У хуткім часе большасць народу будзе за нас. Нам трэба будзе ў час падняць народ на барацьбу. Перад гэтым неабходна мець канкрэтны план паўстання, як выкарыстаць вайсковыя часці, флот і чырвонагвардзейцаў, якія рашаючыя пункты трэба будзе ў першую чаргу захапіць, каб забяспечыць поспех паўстання... Усё гэта неабходна раней распрацаваць... Трэба будзе стварыць Партыйны цэнтр па кіраўніцтву паўстаннем... На чале Партыйнага цэнтра павінен стаць чалавек з жалезнай воляй... Ёсць у нас такі чалавек, гэта Сталін...

Яны падыходзілі да шалаша. Навісла вялізная чорная хмара, стала холадна. Жанчына прапанавала Уладзіміру Ільічу шарсцяную хустку, але ён адмовіўся. Убачыўшы, што хлопчык ад холаду пасінеў, Ільіч накінуў на плечы падлетка хустку і прапанаваў маці ісці з сынам дадому.

— А як быць з вячэрай? — нясмела запярэчыла жанчына.

— Было-б толькі што вячэраць, а астатняе само прыложыцца, — сказаў усміхаючыся Уладзімір Ільіч.

— Як-жа гэта так, тады хоць я разалью па талерках, — жанчына сама адчувала, што Уладзіміру Ільічу трэба пагаварыць з Серго, аднак яе непакоіла, што яны застануцца галоднымі. Убачыўшы разгубленасць жанчы-

ны, Ільіч згадзіўся зараз-жа павячэраць. — А чай мы самі пап'ем.

— Добра, — з палёгкай уздыхнула жанчына, падаючы ў талерках юшку, якая прыемна пахла.

— Выключная юшка! — не ўтрымаўся Серго, каб не пахваліць ежу.

Пасля вячэры гаспадыня хутка прыбрала пасуду, разліла чай, і задаволеная, што госці паелі, з хлопчыкам пайшла дахаты. На развітанне жанчына ад душы пажадала:

— Спакойнай ночы!

— Шчаслівай дарогі! — адказаў Ільіч, правёўшы вачыма хлебасольную гаспадыню.

Да самага цягніка, які адпраўляўся ноччу ў Піцер, Уладзімір Ільіч прагаварыў з Серго, абмяркоўваючы пытанні рэвалюцыі ў Расіі, заваёвы бальшэвікамі ўлады, малюючы перспектывы развіцця сацыялістычнай дзяржавы.

Раніцою жанчына застала Уладзіміра Ільіча за касьбой — гэта была яго ранішняя зарадка. Пасля снедання і да самага абеду Уладзімір Ільіч не адрываючыся працаваў над кнігай, а пасля з хлопчыкам пайшоў на прагулку.

Жанчына заўважыла, як хтосьці набліжаўся да шалаша, яна паспяшыла яму на спатканне. Але хутка па паходцы Марыя пазнала мужа, які нёс у руках кажушок.

— Як Ільіч?—першае пра што спытаўся Максім.

— Толькі што паабедаў, — адказала Марыя.

— А чаму так позна?

— Увесь час працаваў.

— А чым ты яго карміла?

— Варыла боршч з мяснымі кансервамі, — як быццам апраўдваючыся гаварыла Марыя. — А на другое — смажаная рыба. Другога нічога няма. Яшчэ Пятрусёк пёк бульбу, спадабалася, сказаў добрая.

— Што-ж, чым багаты, тым і рады, — гаварыў Максім. — Сёння як-небудзь, а заўтра будзе лепей. Коба яшчэ прыслаў прадуктаў. Я іх палажыў у кухонную шафу. Ты нешта хацела сказаць?

— Ведаеш што, — паведамляла ўстрывожаная Марыя, — чагосьці зачасцілі каля шалаша людзі. Учора прыходзіў нейкі наймаць Ільіча касіць.

— Аб гэтым я ўжо ведаю, мне сказаў Серго, я праверыў таго чалавека. А хто яшчэ?

— Не падабаецца мне адзін рыбалоў, які ўвесь час снуе каля рэчкі.

— А як ён адзеты? — устрывожыўся Максім.

— У салдацкай ватоўцы з кацялком на рамяні. У яго цераз усю шчаку рубец, мусіць, на вайне чалавек дастаў.

— А-а-а, — успамінаў Максім, — я яго знаю. А ўсё-ж трэба асцерагацца... Душа чалавека не кажух, не вывернеш...

— Толькі-б добра абышлося,—сказала Марыя.

— Ільіча трэба берагчы, — загаварыў зноў Максім. — Ты зразумей толькі, Марыя, тут у шалашы — штаб рэвалюцыі.

— Ведаю,—прагаварыла Марыя і запыталася.—А навошта ты нясеш гэты кажушок?

— Госцю накрыцца.

— Няўжо-ж ты нічога лепшага не знайшоў? — пачырванела Марыя.

— Каб не было падазронасці, — растлумачыў Максім. — А многа сёння напісаў Ільіч?

— Многа, з самай раніцы не адрываючыся працаваў.

— Колькі ў гэтага чалавека энергіі, якая працаздольнасць! — разважаў Максім. — І ўсё чалавек для нас робіць, для людзей, якія з мазаля жывуць. У нас сіла — гэта верна, але да гэтай сілы яшчэ патрэбны вя-

лікі розум, а не будзь у рабочых такіх людзей, як Ленін і Сталін, чаго мы тады варты...

І Максім неяк выпрастаўся, бліснуў шэрымі вачыма, задаволена ўсміхнуўся, горды за сваіх правадыроў, якім няма роўных.

— А чаму да нас не прыедзе Сталін? — пыталася Марыя.

— Работы ў Сталіна многа, — адказаў Максім. — Ой, колькі ў яго работы!

— А якія навіны ў Піцеры?

— Павар'яцелі слугі Керанскага, усюды шныраюць. На кожнай станцыі правяраюць дакументы, шукаюць Леніна.

— Непрыкметнаму чалавеку спакайней жыць на свеце, — заключыла Марыя.

— Дзіва! — заўважыў Максім. — Ага, ты неяк казала, што мусіць у Ільіча плашч не з яго плячэй. Яно так і ёсць, гэта плашч Свердлова, які, калі Леніну пагражаў арышт, скінуў з сябе плашч і надзеў на Ільіча, каб яго не так лёгка было пазнаць. У гэтым плашчы Ленін з Свердловым вышлі з дому незаўважанымі. Чаго толькі цяпер у Піцеры не плятуць пра Ільіча, адны кажуць, што Ленін уцёк за граніцу ў Германію на мінаносцы, а другія на падводнай лодцы.

— Выходзіць, Ільіч абвёў сышчыкаў кругом пальца, — задаволена ўсміхнулася Марыя.

— Так, — сцвердзіў Максім.

Яны падышлі да агню, у кацялку гатавалася вячэра. Марыя засталася каля шалаша, а Максім пайшоў у бок рэчкі; там хадзіў Владзімір Ільіч, які заўважыўшы гаспадара, хутка вяртаўся да шалаша.

Па небу наперагонкі беглі шэрыя хмары, збіраліся ў гурт, і калі хавалася сонца, было холадна, праймаў вецер да касцей.

Сустрэўшыся з Ільічом, Максім перадаў яму пошту, сярод якой былі пісьмы ад Кобы і Крупскай, і газету «Правда». Ільіч падышоў да шалаша, сеў на пень, з прагнасцю прачытаў карэспандэнцыю, праглядзеў газету, і, нібы нешта ўспамінаючы, сам сабе сказаў:

«— Бура! Хутка ўдарыць бура!»

— А як хутка? — запытаўся Максім, а пасля заўважыў. — Адзін мужык сказаў: «Пакуль сонца ўзыйдзе, раса вочы выесць...»

— А мужык чакае ўзыходу сонца? — нібы сам у сябе пытаўся Ільіч і адказаў: — Чакае... Вось і ўтворым дзяржаву рабочых і сялян... Мне нават уяўляецца герб першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы, там абавязкова павінен быць серп і молат... А рэвалюцыя не за гарамі, яна набліжаецца... Можа праз месяц ці два... А як здароўе Кобы?

— У парадку. А ён клапоціцца пра вас, хоць-бы вам было добра. Ага, Серго казаў вам, што Каменеў і другія патрабавалі, каб вы з'явіліся на суд контррэвалюцыянераў. Коба рашуча выступіў супроць гэтага, ён лічыць, што гэта быў-бы не суд, а расправа.

— Казаў, — Ільіч грэбліва скрывіўся. — Дзіўна, простым людзям зразумела, што нельга пападацца ў рукі контррэвалюцыянераў, а каменевы і ім падобныя... Хоць, што з іх узяць... Балота...

— Яшчэ Коба цікавіўся, як ідзе праца над кнігай?

— Трэба паскорыць напісанне гэтай кнігі, таму што пасля не будзе часу, — сказаў Ільіч, а пасля, заклаўшы пальцы ў верхнія кішэні камізэлькі, хутка захадзіў — відаць у яго выспяваў якісьці план дзеяння. Потым сеў і стаў чытаць кнігу, прывезеную Серго, робячы на палях нейкія паметкі.

Хлопчык ужо даўно быў адпраўлены дахаты, а Марыя хоць і зварыла вячэру, але не ішла, каб самой да-

гледзець Ільіча. Яна асцярожна хадзіла каля агню, баючыся патрывожыць Ільіча, відаць, ён нешта важнае абдумваў. А Максім з вудачкай сядзеў над рэчкай, але ён гэта рабіў толькі для прыліку, на самай справе ён ахоўваў свайго госця. З гэтага месца добра праглядаліся ўсе подступы да шалаша. У Максіма не выходзіў з галавы рыбалоў, пра якога яму паведаміла жонка.

Хутка садзілася сонца, пранеслася чарада белых з чорнымі крыллямі чаек, неяк дзіўна кігікаючы. Снавалі ластаўкі, крыллямі дастаючы ваду.

Рвануў вецер, недзе далёка грымнуў гром, данесліся сюды яго раскаты, зазіхацелі стрэлы маланкі. Насоўваліся з узмор'я чорныя хмары.

Такое надвор'е ў гэтыя хвіліны мусіць адпавядала настрою Ільіча, бо ён цяпер быў зусім не такім, якім яго прызвычаіліся бачыць у часе працы і адпачынку, а ў нейкай новай якасці. Ён глядзеў кудысьці ў далечыню і здавалася, што гэты чалавек бачыць на тысячу год наперад, што ён прадбачыць ход падзей і накіроўвае іх у патрэбным кірунку, па адпаведнаму курсу. Здавалася, што ён стаіць на капітанскім мосціку і вядзе карабель рэвалюцыі у будучыню, дзе свабодна будзе жыць чалавек.

Пасля Ільіч зноў сеў, узяў паперу, нешта хутка напісаў, палажыў запіскі перш у адзін канверт, а потым у другі, заклеіў і спытаўся:

— А дзе-ж Максім?

— Ён рыбу вудзіць, — і крыкнула. — Максім!

— Іду, — адказаў Максім, ён пецярнёю, як граблямі, прыгарнуў свае чорныя, як смоль, валасы, і хутка падышоў да Ільіча.

— Гэтыя пісьмы неабходна хутчэй адправіць з самым надзейным чалавекам у Піцер па адрасатах. Хоць лепей вам самому адвезці. Заўтра з'ездзіце.

— Добра,—Максім паглядзеў на гадзіннік і сказаў:—Ёсць добрае правіла: што можна зрабіць сёння, ніколі не трэба адкладваць назаўтра...

— Вельмі добрае правіла, — зазначыў Ільіч, весела ўсміхаючыся. — Толькі сёння вы не паспееце. І ў мяне будуць яшчэ даручэнні, а сёння я іх не ўпраўлюся падрыхтаваць... Ах, які кароткі дзень...

— Можа павячэраеце?—звяртаючыся да Ільіча, запыталася Марыя.

— З прыемнасцю, — сказаў Ільіч. — Дый чайку не пашкодзіць, пагрэцца, ноч, відаць, будзе халодная. Але што нам, рыбакам, прызвычаіліся... Для большэвікоў няма такіх перашкод, якіх-бы яны не адолелі...

Марыя падала вячэру, Владзімір Ільіч з апетытам еў, відаць, доўгая прагулка дапамагла, а потым піў чай у прыкуску з цукрам. Сабраўшыся дадому, Марыя пажадала:

— Прыемнага сну!

— І вам таксама! — Ільіч крыкнуў. — Хустку вазьміце!

— А я сумысля вам яе пакінула, накрыецеся ноччу,— нахаду адказала Марыя, яна ўсміхнулася і паказала свае роўныя белыя зубы. Лёгка Марыя ішла дахаты, адчуванне ў яе было такое, што даглядаючы за Ільічом, яна робіць вельмі важную справу.

Згушчаліся хмары, абложыла ўсё неба, стала цёмна, як у калодзежы, загрукацеў гром, трэснула, бліснула маланка, і як з вядра лінуў дождж.

— Марыя Іванаўна, пэўна, яшчэ не дайшла дахаты,— прагаварыў заклапочана Ільіч.

— Нічога, не размокне, — адказаў Максім.

— Жанчыну трэба берагчы, — працягваў Ільіч.—Маці — самае дарагое для нас слова!

Яшчэ доўга, нібы сам з сабою, разважаў Ільіч, каратаючы ноч, якая так раптоўна насунулася. Дзе-ні-дзе

працякаў шалаш, марасіла. Час-ад-часу бліскала маланка, асвятляючы паплавы. Тады відаць былі бурбалкі, якія падскоквалі ў лужынах, што аблеглі кругом грудка, на якім стаяў шалаш.

Доўгай была тая ноч. Рвалі неўгамонныя вятры, і толькі пад раніцу стала ціха, нібы перад бурай.

*Студзень, 1947 г.*
*г. Мінск.*

## Партбілет

— Пакажыце ваш партыйны білет, — звярнуўся Нікіцін да ўвайшоўшага ў яго кабінет высокага, стройнага чалавека ў рагавых акулярах, з рыжай клінком бародкай.

Той, захоўваючы ўнутраную ўсхваляванасць, паклаў на стол невялічкую кніжачку ў скураным пераплёце, на якім былі выціснуты літары: «ВКП(б)»; што сведчыла аб прыналежнасці ўладальніка дакумента да самай перадавой і самай рэвалюцыйнай партыі ў свеце.

Нікіцін, бегла прачытаўшы, абвёў чалавека ў рагавых акулярах і рыжай клінком бародкай поглядам з галавы да ног і крыху прыўстаўшы, абапершыся рукамі на стол, здзіўлена спытаўся:

— Старобінскі, Нікалай Кузьміч?

— Так,—сцвердзіў Лявіцкі, сакратар партарганізацыі завода «Усход», які разам з сакратаром Гаркома партыі Нікіціным звяраў дакументы членаў партыі свае арганізацыі. — Інжынер. Нядаўна прыбыў.

— Адкуль? — павярнуўшыся да Лявіцкага, спытаўся Нікіцін. Ён быў адзеты ў поўвайсковую гімнасцёрку колеру хакі, з-пад яго густых броваў паблісквалі шэрыя

вочы, на галаве былі вялікія чорныя валасы, якія пасмамі звісалі.

— З Урала, — бойка адказаў Лявіцкі, яшчэ зусім малады хлопец і, відаць, неспрактыкаваны партыйны работнік, хоць быў усёй душою аддадзены справе партыі.

Нікіцін ужо каторы дзень асабіста прыводзіў у парадак гаспадарку ў сваім уласным партыйным доме, але такога выпадку ніколі не меў. Часам разыходзілася прозвішча ў картачцы і партбілеце. Бывалі выпадкі, калі не сходзіўся год нараджэння; траплялісія людзі, якія чамусьці імкнуліся стаць маладзейшымі, а для гэтага не задумваючыся, самі «амаладжваліся» на два-тры, а то і болей год. Адным словам, былі непарадкі. Нікіцін, старанна праверыўшы кожнага чалавека, заносіў у акт адпаведныя папраўкі. Але ў яго практыцы не было яшчэ такога выпадку, каб чалавек прыйшоў з чужымі дакументамі і тым больш, з дакументамі блізкага і дарагога яму чалавека. У першую хвіліну ён здзівіўся, а потым зазлаваў, што аж рукі сціснуліся ў кулакі.

— Кажаш, інжынер? З Урала? — звяртаючыся да Лявіцкага, перапытаў Нікіцін.

— Інжынер, актывіст, — адказаў Лявіцкі, — такіх, як ён у нас мала...

Нікіцін сам сабе падумаў: «Лепей-бы іх зусім не было». Перад яго вачыма ўва ўсёй велічы паўстаў вобраз баявога начдзіва Старобінскага Нікалая Кузьміча, аб якім ён кожны раз успамінаў з боллю ў сэрцы. Гэта быў сапраўдны чалавек, бальшэвік, задушэўны таварыш. Паміж імі была сапраўдная баявая дружба.

Нікалай Кузьміч Старобінскі загінуў на яго вачах. У адным з баёў на Заходнім фронце дывізія Старобінскага, з-за недахопу патронаў, вымушана была адступіць. Расстраляўшы ўсе патроны, Старобінскі кінуўся плысці цераз Нёман. Ён плыў, трымаючы ў руцэ партбілет, каб не замачыць. Пасля гэтага Старобінскі яшчэ больш стаў блізкім і дарагім.

Партбілет для яго быў самым каштоўным. Разразаючы адной рукою хвалі серабрыстага Нёману, у другой руцэ Старобінскі, як сцяг, высока над галавою, трымаў партбілет. Плылі тады яны разам. Нікіцін быў Начпалітаддзела дывізіі. Нікалай Кузьміч нешта прамармытаў, а толькі нічога за стралянінай нельга было пачуць.

Аглянуўшыся, Нікіцін убачыў толькі кругі і бурбалкі, што пакінуў пасля сябе начдзіў, ды партбілет, які асірацела плыў па цячэнню вады.

Ітак, не стала Старобінскага, баявога начдзіва. Нікіцін было паплыў у той бок, дзе загінуў яго таварыш, але чырвонаармеец Храпчанка загарадзіў яму дарогу, крыкнуўшы:

— Таварыш Нікіцін! Мы акружаны. Прападзем, калі...

І Нікіцін павярнуў да берага.

Удалым манеўрам яму тады ўдалося захаваць не адну сотню людзей, якія былі асуджаны на смерць. І толькі пасля таго, як бяда мінула, ён ніяк не мог сабе дараваць, што паслухаў байца.

Трымаючы ў руках партбілет таго, чыё імя было так дорага для яго і напамінала Нікіціну аб слаўных баявых днях, ён зусім не глядзеў на чалавека, які перад ім стаяў. З маланкавай хуткасцю праносіліся думкі, адна другую абганяючы. Чалавек, што перад ім стаяў, украдкам пазіраў ва ўсе бакі, з-пад яго акуляраў відаць былі патухшыя вочы. Падняўшы ў руцэ партбілет, Нікіцін запытаўся:

— Скажыце, якім чынам трапіў да вас гэты дакумент?

— А гэта доўгая песня, — працадзіў скрозь зубы чалавек у рагавых акулярах, з рыжай клінком бародкай.

— Вы ведалі таго чалавека, чыё імя насілі?

— Не, не ведаў, але чуў пра яго многа.

— Сядайце і раскажыце.
— Дзякую. Не хочацца садзіцца.
— А прыдзецца.
Нікіцін зняў трубку, набраў патрэбны нумар, стаў гаварыць па тэлефону:
— Таварыш Меркулаў! Гэта я, Нікіцін. Прышлі да мяне свайго хлопца. Ну добра, чакаю. У чым справа? Потым пагаворым. Я табе пазваню. Хоць лепей заедзь да мяне. Пакуль!
— Та-а-ак,—грузна сеўшы, прагаварыў чалавек у рагавых акулярах, з рыжай клінком бародкай. Калі ён нагнуўся, зляцелі акуляры, пабілася шкло, зазвінела. Ён загаварыў: — Лёс чалавечы, нібы таго карабля: плавае на хвалях мора да той пары, пакуль не наткнецца на скалу якую, ці падводны камень...
— Ад гэтага чалавечага карабля засталіся адны шчэпкі, — перабіў Нікіцін. — Ну, а шчэпкі — рэч вядомая, хоць і доўга могуць трымацца на паверхні, ды толькі немінуча павінны быць прыбіты...
— Што-о? — ускочыўшы закрычаў чалавек, з рыжай клінком бародкай.
— Прыбіты, — працягваў Нікіцін, — да берагу, або выкінуты на мель. Я вас слухаю.
«Не! Лепей загінуць, чым выдаць», — падумаў сам сабе чалавек, з рыжай клінком бародкай. Пазіраючы на адкрытае акно, адкуль урываліся свежыя струмені паветра, ён зусім нечакана для сябе голасна сказаў:
— Так будзе лепей!
У гэты час у кабінет зайшоў чалавек у вайсковым.
— Можна? Мяне таварыш Меркулаў да вас прыслаў.
— Калі ласка.
Чалавек у вайсковым не ведаў за чым яго сюды паслалі, але ўсім сваім нутром адчуваў, што па важнай справе, іначай-бы яго не адрывалі ад працы. Паглядзеўшы на чалавека, з рыжай клінком бародкай, вочы якога блукалі з кутка ў куток, чалавек у вайсковым, прай-

шоўшы роўным цвёрдым крокам, закрыў акно. Звяртаючыся да Нікіціна, па вайсковаму казырнуўшы, запытаўся:

— Што загадаеце?

— Разбярыцеся з гэтым чалавекам, хто ён і адкуль.

— Слухаю!

Гадзін праз дзве Нікіцін даведаўся (яму пазванілі па тэлефону), што чалавек, з рыжай клінком бародкай— птушка вялікага палёту. Гэта быў вядомы разведчык адной дзяржавы, якога доўгі час шукалі і ніяк не маглі напасці на след. Партбілет Старобінскага, Нікалая Кузьміча, яму быў дадзены яшчэ тады, калі ён быў за мяжой. «Людзі, будзьце пільнымі!» — падумаў сам сабе Нікіцін, павесіўшы трубку. Нікіцін да таго ўсхваляваўся, што ніяк не мог прадаўжаць работу. І можа-б ён у гэты дзень больш зусім не працаваў, каб не падзяліўся аб гэтым з членамі Бюро Гаркома партыі, якія яго заспакоілі.

Позна ўвечары Нікіцін пакінуў свой кабінет і вышаў на вуліцу. За гэты дзень ён праверыў многа людзей, сярод іх былі выдатныя людзі, сапраўдныя большэвікі, якіх ён добра ведаў. Яны гарэлі на працы. Гэта яго радавала. Партарганізацыя завода «Усход» у сваёй аснове была здаровай, здольнай ўзначаліць барацьбу за пабудову новага комуністычнага грамадства, павесці за сабою масы аднаго з перадавых заводаў у рэспублiцы.

Па вуліцах горада разгульвалі вятры, прыносячы з сабою дзівосныя пахі квітнеючых садоў. Паволі ідучы, Нікіцін прадумваў свой жыццёвы шлях. Праходзячы каля рэчкі, ён зноў успомніў начдзіва.

Нікіцін зусім не заўважыў, як падыйшоў да свайго дому. Насустрач яму выбегла русакудрая яго дачка з блакітнымі вачыма, яна жыццерадасна шчабятала.

— А нашы коцікі ўжо бачаць! Яны ўжо гуляюць! Так смешна куляюцца!

Нікіцін, пацалаваўшы дачку ў лоб, накіраваўся ў кватэру, каб адпачыць.

Гэты дзень у яго быў асабліва напружаным.

*Красавік, 1935 г.*
*г. Мінск.*

## *Максімка*

— Ці не на спацыр ты, хлопча, выбіраешся? — паглядзеўшы цераз плячо, запыталася Разэля Шахоўская ў Максімкі Хвораста, заўважыўшы, што ён абувае свае стаптаныя боты, з якіх відаць былі пальцы. Максімка ў дні вайны прыблукаў у Сухадолле да Шахоўскіх, летам пасвіў кароў, а зімою працаваў парабкам і няньчыў дзяцей. Яшчэ не так даўно ён быў ціхім і паслухмяным, і гаспадыня, не гледзячы на свой даволі круты нораў, не мела ніякіх прычын, каб да яго чапляцца. Але пасля таго, калі цераз Піншчыну прайшла Савецкая Армія, хлопца нібы падмяніла. Максімка пры немцах бывала рэдка калі выцісне ўсмешку, а цяпер нават пачаў спяваць, — дый як, заслухаешся. У яго з'явілася і дудачка, на якой ён даволі лоўка іграў. Падлетак нават марыў займець скрыпку, якая «як чалавек загаварыла-б».

— Пайду ў горад, — страсянуўшы кудрамі, з нейкай урачыстасцю паведаміў Максімка. — На Усход... Татка заўсёды пры жыцці гаварылі пра Усход...

— Што-о? — здзівілася Разэля, пачуўшы такую неспадзяваную для яе навіну, і зласліва заўважыла.— Там дудка есці дасць?..

— Бацькі мае жылі з мазаля і мяне прывучылі да гэтага, — запярэчыў Максімка, як зусім дарослы. — А іграў на скрыпцы бацька для душы... І я скрыпку займею...

— Значыцца, ідзеш?

— Так.

— А хто пасля абеду пагоніць быдла на пашу? — загаманіла збянтэжаная Разэля. — І так сёння рана прыгнаў... Унь у хляве гавяда раве!.. А нябось, ясі, аж нос гнецца... З дудкі і спеваў не пражывеш... Выганяй кароў!..

— І не думаю! — агрызнуўся Максімка. — Не ўломкі і вашы папасвіць... Шляхецкая карона з галавы не ўпадзе...

— Прападзеш сярод чужых людзей, каму да цябе якая справа, — угаварвала Разэля, а потым прапанавала: — Верашчаку з скваркамі будзеш есці, ці мачанне белае? А можа падсмажанага сыру хочаш, ці памажаш аладку маслам?

— Ого, які выбар! — здзівіўся Максімка. — Не прывык я да такіх ласункаў, яшчэ зашкодзіць... Мне-б якога крупніку ўлілі, і хоць для закрасы малаком засівілі... А то абрыдла маслёнка, якою кармілі парасят і мяне... Праўда ім сяды-тады трапляла і малако, а мне дык ніколі...

Хлопец у першы раз так загаварыў з гаспадыняй і сам спалохаўся. Максімку ўжо ішоў пятнаццаты год, ён цвёрда вырашыў ісці ў свет, шукаць спосаб жыцця, а таму хацеў хоць крыху насаліць гаспадыні, адплаціць за ўсе тыя крыўды і здзекі, якія яму давялося перанесці ў гэтым доме, ніколі не чуючы спагады і добрага слова.

— Глядзі, каб не пашкадаваў, — хітра прагаварыла Разэля, усё яшчэ не верачы, што ён іх пакіне.

— А што я страчу, пугу або цэп, а стаць магу чалавекам,—разважыў уголас Максімка.

— А хто-ж ты цяпер?

— Папіхач! — і раптам мільганула новая думка. — Хоць гэта не зусім так, хутчэй за ўсё — чорны вол... у ярме... вось хто!.. А мой бацька супроць гэтага біўся... Не дарэмна яго Народны Сход пасылаў у Маскву...

— Гэта ты нам так дзякуеш, што мы цябе, нягодніка, хлебам карм'лі і адзявалі? — прасіпела Разэля, выраз на яе твары быў хітры і прагны, яна са злосцю крыкнула: — Скідай апранаху!

— Дык няўжо-ж я за тры гады працы ў вас не заслужыў гэтай латанай світкі? — упіраўся Максімка.

— Скідай, кажу! — валтузілася Разэля, а потым крутнуўшы андаракам, які веерам развіўся, нізкім голасам зараўла. — І кашулю здзяру... Валацуга!.. Бацькі круціліся, пакуль не скруцілі галавы... Так і ён...

— Вось вам ваша рыззё, — хутка распрануўся Максімка і са злосцю кінуў на падлогу світку, што аж забразгацелі самаробныя гузікі.

— І сарочку, — не ўнімалася Разэля.

— Сарочка мая, — запярэчыў Максімка. Ён адзеў сваю караткаватую куртку, рукавы якой былі амаль да самых локцяў і ў плячах трашчала, бліснуў вачыма і сурова загаварыў: — А толькі бацькоў маіх не чапайце! — і ён з гонарам прагаварыў: — Мой бацька, можна сказаць, уз'ядноўваў Беларусь... Вы яго падэшвы не варты. Чуеце? Кулаччо! Хутка на вас прыдзе пагібель... Быць не можа, бацька Сталін пачуе нашы словы...

— А божа мой... Пачакай да вечара, з кірмашу вернецца гаспадар, з ім пагаворыш, — пайшла на хітрыкі Разэля і пусціла ў ход апошні сродак. — Плату прызначым... Цябе, мусіць, нехта падвучыў... Ці-ж мы табе ліхадзеі...

— Але і не добрадзеі, — не слухаючы гаспадыні, працягваў Максімка, ён хацеў выказаць усё, што ў яго набалела. — Мае бацькі жылі з працы рук, а вы з ашуканства. Так, так. Адкуль вы ўзялі столькі злотых, каб прыбраць суседскі хутар? З мазаля? — не-е. На ганд-

лярстве свіньмі нажыліся. Колькі абманам прадалі людзям крупчакоў...

— Замаўчыш ты, ці не!—аж прастагнала ад злосці Разэля. — Звадыяш! Ты сваёю смерцю не памрэш. Не мінуць і табе, як бацькам, пяньковага гальштука. Мой божа, адкуль толькі бяруцца такія людзі? Бунтар! Сыйдзі з маіх вачэй, каб я цябе не бачыла!

— Разварушы трутняў, жыцця не дадуць.

— А божачка мой, а міленькі! — залемантавала Разэля, нібы яе хто рэзаў.—Што-ж гэта на свеце робіцца... Колькі таго хлапчаняці, а столькі ў ім злосці... Разбойнік!..

На крык Разэлі збегліся ў хату дзеці, пяцёра, адно пад другім, румяныя, з выгарэлымі на сонцы кудламі. Адчуўшы, што іх Максімка пакідае, дзеці сталі прасіць:

— Мамка! Не праганяй Максімку... Ён добры...

— До-о-бры!? — на высокай ноце піскнула гаспадыня, яна ад прагнасці, што страціць дарэмныя рукі, аж задыхалася, твар у яе быў пабіты на плямы.—Арыштант, вось хто ён! У магілу, раней часу, ён хоча мяне ўвагнаць!..

— Акрайчык хлеба дасце на дарогу?

— Чаго? — вызверылася Разэля.

— Хоць што я пытаю, запрацаваны хлеб — магу сам узяць.

Максімка моўчкі адрэзаў кавалак чорствага хлеба, паклаў у торбачку, узяў дудку і выправіўся ў вялікую дарогу шукаць шчасця.

* * *

Апоўдні, у нядзелю, у гарачы жнівеньскі дзень, сорак чацвертага года, Максімка Хвораст вышаў з хутара Сухадолле і пайшоў на Усход. Яму на развітанне захацелася наведаць месца блакады немцамі партызан, дзе ў часе прачоскі лесу былі схоплены яго бацькі, і ён

страціў сваё маленства. Вось ён сярод жыта свайго гаспадара, шапацяць поўныя калоссі і гнуцца да долу. Жыта вышэй чалавечага росту. Поруч ранняя грэчка суседа, яна зацвіла, пахне мёдам, гудуць пчолы, пералятаючы з цвятка на цвяток. Пасля грэчка змянілася лёнам, які быў яшчэ не прапалаты. Паміж зялёнага мора, якое хвалямі пераліваласа на сонцы, месцамі былі спрэс жоўтыя плямы ад свірэпы. Рабацелі хутарскія палі, часамі траплялі чорныя прагаліны—гэта была кінутая пад папар зямля. Максімка сам сабе падумаў: «Прыдзе час і тут, як каля Міру, некалі зямля будзе ў адной дзялянцы». Высока ў небе плылі пуховыя воблакі, наперабой шчабяталі жаваранкі, яны нібы праводзілі Максімку і жадалі яму: «шчаслівай дарогі».

Максімка дастаў сваю дудачку і зайграў. Плакала дудачка, галасіла, потым з'явіліся новыя мелодыі, светлыя, радасныя, урачыста гучэла музыка. Гэта была музыка заўтрашняга дня Максімкі, якім ён сабе яго ўяўляў. Максімка паволі ішоў. Потым ён схаваў дудку і паскорыў хаду, любуючыся хараством прыроды. Белымі лебедзямі плылі пуховыя хмары, адна другую параганяючы.

Хлопец узыйшоў на грэблю, абапал якой была сенажаць, узвышаліся парыжэлыя стагі сена; на нізкіх месцах ужо адскочыла асака, там атава абяцала быць багатай, а на грудках усё яшчэ відаць былі выхапленыя рады: каса, напэўна, коўзалася па мурагу. Максімка ішоў і гаспадарлівым вокам аглядаў сенажаць, ён то хваліў, то ганьбіў работу таго або іншага хутараніна.

Вось Максімка апынуўся каля крынічнага ручая, цераз які іх невялікі партызанскі атрад восенню сорак першага года перабіраўся, а ў студзені сорак другога года, калі добра скавала дрыгву, немцы, пасля апрацоўкі лагера з паветра, вялі адсюль наступленне—яны акружылі атрад і мала хто адтуль вышаў. Бацькі Максімкі былі злоўлены і павешаны. Максімка некаторы

час жабраваў, а потым за кавалак хлеба застаўся працаваць на хутары Сухадолле ў Шахоўскіх. Пра бацькоў сваіх Максімка ведаў, што яны да трыццаць дзевятага года батрачылі ў Несвіжскім маёнтку ў Радзівіла, потым бацька быў абраны дэпутатам на Народны Сход, ездзіў у Маскву, бачыў Сталіна, пра якога шмат гаварыў, а ў саракавым годзе калі пад Мірам арганізаваўся першы калгас, дык яны туды падаліся і толькі там па-чалавечаму зажылі. З прыходам немцаў, бацька і маці, выкінутыя з маёнтка (тут быў калгас, а бацька Максімкі ў ім быў за старшыню), пайшлі ў лес у партызаны і апынуліся на Палессі.

Паволі ішоў Максімка, лёгкі ветрык шавяліў яго непакорную, віхурыстую чупрыну, задумёнyя блакітныя вочы глядзелі кудысьці ў далячынь. Цяпер ён крочыў па гэтых неабсяжных прасторах дрыгвы смела і ўпэўнена, не гэтак, як тады зазімкам, туляючыся, паўзучы, баючыся падняць галаву, бо кругом дзынкалі кулі, разрываліся міны, завывалі асколкі снарадаў. Булькала крынічная празрыстая, як крышталь, халодная вада. Максімку захацелася піць, ён схіліўся над крыніцай і ў вадзе ўбачыў свой твар, круглы, з ямкамі на шчоках і аблезлым кірпатым носам, як макам пасеяным рабаціннем. Караткаватая куртка, з якой ён даўно вырас, рабіла яго смешным, але ён не звяртаў на гэта ўвагі, помнячы бацькавы словы: «Па адзежы сустракаюць, а па розуму праводзяць». Напіўшыся, Максімка рэзка павярнуў у бок, у напрамку да грады, на якой рос змешаны лес, там базіраваўся апошнія дні партызанскі атрад.

У непраходных балотах Палесся, куды закінула яго вайна, дзе рэдка ступала нага чалавечая, з купіны на купіну, паміж чаратоў і аеру, прабіраўся Максімка, паднімаючы мноства балотных птушак. Бліжэй да грады, малюнак некалькі мяняўся: пачыналіся травяныя тарфянікі, таксама топкія, расла асака, а на купінах пушыца. Максімка задумаўся: «Вось яна якая

Палеская нізіна, а толькі быць не можа, каб чалавек яе не перарабіў на свой лад»; і не заўважыў, як патрапіў на «зыбун», нешта падобнае на плаваючы вялікі зялёны дыван, сплецены з карэнняў і балотных раслін. Хлопец рэзка падаўся назад і цяпер толькі разгледзеў, што гэта было зарастаючае возера, ён збочыў і пачаў яго абыходзіць, даючы вялікі круг, бо ратунку другога не было.

Хоць града і здавалася блізка, але Максімка толькі пад вечар туды дабраўся; садзілася сонца, яно было ярка-чырвоным, нізка слаліся шэрыя туманы, з лесу павеяла вільгаццю і холадам. На краю балота рос алешнік, лісці на ім былі мяккія і клейкія, потым пракідаліся арабіны, на якіх аж галіны гнуліся ад зялёных ягад; кустамі рос арэшнік, усыпаны крохкімі пладамі, траплялі і спарышы, якія вылузваліся з зеляніны; пасля пайшоў асіннік, трымцела лісце, тут быў своеасаблівы пах і адчувалася нейкая гарката.

Чым далей Максімка ішоў, тым лес быў гусцейшым, тут раслі: граб, ліпа, клён, вяз, ясень і, нарэшце, дуб. Кучаравыя дрэвы паспляталіся ў вершалінах, быў чутны тужлівы гоман. Максімка заўважыў, што на некаторых пародах дрэваў знізу сталі жаўцець лісці, а толькі разложыстыя дубы былі зялёнымі. Недзе ў гэтым месцы і стаяў партызанскі атрад у зямлянках, але цяпер не лёгка было адшукаць тое месца.

Раптам у лесе стала хутка цямнець, Максімка занепакоіўся, але калі ўгледзеў вялізную варонку, — немцы тут наскідалі шмат бомбаў,—дык здагадаўся, што ён знаходзіцца ў раёне былой стаянкі партызан. Яно так і было, вось штабная зямлянка, яна ўся развернута, параскіданы бярвенні, сюды трапіла фугаска.

Забілася ў Максімкі сэрца, ледзь не вырвецца з грудзей, калі ён угледзеў сваю зямлянку, у якой ён з бацькам правёў апошнюю ноч, з дваццаць другога на дваццаць трэцяе студзеня, сорак другога года. Мак-

сімка ўвайшоў у яе, як у свой родны дом, нават чыгунная печ стаяла, а толькі пахла гніллю. Максімка назбіраў сухога галля і падпаліў у печы. Запахла дымам, які казытаў у носе. Цяпер толькі Максімка заўважыў, што іржа пераела калена ў жалезнай трубе, адкуль ляцелі іскры і чорнымі кропкамі падалі на земляную падлогу, пасыпаную белым пяском.

Мроіліся думкі ў Максімкі, перад ім, як жывыя, паўсталі вобразы бацькоў. Крыўдна стала Максімку за страчанае дзяцінства, і ён у першы раз за тры гады заплакаў горкімі сірочымі слязьмі, якія, як гарох, сыпаліся з вачэй. Седзячы каля печы, Максімка з'еў усухамятку скарынку хлеба. Хлопца хіліла на сон, ён лёг і так да раніцы на адным баку праспаў. Максімка прывык рана ўставаць, і сёння ён прачнуўся да ўзыходу сонца, агледзеў зямлянкі, большасць з іх былі разбураны, пазарасталі травой, і рушыў зноў у дарогу. Ён павінен быў зайсці ў мястэчка Піну, агледзець магілу бацькоў.

Максімка ніяк не мог уцяміць, чаму гэта ў лесе так шмат дыму, які душыў у горле, ад чаго ён увесь час кашляў. Яму захацелася хутчэй пакінуць лес, і калі ён адтуль выбраўся, дык заўважыў, што гарыць торф. З зямлі паднімаліся вялізныя клубы чорнага дыму, яны зацягвалі неба, відаць было, што торф гарыць даўно, бо кругом усё чарнела, покатам ляжалі абгарэлыя дрэвы, а месцамі, дзе выгарэў торф, з'явіліся глыбокія вадаёмы. Максімку стала страшна, і ён паспяшыў, каб хутчэй адсюль выйсці. Цяпер толькі Максімка заўважыў, што перамяніўся вецер, і здагадаўся, чаму ў лесе гэтулькі дыму. Гарыць «чорнае золата», як назваў бацька торф, калі аглядаў пад Оршаю электрастанцыю, якая працавала на торфе і давала людзям святло. «Шкада, глуміцца дарэмна»—падумаў сам сабе Максімка: «Некалі мы гэты торф паднімем, яго тут процьма, нескарыстанага ляжыць, чакаючы чалавечых рук».

Хлопцу падабалася падарожжа, поўнае нечаканасцяў, ён сваімі вачыма ўбачыў Пінскія балоты, аб якіх так многа ў народзе казак, песень і легенд. Асабліва яму спадабалася казка пра Чалавека, які вырашыў асушыць Палессе, а толькі лютыя ворагі затрымалі на час выкананне яго намеру.

Каб не кружыць, Максімка вырашыў ісці напроста. Балоты гэтыя лічацца непраходнымі, але для Максімкі гэтага слова не існуе. Задумана — зроблена. Да гэтага яго прывучыў бацька, які гаварыў: «Няма такіх перашкод, якіх-бы чалавек, калі ён толькі гэтага захоча, не адолеў». Сонца ўжо добра прыгрэла, калі Максімка абагнуў вялікае возера, у якім, відаць, было шмат рыбы. Гадзін праз пяць добрай хады па балоту, на якім расла шырокая асака, аб якую Максімка парэзаў ногі (боты ён нёс на палцы цераз плячо), і ён апынуўся на могілках, на якіх раслі гонкія сосны, кусты бэзу і шмат было кветак, якімі родныя і блізкія ўпрыгожваюць магілы.

Максімка меркаваў да вечара прыбраць магілу бацькоў (яна, пэўна, зарасла травою), а там на цягнік і ў горад. Ён доўга хадзіў і ніяк не мог знайсці магілы, хоць сам быў на пахаванні і добра прыкмеціў, што ў галовах нябожчыкаў расла сасна, якая метрах у трох ад зямлі раздваілася і расла спарышом. Ён падышоў да сасны-спарыша і здзівіўся, няўжо на гэтым месцы маглі каго-небудзь другога пахаваць, бо тут стаяла новая агарожа, і нейчымі дбайнымі рукамі прыбрана магіла. Максімка падыйшоў да помніка, на якім была высечана звязда і прачытаў:

«Тут пахаваны зверскі замучаныя немцамі партызаны: Мікалай Хвораст, Таццяна Хвораст, Андрэй Прыходзька, Моўша Бергельсон, Сцяпан Казельскі, Ніна Фядорчык, Міхась Кандратовіч і Тамаш Катлярэўскі».

Пануры Максімка наламаў венік, зайшоў за агарожу, падмёў і пасыпаў кругом магілы жоўтым пяском. Паправіўшы касачы, якія разрасліся на магіле, ён,

схіліўшы галаву, пастаяў яшчэ некалькі хвілін, а потым пайшоў на станцыю. Яму надоўга запомніўся гоман сасны-спарыша над магілай загінуўшых, блізкіх сэрцу, людзей.

* * *

Яшчэ будучы «фабзайцам», Максімка звярнуў на сябе ўвагу, пра яго казалі, што і ён «выйдзе ў людзі», а пасля выступлення на канцэрце самадзейнага гуртка, дзе ён выканаў некалькі народных песень палешукоў, сябры яго іначай і не звалі, як «Дудар», за што ён перш злаваўся, а пасля прывык і нават адгукаўся, калі яго гэтак клікалі.

Але прызванне Максімкі было не ў гэтым. Музыкай ён займаўся толькі ў часе адпачынку, яму хацелася будаваць, ён не мог дачакацца, калі іх выпусцяць з фабрычна-заводскай школы і пашлюць на работу, каб будаваць дамы, дзе-б людзі маглі жыць і адпачываць у радасці.

І вось збыліся мары: Максімка апынуўся на будоўлі вялікага завода, які будзе вырабляць аўтамабілі.

Каранасты, шырокі ў плячах, у чорным палітоне, у штанах на выпуск, у салдацкіх чаравіках, са ззяючым тварам і сінімі вачыма, з пушком на верхняй губе, Максімка у развалку, не спяшаючыся, як гаспадар, аглядае за горадам пустыр, адведзены пад завод і пасёлак для рабочых. На гэта спатрэбілася даволі шмат часу, але Максімку няма куды спяшацца, дзень не рабочы, можна пахадзіць, паразважаць, заглянуць у будучыню. Прысеўшы каля каржакаватай хвойкі, недалёка ад шашы, Максімка сам сабе падумаў: «От як пабудуем завод, дык я тут і асяду, застануся жыць». А кім ён будзе працаваць на заводзе, — яго-ж спецыяльнасць будаўнік,—Максімка пакуль не задаваў сабе гэтага пытання. Час пакажа, што трэба рабіць. З яго здольнасцямі не так ужо цяжка яму будзе набыць новую

спецыяльнасць, тым больш, што яго вабіць стаць металістам, і ён здзейсніць сваю мару.

Будучы на практыцы, Максімка паказаў, што ён мае талент у руках, можа быць і мулярам, і атынкоўшчыкам, і столярам. Паглядзеўшы на купчастую хвойку, Максімка выбраў месца, каб дзе абаперціся, бо хвойка была параненай, і ён мог упэцкаць свой новы палітон у жоўтую смалу, якая пацеркамі вісела, дастаў з кішэні дудку і няўпэўнена зайграў; ён наважыў сам стварыць «Гімн Працы», а толькі ў яго нічога не выходзіла, ён збіваўся на ўжо вядомыя мелодыі, якімі захапляўся і пачынаў іграць. Раптам дзесьці загаварыў рэпрадуктар, чутны былі дзівосныя гукі, якія глыбока западалі ў душу хлопца. Калі музыка скончыў іграць, Максімка ўздыхнуў і ўголас падумаў:

— От, каб мне скрыпку, на дудцы ніяк не перадасі, што ў цябе на душы... Здэцца і я так-бы зайграў...

— Эй, Дудар, чаго прыгаруніўся? — пачуўся звонкі голас. — А мы тваю дудку здалёку пачулі... Сыграй яшчэ што небудзь...

Да Максімкі падбеглі хлопцы, якія кідаліся шышкамі, падлеткі ўцягнулі і яго ў гульню. Максімка за ўсё браўся з азартам, так і тут, ён хутка атакаваў «праціўніка» і пагнаў яго на ўскрай лесу, які быў высечаны за вайну. А там былі шырокія калгасныя прасторы, каласілася жыта, хлопцаў пацягнула ў поле, яны падняліся на ўзвышша, адтуль добра была відаць пакрытая асфальтам дарога, па ёй снавалі многіх марак машыны, то лёгкія, як вецер, то важкія, пад якімі дрыжэла зямля.

— А якія машыны будзе рабіць наш завод? — запытаўся хлопец.

— Казаў канструктар, грузавыя, з зубрам на радыятары, — адказаў Максімка, а потым з гордасцю дадаў: — І пабягуць яны сярод лясоў і стэпаў, па далінах і горах, паміж гарадамі і вёскамі, пабягуць... Яны

на многа зблізяць горад з вёскаю... А пакуль слова за намі, будаўнікамі...

І вось Максімка паклаў першую цагліну. Ён, узрушаны, загарэлы, як бронза, у белым фартуху, з кельмаю ў руках, стаіць на кладцы сцяны. Увіхаюцца рукі, не ведаючы стомы. Ён не для Радзівілаў і не для Шахоўскіх працуе, а для сябе. Яму не паспяваюць падаваць цэглу. Узвышаецца сцяна. На яго з зайздрасцю паглядаюць хлопцы, якія не могуць яго дагнаць. Ён гэта заўважае і яшчэ больш завіхаецца, спрытна кладучы цагліну за цаглінаю.

Набліжаецца поўдзень, хутка ісці на абед. Заўважыўшы прараба Дзяніса Давыдавіча Кашырына, — ён-жа член бюро партыйнай арганізацыі завода і прымацаваны для работы сярод комсамольцаў, — ужо ў гадах мужчыну, з рыжымі падстрыжанымі вусамі, маленькай бародкай на хваравітым твары і праніклівымі шэрымі вачыма, Максімка разагнуўся; ён задаволена ўсміхаўся, чакаючы прыёму свае працы, і, зразумела, пахвалы. Дзяніс Давыдавіч акінуў вачыма сцяну і хутка падняўся на рыштаванні, дастаў вымяральны прыбор, як-бы праверыў сябе і нахмурыў бровы, над пераноссем у яго акрэсліліся дзве глыбокія складкі, ён нездаволена загаварыў:

— Бачыш, саколе, куды нахілена сцяна, — у голасе Кашырына адчуваўся дакор.—Прыдзецца перарабляць.

— От няшчасце! — вырвалася з грудзей Максімкі, ён гатоў быў расплакацца, гэтак ён стараўся і ўсё дарэмна. — Як-жа гэта магло здарыцца?

— Перш трэба навучыцца рабіць добра, а потым ужо і хутка, — зазначыў Кашырын і тут-жа падбадзёрыў хлопца.—Але з цябе будзе добры майстра. Ты, саколе, паднімешся высока...

— І ўсё перарабляць?

— Ад пачатку і да канца, — тлумачыў Кашырын. —

Глядзі, саколе, у чым твая памылка... Не ўсвядоміш гэтага, не будзеш лятаць... Сакрэт тут такі...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Ішлі дні за днямі, прайшло больш за два гады, як Максімка быў на будоўлі, ён ужо стаў майстрам, звычайным майстрам, якіх многа, што дбайна і рупліва працуюць. З вялікімі цяжкасцямі нараджаўся завод, не хапала будаўнічых матэрыялаў, рабочых рук, спецыялістаў. Пасляваенныя цяжкасці давалі пра сябе знаць. Людзі рабілі цуды, узнімаючы з руін краіну. Рос і аўтамабільны завод. У рыштаваннях цэхі: шасі, прэсава-кузаўны, арматурна-радыятарны. Адставала праца на пабудове галоўнага, зборачнага цэха. І вось туды была перакінута комсамольска-маладзёжная брыгада Максіма Хвораста, якая паказвала добрыя ўзоры ў рабоце, але не такія, каб яны вельмі ўжо кідаліся ў вочы.

Гэта было ўвосень, даўным-даўно апалі пажоўклыя лісці, завываў і скуголіў вецер, калі Максімка ўзышоў на рыштаванні. Перад яго вачыма разгарнулася панарама новабудоўлі, прыемна было глядзець на стройныя карпусы, якія высока ўзнімаліся, над прыгожымі катэджамі, дзе будуць жыць рабочыя. Максімка ўсім гэтым ганарыўся: тут і яго працы шмат. Ён сёння чамусьці ўспомніў пра тую восень, калі поўз па топкіх балотах, успомніў магілу замучаных людзей, а калі ён паклаў цагліну, дык з'явілася адчуванне, нібы ён сваёю працаю будуе помнік тым, якія загінулі за свабоду. Рытмічна ішла праца. Чуліся галасы:

— Цэглы!

— Цэменту!

Дзяніс Давыдавіч Кашырын, праходзячы, паглядзеў на зладжаную працу комсамольска-маладзёжнай брыгады Максіма Хвораста і не ўтрымаўся, каб не пахваліць:

— Лятаць вам, сакалята, высока лятаць...

Максім Хвораст за дзень з сваёй брыгадай выканаў норму больш чым у два з паловай разы, а калі падлічылі прароблёную ім асабіста працу, дык аказалася, што ён выканаў норму па кладцы цэглы за дзень больш чым у чатыры разы. Гэтая вестка хутка абляцела ўсю новабудоўлю, пра брыгаду Максіма Хвораста загаварылі.

Першым павіншаваў Максіма з перамогай Кашырын, які, паціскаючы руку, сказаў:

— То як, сакрэт мой дапамог, тота-ж... Дык ляці, саколе, узнімайся яшчэ вышэй!..

Узрушаны Кашырын абняў Максіма і пацалаваў. Ён працягваў гаварыць:

— Разумееце, Максіме, вы зрабілі вялікую справу... Пра вас будуць пісаць, гаварыць... А толькі глядзіце, каб ад першага поспеху не закружылася галава... Ведайце, чым чалавек вышэй паднімаецца, тым цяжэй падаць... Але я ўпэўнены, што з вамі гэтага не здарыцца... Вы цвёрда стаіце на грунце... у вас і ў такіх як вы бачу я нараджэнне новага чалавека, калі будзе сцерта розніца паміж фізычнай і разумовай працай... Дык ляціце, саколе, у светлую далячынь!..

— Дзякую за добрае слова, — шчыра пацінуў руку Максім Хвораст Дзянісу Давыдавічу Кашырыну, свайму настаўніку і старэйшаму сябру. — Я гэта ўлічу... Другія брыгады падпіраюць, пастараюся не здаць пяршынства... А вас я папрашу дапамагчы мне замацавацца на заводзе...

— Добра.

І так Максім Хвораст з дня ў дзень набіраў тэмпы, узнімаючы ўсё вышэй і вышэй норму па кладцы цэглы, пра яго брыгаду сталі гаварыць не толькі на заводзе, але і ў горадзе.

Аднойчы вечарам прыйшоў Максім дахаты узрушаны: ён пачуў з Масквы пра сябе перадачу, яму захацелася спяваць. Ён узяў скрыпку, якую за гэты час

набыў і зайграў свой «Гімн Працы». Перш неяк не слухаліся спрацаваныя рукі, ён няўпэўнена вадзіў смычком, а пасля смялей зайграў і заспяваў, а песня была ад сэрца, на поўныя грудзі, у якой ён славіў Чалавека, які вызваліў яго з няволі і вывеў у людзі. Гэта была песня — жыццю, сонцу, працы.

*Красавік, 1948 г.*
*г. Мінск.*

## Сымоніха

— Заходжу гэта я да старшыні Райвыканкома Круглікава,—апавядала Сымоніха мужу, падпіраючы рукою падбародак, дый кажу яму: «Дапамажыце мне, голубе, кароўку прыдбаць».

«А хто вы такая? — пытаецца ён у мяне. — Адкуль будзеце? Нешта я вас не ведаю. Праўда, я ў гэтым раёне не так даўно працую, але ўжо ў ва ўсіх вёсках пабыў, а толькі вас нідзе не сустракаў».

«Хіба,—кажу,—не пазнаеце?»

Сымоніха хітра паглядзела на мужа, усміхнулася, і шэрыя вочкі яе заблішчэлі. Сымон таксама ўхмыльнуўся ў шырокую, як лапата, рудую бараду і падкруціў вусы; ён уважліва і моўчкі слухаў жонку. Калі Сымоніха гаварыла, Сымон ніколі яе не перабіваў. Ён ведаў, што жонка не будзе абы чаго казаць.

«Сымоніха я, з Дубровіна, няўжо забылі?»—кажу я старшыні.

«А я вас і не ведаў»,—адказвае ён.

«Новую хату мне пабудавалі?»—пытаю я.

«Ну, і што з гэтага? Хіба адной вам толькі? Амаль цэлую вёску ўзнялі нанава. Праз некаторы час не па-

знаць будзе Дубровіна... Бачыце план генеральны. Вось—пляц, а там — помнік Заслонаву».

«Чыгуначнікі,—перабіла я яго, — намагаюцца, каб перанесці ў Оршу прах нябожчыка. Дык няўжо-ж вы дазволіце гэта зрабіць?»

— Ніяк нельга згадзіцца, — рашуча запярэчыў Сымон.

«А прыдзецца, відаць, чыгуначнікам уважыць,—сказаў старшыня. — Да вайны Заслонаў працаваў у дэпо інжынерам».

— Ніколі, — загарачыўся Сымон.

«А гэта, — працягвае паказваць старшыня, — будзе сельсовет. Тут школа. Там дзіцячыя яслі. А каля рэчкі—лазня».

— І няўжо не будзе клуба? — захваляваўся Сымон.— Сыграю я ўсё-ж калі-небудзь ролю караля Генрыха IV, ці не?

Яшчэ перад вайною пачалі рэпетыраваць.

— Будзе і клуб, — усміхнулася Сымоніха.

— То і добра,—вальней уздыхнуў Сымон.

«Дубровінцы, — кажа старшыня, — добра ваявалі з немцамі і цяпер зноў дружна ўзяліся за гаспадарку. Хто-б ні ехаў з Масквы ў Мінск, ці з Мінска ў Маскву, то каля Оршы абавязкова заверне ў Дубровіна, каб паглядзець, як людзі жывуць на зямлі, за якую Заслонаў склаў галаву. Горад зялёны будзе».

«Няўжо-ж»,—кажу я.

«Але з крэдытам, каб прыдбаць карову, цётка, прыдзецца пачакаць», — гаворыць ён, а сам разглядае паперы і робіць выгляд, што не звяртае на мяне аніякай увагі, а толькі сяды-тады паўз рагавыя акуляры возьме дый гляне. А я з яго вачэй не спускаю. Бачу, ён пачынае нерvавацца і пастуквае пальцамі па стале. Толькі, што мне да гэтага? Я дамагаюся свайго. А чалавек ён, відаць па ўсяму, добрай натуры, але яму за дзень натлу-

мілі галаву. Прада мною з яго кабінету вышаў аж цэлы гурт жанчын, былі там і Дубровінскія.

«Ой, чалавеча,—кажу я,—навошта мне той крэдыт, мне-б лепш за ўсё кароўку займець. Ёсць-жа ў вас у хляве некалькі штук, што ў немцаў адбілі. Я-ж да вас у брыгаду сама прывяла сваю падласую. Гэта дарма, што яна была з адным рогам, але малака шмат давала. Тады дзядзька Косця, паціскаючы мне руку, сказаў: «Дзякую табе, цётка. Абяцаю, што калі даб'ем ворага, дык вернем табе лепшую. А калі я не вярну, то мае хлопцы гэта зробяць, у даўгу ў сваіх людзей мы не застанемся».

«Гаварыў мне так Заслонаў?»—пытаюся я.

«Здаецца, некаму гаварыў,—успамінаючы, сказаў Круглікаў і трохі памякчэў. — А толькі не адна-ж вы, цётка Сымоніха, прывялі тады карову».

«Не, не адна, — згаджаюся я. — Што праўда, то праўда, усе ў нас дапамагалі, хто чым мог, дзяліліся апошнім кавалкам хлеба».

— Яшчэ-б,—зазначыў Сымон,—трэба было ўтрымаць гэтулькі ляснога войска.

«Вось бачыце!.. — прагаварыў ён. — Дык прыдзецца крыху пачакаць. Нам вось трэба ў першую чаргу даць карову адной сям'і, іх адзінаццаць чалавек і ўсе біліся з немцам. Трэба такой сям'і даць карову?»

«Трэба», — кажу я.

«Гэта сям'я заслужаная, — загарэўся ён і, выцягнуўшы з стала нейкую паперку, дадаў: — Адзін сын панфілаўцам быў. Пад Масквою біўся. Там немцаў спынілі і адкінулі назад. Факт?»

«Факт»,—кажу я.

«Другі сын біўся пад Сталінградам. Там немцу наладзілі такое пабоішча, што ён больш не здолеў падняцца. Супроць факта не папрэш?»

«Не папрэш»,—кажу я.

«Трэці сын змагаўся на Орлоўска-Курскай дузе, там фрыцам добра наламалі бакі. Факт упартая рэч?»

«Упартая»,—кажу я.

«Чацверты сын пад Ленінградам быў снайперам. Ён стаяў на смерць. Гэта важны факт?»

«А што-ж? Яшчэ які, важны!»

«Пяты сын — партызанскі генерал. У яго войску было каля васьмідзесяці тысяч чалавек, а хлопцы якія—агонь! Гэта вам не хаханькі?»

«Якія там хаханькі! Пад нагамі ў немцаў гарэла зямля».

«Шосты сын Берлін штурмаваў, дапамагаў знішчаць фашысцкую нечысць. Гэта, можа, што-небудзь ды значыць?»

«Дзіва! абярнуць такога звера — трэба сіла».

«Сёмы сын—танкіст. Ён яшчэ і цяпер у арміі. Дачка—лётчыца, другая, праўда, яшчэ пешкі пад стол ходзіць, але, кажуць, не саступіць старэйшай. У нас жанчына — сіла».

«Ого, яшчэ і якая!»

«Бацькі таксама ваявалі: маці, кажуць, партызанам хлеб пякла, а стары мінёрам быў. Калі ішла рэйкавая вайна, ён цуды тварыў. На паседжанні райвыканкома многа пра гэтую сям'ю гаварылі. Шкада, сам яшчэ з імі не пазнаёміўся, — і зноў да мяне: — Дык хіба можна ім не даць каровы?»

«Не, — кажу, — язык не павернецца, каб адмовіць».

«Вось бачыце! — заўважыў ён. — А вы што — ужо ў слёзы? Калі я сказаў, што карова будзе у вас, дык будзе. Слова Заслонава—для мяне закон».

«Плачу я, голубе, не таму, — сказала я, — сына свайго ўспомніла, Паўліка. Ён таксама пад Масквою біўся і не вярнуўся адтуль».

«Нічога не зробіш, — пасуравеў старшыня. — Перамога не лёгка далася. Шмат наш народ прынёс ахвяр, але не скарыўся».

«І дачка мая,—кажу,—згарэла з сваім самалётам».

«А вы, Сымоніха, — устаў ён з-за стала, — не геруйце. Даю вам слова, што мы вам дапаможам. Другая чарга — за вамі.

«Добра», — згаджаюся я.

«Мы вырашылі, — прадаўжае ён, — перш за ўсё даць карову маці-гераіні, Сцепанідзе Александраўне Корчык.

«Каму, каму?»—перапытваю я.

«Сцепанідзе Александраўне Корчык,—паўтарае ён.— Яна сапраўдная гераіня. Дарэмна вы ківаеце галавою. Выгадаваць столькі дзяцей, дый якіх яшчэ, не так лёгка. І вы, цётка Сымоніха, дарэмна сумняваецеся. Вось паглядзіце, пра яе пішуць у газеце. Знатная жанчына! Вы яе, напэўна, ведаеце?»

«Ведаю, ведаю. Сцепаніда Александраўна Корчык— гэта я, а толькі, якая я гераіня? Я-ж можа, гэтак, як мой муж, не хадзіла на жалезку міны падкладаць. А што хлеб пякла...»

«Вы, Сцепаніда Александраўна Корчык?! — перабіў ён мяне.—Чаму-ж вы раней мне гэтага не сказалі?»

«Няма чым хваліцца»,—кажу я.

«Як гэта!—запярэчыў старшыня і расплыўся, як месяц. — Вось чытайце газету. На першай старонцы... Вы ўзнагароджаны ордэнам «Мацярынская слава». Ну, бачылі? Віншую!»

«Дзякую»,—адказваю я.

«Дык ідзіце, Сцепаніда Александраўна, і бярыце карову. І даруйце, што так выйшла».

— Так што, бацька, мы цяпер з малачком. Будзе чым дзяцей сустракаць з вайны, яны, нябось, па малаку засумавалі, — закончыла сваё апавяданне Сымоніха і

весела засмяялася.—А помніш я сказала: закінеш напе-рад, як знойдзеш. Толькі вось, Сымонка, няма ў нас дайніцы.

— Нічога, Сцепаніда Ляксандраўна, — адказаў Сымон, разгладжваючы сваю бараду. —Калі ёсць кароўка, дык будзе і дайніца.

*Кастрычнік, 1945 г.*
*г. Мінск.*

## *Дзве сястры*

Яны разлучыліся не па сваёй волі.

Яшчэ ў першую сусветную вайну Хімка вышла замуж за салдата, кульгавага Янука ў вёску Ліхадзіевічы, што на другім баку Нёмана. А пасля вайны з белапалякамі тут прайшла граніца, якая падзяліла сясцёр. Ніжэй па цячэнню, управа ад Нёмана, быў працярэблены лес, з'явіліся казённыя слупы. Меншая, Паліна, некаторы час жыла ў Зарэчы, у чужых людзей, а потым паехала ў горад работы шукаць, бо ў вёсцы і без яе было шмат лішніх рук.

Рана сёстры спазналі гора, малымі іх пакінула маці, якая будучы цяжарнай трэцім дзіцем пайшла з бацькам на рум калоды варочаць, там надарвалася і ад дачасных родаў памерла. Бацька ажаніўся ў другі раз і няўдала, мачыха не толькі падчарыц, але і яго з-за іх загрызала. Аднаго разу пасля сваркі, ён задумённым і заклапочаным пайшоў у лес, там пasклізнуўся і не паспеў адскочыць, калі валілі з пня дрэва, трапіў пад камель хвойкі, дык і не ўстаў з месца.

Дзяўчаты раслі сіратамі.

Не роўным быў лёс сясцёр у жыцці. Старэйшая, Хімка, жывучы на шастаку, гадавала чараду дзяцей,

якія крыху ўзбіўшыся на ногі, ішлі «на свой хлеб», а калі ўбіраліся ў сілу, падаваліся ў парабкі па маёнтках, працавалі ў асаднікаў. Часам у Ліхадзіевічах жартавалі:

«У Хімкі з Януком, што гадок, то і ядок».

«А што-ж, каб не Хімка і Янук, дык дзе-ж бы набраліся пастухоў і парабкаў».

Прозвішча Янука было Рэдкі, але ніхто яго так не зваў. Ён быў зусім непрыкметным чалавекам у вёсцы, ціхім і маўклівым. З кожным ён памяркуецца, і нават, бывала, гной на поле везучы, саступіць дарогу заможнікам, Антосю Гарбачэні і Саўку Дразду, якія, гарланячы, едуць з кірмашу.

У тысяча дзевяцьсот трыццаць дзевятым годзе, пасля векапомнай даты, калі Беларусь была ўз'еднана ў адзіную дзяржаву, сям'я Янука Рэдкага па-другому зажыла. Януку прырэзалі ад кулака Антося Гарбачэні зямлі, але чалавек гэтым не задаволіўся, ён меркаваў у калгас пайсці. Сёстры наладзілі паміж сабою перапіску і збіраліся пабачыцца, дык пачалася вайна. Хімка часта перачытвала лісты Паліны, асабліва адно месца:

« ... Не вагайся, сястрыца, а смела ідзі ў калгас, у гэтым твая будучыня...».

Пра Янука Рэдкага загаварылі ў Вялікую Айчынную вайну, тады ён паказаў сябе. Янук Рэдкі яшчэ ў тую вайну ваяваў з немцамі і з-за іх ледзь не страціў жыццё. Аднойчы Янук Рэдкі сабраў сваіх старэйшых сыноў і сурова загаварыў:

— Вось што, хлопцы. Немцы, кажуць, ужо Мінск забралі. Калі вы думаеце, што нехта без нас верне нам волю, дык вы думаеце неразумна. Дый не такі немец, ён не дасць дыхнуць, я даўно яго ведаю. Уеўся ён мне ў косці — век не забуду. За Нёманам людзі пайшлі ў лес. Трэба і нам брацца за стрэльбы. Чырвоная Армія вызваліла нас ад паноў, а цяпер ёй самой цяжка. Не дзіва: такая, пане ты мой, сіла сунецца. Дый бачылі, як роз-

ныя гадзюкі падкалодныя паднялі галовы... Да Саўкі Дразда і яго хаўрусніка Гарбачэні не падступіцца, яму капаюць... Дык трэба і немцаў, і Саўку, і Гарбачэню, і ўсіх, ім падобных, — у тую яму.

І кульгавы Янук з сынамі падаўся да партызан, што групаваліся ў лесе. Большасць з іх былі мясцовыя калгаснікі-актывісты, траплялі і вайскоўцы, якія апынуліся ў акружэнні. А Хімка з гуртам дзяцей (самая меншая дзяўчынка была ў калысцы) засталіся ў вёсцы. А жыць-жа трэба. Упраўна каля работы хадзілі рукі кабеты. Яна першая ў Ліхадзіевічах уставала і пазней за ўсіх клалася спаць.

Даводзілася Хімцы часам «ваяваць» з малымі, якім хацелася пагуляць, а яна прымушала іх да працы, хоць у самой пры гэтым на часткі разрывалася сэрца, што дзеці пазбаўлены маленства.

* * *

Аднаго разу, выпраўляючыся на поле жаць, Хімка сына Адася навучала (упартае было дзіця і ў вёсцы ўсе яго звалі па бацьку «Янучок»), каб добра пільнаваў хату, — яны жылі канцавымі, — і наказвала яму:

— Прачнецца Марылька, дык глядзі-ж, каб пакарміў яе, — нальеш поліўкі з крупніку і забеліш малаком (унь у гладышыку!), — а толькі дастаючы не выкулі гаршчок. Ты ўжо хлопец вялікі, павінен дбаць пра гаспадарку. Як дзяўчо ўстане і пад'есць, вынясеш яе на падвор, пасадзіш на пясок, а сам насячэш карчагі на падпалку. А толькі, каб дзяўчына куды не ўлезла і не набіла гузакоў.

— А што ты, мама, у бутэльцы там хаваеш? — з цікаўнасцю запытаўся Адась, убачыўшы, як маці на паліцы застаўляла поўкварту збанкамі.

— Воцат,—хутка адказала Хімка, зацягнуўшы занавескаю паліцу, а на самай справе ў бутэльцы была настойка вішні, маці чакала бацьку з лесу і падрыхта-

вала пачастунак.—Дык глядзі-ж, каб нічога не чапаў,—воцатам можна атруціцца. Ты чуеш, што я табе кажу, ці ўсё гэта, як гарохам аб сцяну?

— Чую,—адказаў Адась, але ў яго ў адно вуха ўваходзіла, а ў другое выходзіла. Ён меркаваў, дзе-б знайсці кавалак сырой асіны, каб выстругаць «аўтамат», які хлопчык бачыў у салдат.

— Слухай мяне!—гаварыла далей Хімка.—На выгане ходзіць спутаная кабыла, дык наглядай за ёю, каб часам не ўбілася куды ў шкоду. Барані божа трапіць у авёс Антося Гарбачэні, яны-ж з старастам, Саўкам Драздом, кумы, недавяркі здзяруць з нас скуру. На прыгуменні пасвіцца цялё, то каб хто не адчыніў весніц і не выпусціў. Дый глядзі-ж, каб зноў не расклаў каля будынку агню, а то зробіш пажар, дык тады мы прапалі.

І пайшла Хімка цераз агароды, вытаптанаю, як ток на гумне, сцежкаю, з расою на поле. Прайшоўшы агароды, Хімка спынілася і паглядзела на ўсход, яна, як сланечнік да сонца, заўсёды душою гарнулася туды, чакаючы з Усходу збаўлення. А хлопчык, хоць яму і карціць зрабіць «аўтамат»,—ён засеў, яму не на жарты,—дый хочацца пабегаць па вуліцы, але сядзіць у хаце, ён стараецца, каб дагадзіць маці, не ўгнявіць яе, а можа і сапраўды бацька прыдзе, дык «заячага хлеба» прынясе і пакажа сапраўдны аўтамат, а то дасць стрэліць, калі для гэтага будуць добрыя варункі. А тым часам нехта спудзіў кабылу, яна парвала пута і ў старастаў авёс.

— Янучок! кабыла ў шкодзе! — паведаміў суседскі хлопец.

Адась як выскачыць, забыўся зачыніць дзверы ў хаце, пакінуў адчыненыя весніцы на прыгуменні. Пакуль падлетак падбег, каб выгнаць кабылу з аўса, дык стараста, кудлаты Саўка Дрозд, раней за яго ўправіўся і забраў гнедую ў хлеў. Вяртаецца з пустымі рукамі пазнуры Адась, глядзіць—цяля лётае па капусце, ажно лісце ляціць. Крычыць суседка. Пакуль ён загнаў падласую

на прыгуменне, дык нашчэнт змогся. Заходзіць змораны ў хату, бачыць—ляжыць на падлозе збанок і суседскі кот-памаўза ласуецца малаком, а сястрычка, разбуджаная грукатам, трэць кулачкамі вочы і аж заходзіцца плача. Калі дзіця ўбачыла Адася, яно замахала ручкамі і на сваёй мове загаварыла: «На, гам». Трымаючы на адной руцэ Марыльку, якая з жалю ўсхліпвала, Адась палез у печ, каб дастаць крупнік, і вывернуў гаршчок, разбіў, палілася страва, зашыпела ў печы.

Бачыць Адась, што не мінуць лупцоўкі (маці часта яго частавала скарачом!), пайшоў замальваць «грахі»—секчы карчагу, каб дагадзіць маці, і можа дзе-небудзь знойдзе якую дошку на «аўтамат». Ён з такой старанасцю стаў секчы карчагу, што так стукнуў па пальцы—аж іскры з вачэй пасыпаліся. А тым часам адляцела шчэпка і набіла дзяўчынцы гузак, малая зайшлася плачучы. Адась са злосці кінуў вобземлю сякеру, што тая аж зазвінела, закруціў анучай палец і сеў задумаўшыся на ганку. Плача дзіця, і ён плача. І ўсё яшчэ нічога, але як на тое ліха, наляцелі нейкія нямецкія абознікі—вядома канцавая хата—і зрабілі «капут» курам. Вось тут ужо хлопчык зажурыўся, але яго благі настрой перабілі вясковыя хлапчукі, якія прынеслі поўную шапку ракаў. Нехта з хлапчукоў усадзіў «вусачу» ў клешні трэску, а другі ўбачыў на акне тоўстыя васковыя свечкі, падшыванцы падгаварылі Адася, каб паспрабаваць іх уставіць у клешні і запаліць. Атрымалася дзіўнае відовішча, поўзаюць ракі па падлозе з запаленымі свечкамі. Марылька да таго захапілася гэтай «гульнёй», што кінула смактаць скарынку і ад задавальнення замахала ручкамі. Неяк здарылася так, што дзеці і не заўважылі як адзін рак запоўз пад лаву ў куток, прысланілася свечка да сцяны, затрашчаў мох і пабег змейкаю агонь па спарахнелых, з'едзеных шашалем бярвеннях старой хаты. Разбегліся напалоханыя дзеці, але

Адась не разгубіўся, ён схапіў вядро, лінуў на сцяну ваду і патушыў пажар.

Засмуціўся Адась, і адгаварыцца ніяк нельга будзе, падыходзіць да паліцы, бачыць стаіць закаркаваная бутэлька. «Воцат»—мільганула ў галаве. Ён паспрабаваў узяць на язык—даволі прыемнае пітво, панюхаў—пахне вішняй, і залпам выпівае чарку. Да Адася цягнуліся малыя дзеці, каб ім наліў, але ён не дае, страшыць—атруціцца можна. Потым ідзе да ложка, лажыцца на пасцель і чакае смерці, але ніяк не можа дачакацца. Адась толькі шкадуе, што не зрабіў «аўтамата». Хлопцу прыходзіць у галаву думка: «Трэба яшчэ выпіць—тады хутчэй памру». Хоць яму ўжо і паміраць не хочацца. Неяк прыемна стала Адасю, галава кружыцца і па целе ідзе цяпло.

І ўсё-ж Адась устаў, хістаючыся падыйшоў да паліцы і яшчэ выпіў два кілішкі. Добра закружылася ў Адася галава, пахіліла на сон. Адась неяк дабраўся да лавы і лёг.

Вяртаецца стомленая Хімка з поля. Бачыць у хаце непарадкі. Напалоханая маці моўчкі перавяла погляд на сына, ён, зблажэлы і асунуты, з ускудлачанымі на галаве попельнага колеру валасамі, выцягнуўшыся, ляжаў на лаве. Успляснула рукамі маці, яна хацела нешта сказаць.

— Не сярдуй, мама,—загаварыў Адась,—бо я ўсё-роўна памру.

— Ча-а-му?—напалохана спыталася Хімка. — Няўжо-ж табе жыць абрыдла? Ты-ж, дзіцятка, яшчэ не жыў...

— Я таго «воцату» выпіў,—ён вачыма паказаў на паліцу, дзе стаяла бутэлька.

— В-о-ой, сынок, столькі выпіць, дык-жа ты згарыш, гэта-ж настойка на гарэлцы — і замест крыку стала частаваць кіслым малаком. Яна сама сабе падумала: «Ці-ж ён можа дагледзець хату, за ім самім патрэбен

догляд... Ой ты, жыццё аднаасобніцкае!.. Пэўнасці няма ў жыцці ні ў нас, ні ў нашых дзяцей... Трэба шукаць які небудзь іншы спосаб...».

І Хімка, узяўшы на рукі дзяўчынку, якая прагна ўхапілася за худыя грудзі маці, стала плакаць. Буйная салёная сляза Хімкі скацілася на пульхную шчочку дзіцяці, нездаволеная дзяўчынка пакруціла галоўкаю, скрывілася і таксама заплакала. Марылька была галоднай, яна плакала ад таго, што ў маці былі пустыя грудзі.

У хату ўсунуўся стараста, Саўка Дрозд, і замест прывітання сказаў:

— Кабылу будзеце выкупляць, ці не?

— А колькі трэба плаціць?—не гледзячы на яго, спыталася Хімка. Яна ўжо ведала, што стараста забраў кабылу ў хлеў, ёй пра гэта паведамілі суседскія дзеці, і што кабыла ўвесь дзень стаяла галоднай.

— Пуд жыта,—паведаміў Саўка, яго маленькія невыразнага колеру вочкі бегалі, як у злодзея, ён прамармытаў.—Гэтулькі аўса змарнаваць, ушчэнт збіта поле...

— Маніце,—устаў з лавы Адась.—Кабыла толькі ўскочыла ў авёс...

— Маўчаць, нягоднік!—ускіпеў Саўка.—А то як зніму папругу... Як ты з ксяндзом размаўляў, калі ён у цябе спытаў пра бацьку?..

— Я сказаў, што тата ў заработкі пайшлі.

— Ойцец у мяне быў,—паведамляў Саўка.—Ён запытаўся, чаму бацькі ў касцёле не відаць. Дык як ты яму адказаў, скажы пры маці?..

— Я сказаў: з касцёла не есці хлеба.

— Бацькавы словы,—зашыпеў гадзюкаю Саўка.—Рыхтык... Я мяркую, што маці цябе за гэта па галоўцы не пагладзіць... Будзе лупцоўка!..

— А можа поўпуда хопіць за кабылу?—не слухаючы Саўкі, спыталася Хімка.

— Пуд і не менш. Сам ксёндз ацаніў. Гарбачэня быў панятым.

— Добра,—згадзілася Хімка.—А толькі аддадзім тады, калі зробім акалот жыта, бо цяпер няма чым плаціць.

— А чаму самі не ходзіце да імшы?—цікавіўся Саўка.—Хоць вы і праваслаўная, але за каталікам замужам... у касцёле вянчаліся...

— Няма калі, трэба дбаць, каб кавалак хлеба быў на стале,—адказала Хімка.

— А дзе-ж Янук? У валасці ім цікавяцца.

— У заработках.

— Ведаю я, у якіх ён заработках,—заўважыў Саўка, і, ужо выходзячы, сказаў:—Дык прыходзьце па кабылу... А за абразу касцёла і айца перад Езусам Хрыстусам у адказе будзеце... Сведкам быў Антось Гарбачэня...

— Толькі, каб не перад немцамі адказваць,—сказала Хімка.

— Што-о, насміхацца,—зазлаваў Саўка Дрозд.—Гэта вам дарэмна не пройдзе...

* * *

Сястра Хімкі, Паліна, па мужу—Ламака, жыла ў Гомелі, яна да вайны працавала на чыгунцы машыністам, а потым пакінула працу і некаторы час была «хатняй гаспадыняй».

Ужо ў часе вайны Паліна Ламака зноў вырашыла пайсці працаваць на чыгунку.

Муж Паліны таксама быў машыністам, старэйшы сын—лётчык, сярэдні вучыўся на доктара, дачка—на настаўніцу, а меншы хадзіў у пяты клас сямігодкі. Эвакуіраваўшы з бацькамі мужа дваіх дзяцей, Паліна стала дамагацца, каб ёй далі паравоз.

— Не магу я ў часе такой вайны адседжвацца...

— А дзе-ж мы тут возьмем вам паравоз,—пярэчылі

ў Упраўленні дарог. У гэты час ішла эвакуацыя прадпрыемстваў з горада.

— А манеўраны?

— Які?

— Той, што каля дэпо стаіць...

— Гм... Разбітае карыта...

— Нічога... Ён яшчэ паслужыць нам... Не дарма кажуць: «У добрай гаспадарцы і іржавы цвік спатрэбіцца...».

— А дзе ўзяць брыгаду?..

— Кірыла Гаўрылавіч Бокуць, просіцца быць памочнікам машыніста... А за качагара возьмем Сідара Аўдзеявіча Каляду...

— Старыя людзі... Паліна Данілаўна! Як вы з імі саўладаеце... Адзін недачувае, а другі недабачыць...

— Каляда сорак гадоў працаваў на дарозе, а цяпер зноў хоча вярнуцца на паравоз... У яго зусім законнае пачуццё—чым можа, дапамагчы біць немца... Трэба ўзяць яго на працу качагарам... Не-е?..

— Вартаўніком, калі ласка...

— І няўжо ў вас, Андрэй Амбросевіч, няма сэрца... дык і вы-ж некалі будзеце старым...

— Яшчэ раніцою я паслаў яго ў эшалон, няхай садзіцца і едзе, а ў тыле падбярэм і для яго працу... Дый дзе вы цяпер яго знойдзеце?..

— А ён за дзвярыма стаіць,—паведаміла Паліна.

— Як!—абурыўся Андрэй Амбросевіч.—Няхай нават не думае, на паравоз я яго не пашлю...

У гэты час адна за другою блізка разарваліся бомбы, скалануўся дом, забразгацелі вокны, пасыпалася шкло, насцеж адчыніліся дзверы — там стаялі Бокуць і Каляда, слава якіх некалі далёка грымела, а цяпер іх не хацелі ўзяць на паравоз, а адпраўлялі ў тыл. Крыўдна стала старым.

— Чу-у-ў,—гаварыў Каляда.—Ды я да самога нар-

кома дайду, а даб'юся, што буду працаваць на паравозе...

— Ага, — не дачуўшы згаджаўся Бокуць. — Мусіць вялікую бабахнуў, бо аж зямля скаланулася... Але будзе час — пагоняць немцаў назад... Горача будзе!.. Толькі-б пажыць і сваімі вачыма ўбачыць, як яны, падмазаўшы пяткі, будуць уцякаць...

— Не саўладаеце вы з старымі,—зазначыў Андрэй Амбросевіч.

— Я іх добра ведаю—злосныя да працы.

Пачуўся рэзкі тэлефонны званок.

— Я вас слухаю,—узяўшыся за трубку, вялым, ахрыплым голасам, гаварыў Андрэй Амбросевіч, на твары ў яго адбілася стома ад бяссонных начэй. — Што-о? Даць паравозную брыгаду на бронецягнік? Каго? Кажана? Гэта адна з лепшых брыгад. З кім я адпраўлю эшалон з дзецьмі?.. Не магу...

— Я павяду эшалон з дзецьмі,—умяшалася ў размову Паліна.

— Хіба льга вашай брыгадзе даверыць такую важную справу,—адказаў Андрэй Амбросевіч.

— Няўжо-ж я ліхадзейка якая, дык і ў мяне-ж ёсць дзеці,—запярэчыла Паліна.

— Хто перашкаджае размаўляць? А тут Паліна Ламака лезе з размовамі, дамагаецца, каб ёй далі паравоз,—растлумачыў Андрэй Амбросевіч у тэлефон і раптам загарачыўся.—Што-о? Каляда з Бокуцям і ў вас былі? Як? Адносна Каляды ад наркома ёсць тэлеграма. Ну што-ж, няхай будзе так, а толькі я з сябе знімаю адказнасць... Чаму?.. А таму, што іх трэба на печ падсаджваць, а яны на паравозе хочуць працаваць... ды яшчэ ў такі час... Я іх паважаю, але...

Гарэў Гомель. Клубы дыму ўзвіваліся ўгару. Андрэй Амбросевіч Стасевіч, які адказваў за эвакуацыю, усё зрабіў для таго, каб вывезці людзей і каштоўныя грузы. Але Стасевіч да таго змогся, што калі сеў на платформу

апошняга эшалона, дык не дачакаўшыся гудка машыніста аб адпраўленні, седзячы на якойсьці скрынцы з інструментамі Гомсельмаша, заснуў і моцна захроп.

Эшалон, які вяла Паліна Ламака, быў перапоўнены дзецьмі, а толькі не чуваць было іх звонкіх галасоў. Роўнамерна пастуквалі колы, час-ад-часу звінелі буфяры, пыхкаў паравоз, набіраючы хуткасць. У Паліны мільганула думка пра сям'ю, мужа і дзяцей, пра сястру, з якой не давялося спаткацца.

— Сідар Аўдзеявіч, пара садзіцца,—заўважыў Бокуць.—Пашуруй...

— Шуруй не шуруй, Кірыла Гаўрылавіч, не дапаможа,—голасна гаварыў Каляда, адчувалася, што ён ведае сваю справу. Аголіш каласнікі, горай будзе, толькі ахалодзіш трубы... На гэтым перагоне ніколі не нагоніш запас... А вось мінем лес, там другая справа, можна будзе і запраўку даць... напаіць... а на сто першай вярсце закурым люльку... З нашым механікам не прападзеш... бачыў, як вядзе машыну... люба-дарага!.. Як сустрэнуся з наркомам, дык абавязкова раскажу пра машыніста-жанчыну... Нарком даўно мяне ведае... Яшчэ ў семнаццатым годзе з ім пазнаёміўся... Лазар Майсеявіч у Гомелі працаваў...

— Га-а?—пытаўся Бокуць.—Недачуў, што ты сказаў...

— Кагановіч у рэвалюцыю быў у Гомелі,—голасна сказаў Каляда.

— Ага, ага, — замахаў галавою Бокуць.

Паліна пільна ўглядалася ў паветра і размовы памочніка з качагарам не чула. Сустрэчны вецер раздзімаў пасмы яе русых валасоў, якія вылезлі з-пад сіняй шапачкі. Раптам яна схапілася за рукаятку і сцішыла ход паравоза. На твары ў яе адбіўся выраз спалоху, разгубленасці і адчаю, потым пасуравеў твар, нахмурыліся бровы, заблішчэлі вочы. У яе выспяваў план змагання з ворагам.

— Памыліўся!—голасна сказаў Каляда.—Добры механік тут націскае на ручку... тады было-б люба-дарага... эт, ведама...

— Самалёт!—паказаў рукою Бокуць.—Ты, дарагуша, не кляплі на механіка...

— Ліха з ім, з самалётам, немцаў баяцца на паравозе не ездзіць,—махнуў рукою Каляда і злосна бразнуў дзверцамі топкі. — Цяпер прыдзецца пыхкаць... З разгону лёгка-б выскачылі на ўзвышша і люба-дарага, а так будзем круціць хвост валу...

— Нічога, дарагуша...

«Юнкерс» вcauseслізнуў з-за воблака і пайшоў у піке. Паліна рэзка затармазіла: яна хутка перавяла ход і эшалон пайшоў назад.

— Каб знаў, дык не звязваўся-б з ёю, дамагаўся-б на бранявік,—бурчэў нездаволены Каляда.—Разаб'юць эшалон... Як я тады гляну ў вочы наркому...

Неўзабаве наперадзе пачуліся адзін за другім выбухі, узняліся ў паветра два вялізных чорных слупы, ведрам пасыпалася зямля, шуганулі ва ўсе бакі птушкі. З візгам і завываннем пранесліся асколкі, здзіраючы кару на дрэвах.

Эшалон спыніўся, пастаяў, а потым зноў рушыў.

— Гэта-ж толькі ракі назад поўзаюць,—бубніў нездаволены Каляда, падкідаючы ў топку вугаль.—Таўчэм у ступе ваду...

— Ага,—ківаў галавою Бокуць, разглядаючы варонкі, бомбы разарваліся недалёка ад палатна чыгункі.—Як развярнула зямлю, аж дрэвы з карэннямі павывarачвала...

Самалёт зрабіў заход і зноў пайшоў у піке. Паліна і на гэты раз поўным ходам павяла эшалон назад, зноў бомбы далёка ад цягніка разарваліся.

Стралою ўзвіўся «Юнкерс» угару, відаць было, што лётчык быў добра спрактыкаваным, ён рабіў трэці заход, намерваючыся абстраляць эшалон з кулямёта.

Цягнік стаяў у ляску. Каляда не разлічваў на стаянку і нагнаў шмат пары. Стары нездаволена мармытаў сабе пад нос, пускаючы ваду ў кацёл, якую ўсёадно выкіне з парам. Паліна пільна наглядала за самалётам, відаць было, што ў яе нарадзілася новая думка, як вывесці цягнік з-пад абстрэла,—гэта таксама трэба ўмець зрабіць. Яна гатова была сваім целам прыкрыць дзяцей, абы захаваць ім жыццё. Неабходна «адарвацца» ад праціўніка. Паліна цяпер нагадвала арліцу, гатовая сама ўзляцець у паветра, каб перагарадзіць дарогу самалёту, ад якога цяжка ўцячы. Калі «Юнкерс» зрабіў разварот і пайшоў па курсу на зніжэнне, рыхтуючыся з кулямёта расстраляць эшалон, Паліна зноў націснула на ручку. Забуксаваў паравоз, абдало тэндар парам і вадою. Каляда скоса паглядзеў на Паліну і адвярнуўся. Цяжка, з натугай, паравоз скрануў з месца эшалон. Паліна прыбавіла пару, загрукацелі колы, замільгалі выносістыя хвоі, зарабацела ў вачах—паравоз набіраў хуткасць. І ўрэшце Паліна адкрыла рукаятку да адказу. Цягнік выскачыў у чыстае поле. Застракатаў кулямёт, ён захапіў толькі хвост эшалона.

— Ага, трасцу ўзяў! — прагаварыла Паліна і выцерла на лобе пот. Па яе твару прабегла радасная ўсмешка.

— Ну як, дарагуша?

— Люба-дорага!

— Тота-ж...

— Так абдурыць немца,—задаволена пасміхаўся Каляда.—Абавязкова пры сустрэчы раскажу наркому... Закурыш люльку?..

— Ага, шкода, палеткі не ўбраны, колькі гіне людское працы, — разважаў Бокуць, а потым павярнуўся да Каляды і сказаў:—Закурым майго тытуню. Прыемна пахне і мацунак мае.

— Давай, закурым!—і, паглядзеўшы ў бок Паліны, дадаў: — Ай, механік!

— Але, — разважаў уголас Каляда. — Жанчына з характарам. Немца кругом пальца абвяла. Не ўзяць ім нас...

— Не-е, — згадзіўся Бокуць.

Цягнік поўным ходам імчаўся на Усход. Паравоз выкідаў з трубы лёгкі пар, які клубамі разыходзіўся ў паветры.

Паліна ўспомніла сястру Хімку, якая пэўна засталася на Захадзе, і яе сэрца аблілося крывёю.

— Не сумуй, механік, мы пераможам, — голасна сказаў Каляда.

— Абавязкова, — сцвердзіў Бокуць.

І Паліна, паглядзеўшы на старых, радасна ўсміхнулася, яна ўжо адчувала сябе пераможцай у няроўнай барацьбе з нямецкім лётчыкам.

* * *

Адгрымелі баі, вярталіся па дамах воіны, а толькі Янук Рэдкі не прышоў: ён быў пахаваны ў брацкай магіле, на ўскраіне Белавежскай пушчы, пры гасцінцы; каля магілы нябожчыкаў расла арабіна, а хто яе пасадзіў, ніхто не ведаў.

Хімка пагаравала, паплакала ціха, каб ніхто не чуў і нават дзеці не бачылі, але не пайшла ў касцёл служыць імшу па нябожчыку. Яна вырaклася касцёла. Хімка яшчэ з большай энергіяй узялася за працу. А трэба было пачынаць жыць спачатку, будавацца, бо як толькі немцы даведаліся пра Янука Рэдкага, што ён у партызанах, дык спалілі хату. Добра яшчэ, што людзі папярэдзілі Хімку, як немцы ехалі ў Ліхадзіевічы, — яна з дзецьмі ўцякла,—а то не здабраваць-бы ўсёй сям'і. У Хімкі не выходзіла з галавы, як далей жыць. Яна разгарнула лісты сястры Паліны, якія перад вайною атрымоўвала і зноў перачытала тое месца, дзе гаварылася: «... Не вагайся, сястрыца, а смела ідзі ў калгас, у гэтым твая будучыня...».

І Хімка ўголас падумала:

— Няўжо-ж Янук, ідучы з сынамі ў лес, меркаваў пасля вайны зноў душыцца на гэтым шастаку, хоць-бы і з прырэзкай старастаўай зямлі. Не! Ён марыў аб другім, парваўшы з касцёлам, ён меркаваў па-інакшаму жыць... (Яна ўспомніла словы Янука, які казаў: «Касцёл скоўвае розум і волю чалавека...»). Не, Янук дбаў пра лепшую долю для дзяцей...

— Ты пра што гэта, мама, гаворыш? — пытаўся Адась. — Якую долю?..

— А што, каб паспрабаваць і ў нас арганізаваць калгас?—сама ў сябе пыталася Хімка.

— Не так лёгка, мама, успароць нашы Ліхадзіевічы,—заўважыў, як стары, Адась.

— А трэба пачынаць жыць па-новаму, — зазначыла Хімка. — Гэтак, як за Нёманам... Бачыў, дзіцятка, цёткі Паліны сярэдняга сына, Юліка,—у дактары выбіўся... Праўда, маці яго работніца, дык што з таго, а я сялянка... Мы родныя сёстры... Каб я на свае вочы не ўбачыла таго вайскоўца, што ў нас піў хлебны квас, дык нікому-б не паверыла, што сялянскі хлопец мог генералам быць... Калі мы жылі ў Зарэччы, дык разам гулялі... Яшчэ ён тады мне, сіраце, лапці сплёў... Не, трэба жыць іначай!..

— А ці ведаеш ты, мама, што той самы ваенны, ён пасля ранення падцягвае нагу, прыехаў у Турына і будзе працаваць сакратаром райкома..:

— Што ты гаворыш?

— Дапраўды...

— Грушэўскі?..

— Няўжо-ж...

— Пайду да яго, ён дапаможа нам калгас арганізаваць...

І пачалася ў Ліхадзіевічах гамонка, палілася, як вясновыя воды, крануўся лёд. Ужо каторы дзень да другіх пеўняў, а то і да трэціх, як пчолы ў разварушаных вул-

лях, гулі людзі па хатах. Хімка Рэдкая, атрымаўшы дапамогу з боку Грушэўскага, — ён у Ліхадзіевічах зрабіў даклад аб перавазе калгаснага ладу,—падняла ўсіх на ногі... Яна прывяла факты і з генералам (цяпер сакратаром райкома), і з доктарам (сынам сястры Паліны), а галоўнае — забраць пад калгас зямлю пана Патоцкага, які ўцёк з немцамі, адабраць зямлю ў ксяндза Яворскага, які сам яе не вырабляе, а наймае парабкоў, забраць зямлю былога старасты—кулака Саўкі Дразда, а таксама ўзяць валокі дзве зямлі ад кулака Антося Гарбачэні.

— А навошта нам быць першымі? — загаварыў Антось Гарбачэня. — Кругом жывуць па-аднаасобніцку... Совецкая ўлада не прымушае сялян, каб яны ішлі ў калгас...

Гарбачэня быў нізкі, круглы, з лысінкай на галаве, як мядзяны пятак. Ён гаварыў паважна, цэнячы кожнае сваё слова на вагу золата. Хімкі Рэдкай ён цяпер пабайваўся, а таму быў асцярожным.

— Мы самі хочам у калгасе жыць, — гаварыла Хімка.

— Хіма Данілаўна! А куды спяшацца,—з усмешкай пярэчыў Гарбачэня.—Прыдзе час—усе пойдзем...

— Яшчэ ці прымем вас,—заўважыла Хімка, яна працягвала. — Вам зразумела не да спеху, маючы стольхі зямлі... А як мне жыць на шастаку... адзінаццаць чалавек сям'я...

— Кума зямлю, Саўкі Дразда, аддамо...

— Не, у калгасе наша будучыня...

— А ты падумай добра, свая зямля, — сказаў Гарбачэня, круцячы цыгарку. Ён, прыкурваючы, патушыў лямпу.—Дык што-ж, мужчыны, час па хатах... гаспадарам трэба адпачываць...

— Пасядзіце, ноч вялікая, — пачуўся голас з печы.

— Пойдзем! — не ўнімаўся Гарбачэня.

— Ідзіце, хіба вас хто трымае, — запальваючы лямпу, прагаварыла гаспадыня хаты.

Гарбачэня паважна загаварыў:

— Маё поле, як хачу так і вырабляю, што хачу, тое і сею, калі захачу, тады і ўстану...

— Што мне з таго «маё», — не згаджалася Хімка, — калі я век зжыла, а шчасця не бачыла... З-за гэтага «маё», родныя браты, Пракоп з Адамам Кухты, пазабіваліся, як пеўні, не маглі падзяліць сваіх трох моргаў... А ў ксяндза Яворскага цэлы фальварак, у пана Патоцкага быў цэлы маёнтак... Абрыдала працаваць і на пана, і на ксяндза, і на кулака...

— Гэта-ж хто кулак?—не вытрымаў Гарбачэня.

Ягамосць Гарбачэня, спакойна адказала Хімка.—Дык што мы страцім — лапці, а стаць можам людзьмі...

— Ведаю куды ты гнеш, кабета,—загарачыўся Гарбачэння.—Хочаш, каб табе грамадою дапамаглі пабудаваць хату...

— Во, во, — нехта піскнуў і схаваўся.

— Хто там войкае, — гаварыў Гарбачэня. — Калі на тое пайшло, дык дзе ты дзенешся, дапаможаш, а толькі навошта гэта калатня... Але ты, Хіма Данілаўна, не вельмі спяшайся з калгасамі... Мы людзі несвядомыя, любім мець сваю зямлю...

— Ну, а калі-б мне дапамаглі хату пабудаваць, дык няўжо-б саграшылі, — загаварыла Хімка. — Унь пад Несвіжам адной такой самай як я пяцісценку пабудавалі... Муж загінуў... тры сыны ў войску... дык няўжо-ж мне з малымі дзецьмі прападаць?..

— А чаго ў мяне па кім будзе балець галава, — ускіпеў Гарбачэня. — Сваіх клопатаў хапае... Я хачу жыць аднаасобна...

— Ну і жыві сабе аднаасобна, — усміхнулася Хімка.—Не пра цябе ідзе гаворка. Думаеш я табе дарую,

што ты разам з старастам выдаў майго Янука немцам... Ніколі я гэтага не дарую...

— Маўчы, кабета! — аж прастагнаў Гарбачэня. — Чым ты гэта давядзеш?.. Ай, ай, людзі, што яна на мяне клепле... Ну і жанчына...

— Будзь пэўны, давяду! Помніш, калі я на спіне прынесла Саўку Дразду жыта за кабылу,—у вас тады было баляванне, — сядзелі нямецкія афіцэры, ксёндз... Саўка Дрозд сказаў: «Ёсць меркаванні, што муж гэтай жанчыны, Янук Рэдкі, не ў заработках, а ў партызанах...». І ты гэта пацвердзіў.

— Ой, антыхрыстка! — не вытрамаў Гарбачэня. — Не дарэмна яе ойцец Яворскі пракляў... Гэта не жанчына, а чорт!.. У яе на нагах, казаў ойцец, нават павінны быць «капыты»...

— І я з сваімі «капытамі» наступіла на вашы любімыя мазалі, — пасміхаючыся гаварыла Хімка. — Ойцу Яворскаму шкада стала фальварка, а вам двух валок... Нічога, мы пакінем вам зямлі роўна столькі, сколькі вы сваімі рукамі здолееце вырабіць, а астатнюю—пад калгас... Я, жанчыны, запісваюся... Мне хочацца, каб мае дзеці дасталі шчаслівую будучыню...

Гэтыя словы як гром ударылі, заварушыліся людзі, загаманілі. А праз некаторы час падыйшла другая жанчына, трэцяя (салдаткі), а пасля іх сталі запісвацца і мужчыны...

Прайшло больш за два гады. Выправіліся калгасніцы жаць, сярод іх была Хімка; яны праходзілі паўз гару, на якой узвышаўся касцёл. Каля паркану, якім быў абгароджаны касцёл, рос чортапалох, лапух і палын. З вежы касцёла падняўся крумкач і наперарэз праплыў у бок лесу, які сцяною стаяў навокал шырокіх калгасных палеткаў. З веснічак, нібы здань, высунулася сутулая чалавечая постаць у чорным. Пераняўшы гурт жанчын, якія ішлі з сярпамі, Яворскі, першы прывітаўшыся, загаварыў:

— Хімка Рэдкая! Я не ў крыўдзе на вас. Калгас — калгасам, а касцёла нельга мінаць. Сёння будзе імша... няўжо вы забыліся на свята...

— А хіба льга туды заходзіць з «капытамі», — засмяялася Хімка, і праходзячы дадала:—Ніяк не выпадае... Усяго добрага!..

І яны разышліся ў розныя бакі, кожны з сваімі думкамі, марамі, поглядамі на жыццё.

На дарозе жнеі спаткаліся з незнаёмай.

— Як мне прайсці ў Ліхадзіевічы?—спыталася жанчына, па ўсім відаць было, што яна гарадская.

— За гэтым ляском у лагчыне будзе вёска, — адказала Хімка, пільна ўглядаючыся ў твар незнаёмай, а потым схамянулася: яна па голасу пазнала сястру.—Паліна!

— Хімка! — і сёстры пацалаваліся.

— Дык як ты жывеш на сваім шастаку? — пыталася Паліна.

— Як шастаку? — нібы ўспамінаючы пра чорную ноч, запярэчыла Хімка. — Усё гэта, як вокам акінуць — наша, палеткі калгаса «Перамога».

І Хімка Рэдкая тут за старшыню, — дадала кабета.— Гэта яна дамаглася, каб арганізаваць калгас...

— Праўда? — здзівілася Паліна.

— Так, — сцвердзіла Хімка.

— Дык вядзі, паказвай сваё багацце, — задаволена ўсміхнулася Паліна.

— Добра.

— Ой, колькі ў жыце васількоў, — заўважыла Паліна. — Як прыгожа!

— Гэта-ж летась не паспелі ачысціць зерне, — вінавата апраўдвалася Хімка і густа пачырванела.

Дзве сястры, узяўшыся за рукі, як некалі малыя, поўныя шчасця, ішлі паміж житоў, яны былі ўпэўнены ў сваёй будучыні, неяк па інакшаму цяпер ім свяціла сонца.

*Ліпень, 1948 г.*
*Ліцвяны.*

## Зары насустрач

— Ну што-ж, відаць, з нашай гаворкі нічога не выйдзе, — устаў і захадзіў па зямлянцы старшыня калгаса «Наша жыццё» Тамаш Шышка, ён падышоў да акна, прыклаў руку да ілба і зазірнуў у шыбу. — На дварэ ірвуць вятры...

— Яны нарвуць буру,—прагаварыў Лукаш Гнецька, а потым дадаў: — Ды зразумей ты, Тамаш, што нам толькі для таго, каб вылезці з зямлянак, спатрэбіцца шмат год...

— Не забывайся, Лукаш, што ў нас Совецкая ўлада, калгас, а гэта сіла,—горача загаварыў Тамаш.—Я мяркую, што калі на добры лад, то мы за чатыры гады і забудуемся, і фермы будзем мець, і асушым балота...

— Не веру я ў гэта, — прыкурваючы з газоўкі, сказаў Лукаш. — Сваімі сіламі, не выйдзе...

— Дык што-ж па-твойму, пайсці да капіталістаў, зняць шапку і прасіць долараў, — гарачыўся Тамаш. — Не ў нашай гэта натуры... Не прывыклі мы спіны гнуць... Зробленае ўласнымі сіламі, на свае сродкі, трывалейшае...

— Ты зноў з сваёй палітыкай...

— Калгас паставіць на ногі — вялікая палітыка, —

развражаў Тамаш. — І совецкія людзі дамогуцца свайго, неўзабаве нашы калгасы будуць мацнейшыя, чым да вайны...

Ударыў першы гром, маланка асвяціла зямлянку, пайшоў дождж. Праўленцы моўчкі сядзелі, кожны заняты сваімі думкамі. У зямлянку з дзвярэй прарвалася вада, яна залівала гліняную падлогу.

— Не, так жыць нельга, трэба нешта рабіць, — уголас падумаў Тамаш, шчыльней зачыняючы дзверы, адкуль цурчэла вада. — Не падабаецца мой пяцігадовы план, давайце свой...

— План добры, але нам не пад сілу, — глуха сказаў Лукаш, а потым паправіўся: — Як на мой розум, дык трэба перш самім займець кароў, а потым ужо і пра фермы думаць... Як не кажы, а свая кашуля бліжэй да цела...

— Так-бы даўно і сказаў, а то дурыць галаву — не пад сілу, — усміхнуўся Тамаш. — Прызнайся па праўдзе, Лукаш, што ў цябе загаварыў дух уласніка, тады ты напалову перастанеш ім быць...

— Ты калектывіст! — заплаваў Лукаш, ён ускочыў з месца і затрос кулакамі. — Скажы, што ты да мяне маеш? Чаго ты чэпішся?

— Будзеш адзін стаяць супроць усіх, то або сагнуць, ці зломяць, — наступаў Тамаш.—Старое дрэва з дуплом хоць і глыбока ў зямлю пусціла карэнні, але супроць буры цяжка яму выстаяць... А маладому падлеску хоцьбы што, яму ніякая непагода не страшна, ён цягнецца да сонца...

— Супроць цябе цяжка змагацца, на словах ты паб'еш, — горка прызнаўся Лукаш.

— А на кулаках, я з табой не бяруся, тут доказы ў цябе важкія, — ухмыльнуўся Тамаш.

— Хопіць, мужчыны, давайце лепей пагаворым пра што-небудзь другое, ну хоць-бы пра падпальшчыкаў вайны, — жадаючы перавесці размову, загаварыў Ігнат

Лучына. — Не верыце што ім удасца падмануць свае народы?.. Дык тады пра жыцейскія справы: неабходна табе, Тамаш, жаніцца... Няўжо ты так і застанешся жыць удаўцом?..

— За гэтым не будзе астаноўкі, абы людскую кабеціну знайсці,—адказаў Тамаш, а пасля зноў звярнуўся да свайго. — Дык што-ж, мяне на заўтра выклікаюць у Райвыканком адносна плана, выкладу я ім свае меркаванні, пагляджу, што яны скажуць...

— Нешта ты зачасціў у раён, — не ўнімаўся Ігнат.— Мусіць маеш там нейкую кабеціну на воку... А калі няма, дык хочаш я пасватаю...

— Падабаецца мне адна маладзіца і, здаецца, я ёй таксама, — адказаў Тамаш. — А што да сватання, то лепей я сам сабе выберу... Так яно лепей...

— Як-жа ты на Райвыканкоме будзеш дакладаць пра план без нашай згоды? — пытаўся Лукаш.—Я асабіста лічу, што з жывёлагадоўчай фермай трэба пачакаць... Усё адразу не ўхопіш... Дый у дрыгву лезці не варта, не адолеем яе цяпер...

— А я так і скажу, што гэта мае папярэднія накіды,— гаварыў Тамаш,—і што некаторыя пярэчаць...

— А навошта выносіць нашы спрэчкі кудысьці, — не згаджаўся Лукаш.

— Як гэта кудысьці, — запярэчыў Тамаш. — У раёне ёсць разумнейшыя за нашы галовы...

— Эт, не слухаеш мяне, дык і рабі як хочаш, — падняўся і пайшоў за дзверы Лукаш.

— Добрай ночы! — крыкнуў яму ўдагонку Тамаш. Неўзабаве і ўсе праўленцы разышліся.

* * *

Яшчэ досвіткам выехаў Тамаш у раён, Забалоцце, на паседжанне Райвыканкома, дзе ён, акрамя дакладу аб ходзе вясенняй сяўбы, яшчэ хацеў выкласці свой праект

пяцігадовага плана калгаса, дзе было прадугледжана і будаўніцтва, і асушка балота, і жывёлагадоўля.

Тамаш трушком ехаў на мышастым коніку, па выбоістай гразкай дарозе. Гаспадар любіў мышастага, хоць каняка і не меў выгляду, але быў шустры, яму не патрэбна была пуга. Мышасты пачынаў ураўвацца, ён набіраў хуткасць, яздок вымушаны быў стрымліваць гарачага каня, бо з каляін ляцелі ў твар пырскі.

Паднімалася сонца, срэбрам паблісквала раса. Веяў лёгкі ветрык, шалясцела на дрэвах кволае лісце. Абмытая вясеннімі дажджамі, зелянела рунь. З каржакаватай хвойкі, якая стаяла ў баку ад язджалай дарогі, запушчанай і гразкай, шуганулі птушкі, іх цені адбіліся ў лужыне, што засталася пасля дажджу.

Тамаш падкруціўшы абвіслыя русыя вусы, пагладзіўшы чыста паголены падбародак, задумаўся. Ад напружання пачырванеў твар. Ён успомніў жонку і двое дзяцей, якіх немцы спалілі ў хаце, калі даведаліся, што ён у партызанах. Заныла ў Тамаша сэрца, крыўдна стала за скалечанае жыццё. Прайшло больш за год як загінула сям'я, а Тамаш усё ніяк не мог забыцца, перад ім кожны дзень успльвалі мілыя вобразы жонкі і дзяцей. «Аднак-жа трэба неяк жыць, — падумаў сам сабе Тамаш. — Аднаму быць — не хапае сілы».

Мроіліся думкі ў Тамаша, адны знікалі, з'яўляліся другія. Тамаш стаў прадумваць сваю прамову. «Трэба пачынаць з будаўніцтва хат, — меркаваў ён, — але не ўпусціць жывёлагадоўлі, дый за асушку балота ўзяцца. Завесці-б кароў добрых, а лепш за ўсё для нашых умоў займець мясцовай пароды — чырвоных — яны не баяцца ні балота, ні лесу, і шмат малака даюць. Дагледзь нашу карову, яна лепей усялякай заграннічнай. Але дзе ты іх цяпер знойдзеш, немцы перавялі». На яго думку да канца пяцігодкі калгаса неабходна, каб у кожнай брыгадзе была ферма.

— І гэта будзе, я свайго дамагуся, — прагаварыў уголас Тамаш.

Нарэшце прыйшла ў галаву Тамаша думка, што трэба неяк упарадкаваць і асабістае жыццё, тады лепей пойдзе і грамадскае. Не векаваць-жа яму ўдаўцом, прыдзеш у зямлянку, няма з кім словам перакінуцца. Ён успомніў чорнабрывую маладзіцу, з якой пазнаёміўся ў местачковым калгасе «Зара комуны», калі абменьваў там на насенне бульбу. «І з твару прыгожая, і з стану нішто, а з разгавору — чараўніца, розумам не пакрыўджана кабета, — падумаў сам сабе Тамаш, а потым адмахнуўся. — Не пойдзе яна за мяне, усё разбурана, яна-ж не згодзіцца жыць у зямлянцы». І тут-жа, Тамаш, сам сябе злавіў, што калі-б ён ні быў у мястэчку, дык заўсёды шукаў выпадку, каб з ёю пабачыцца, дый яна, прыкмеціў ён, да яго стала прыглядацца. Вочы яе з суровых рабіліся ласкавымі, здаецца смяяліся, вабячы яго да сябе. Тамашу прыемна стала на душы.

Прызвычаены за вайну да дысцыпліны, — Тамаш перш быў у партызанах, а потым у войску, — ён папусціў лейцы мышастаму, каб у пару прыехаць у раён на паседжанне. Дый Тамашу хацелася пабачыцца з чорнабрывай маладзіцай, перакінуцца з ёю пару словамі. І на кірмашы трэба было пабыць, паглядзець, можа будзе каламазь, хамуты і збруя. Тарахцела брычка, паскрыпвалі колы, падкідала ў калдобінах, трэсла.

Неўзабаве Тамаш уз'ехаў на крывую вуліцу мястэчка Забалоцце, паволі ішоў мышасты, стрыгучы вушамі, пудзячыся кожнага шораху.

— Чаго цябе калоціць трасца, — нацягнуўшы лейцы, прагаварыў Тамаш. — Маладзенькі!.. Стрыгунок!..

Праязджаючы каля ўросшага ў зямлю, пахіленага дому, Тамаш убачыў, як там пяцёра дзяцей адно пад другім, гулялі ў котку з мышкай.

«Шчаслівыя бацькі, маючы такое багацце», — падумаў сам сабе Тамаш.

Задумаўшыся Тамаш і не заўважыў, як пад'ехаў да вядомага яму дома. З каліткі выскачыла чорнабрывая маладзіца, з вёдрамі па ваду. Мышасты ірвануў у бок. Тамаш зазлаваў і затузаў ляйчынамі, каняка падаўся назад.

— А каб цябе, каб цябе,—нацягнуў лейцы Тамаш, і мышасты спыніўся. — Жанчын баяцца...

— Праязджайце, дзядзька, — сказала ўсміхаючыся маладзіца. — Не хачу пераходзіць дарогі з парожнімі вёдрамі...

— Праходзь, цётка, калі такая порсткая, — ён убачыў тую самую маладзіцу, якая не выходзіла ў яго з галавы, і саскочыў з воза. — Выбачайце... Скажыце, ці можна будзе назад едучы да вас заглянуць... інтарэс у мяне ёсць...

— Які? — зацікавілася маладзіца.

— Пра бульбу пагаварыць, — збянтэжыўся Тамаш.

— А для гэтага ў нас ёсць старшыня, — насупілася маладзіца. Тамаш сустрэўся з яе чорнымі, быстрымі вачыма. Яна не вытрымала погляду Тамаша, увагнула галаву і хутка пайшла да калодзежа. Тамаш правёў яе вачыма. Ён пусціў лейцы і пайшоў поруч з возам.

Пад'ехаўшы да цвінтара, Тамаш прывязаў мышастага за шуло, адпусціў падсядзёлак і падкінуў сена. Мышасты ахвотна хрумстаў мурог. Тамаш акінуў вачыма драўляную царкаўку, пахіленыя крыжы, старыя ліпы, якія тужліва шумелі, — ад усяго гэтага веяла нейчым старым, дапатопным. Потым ён спыніў вочы на новай будыніне, раённым Доме соцкультуры, там таўпілася моладзь. Паглядзеўшы на сонца, яно яшчэ не высока было, Тамаш вырашыў прайсціся на кірмаш, бо па яго меркаваннях да паседжання Райвыканкома яшчэ заставалася больш за гадзіну.

Па вуліцы ў бок «Заготмяса» прагналі чараду кароў. Забегалі вочы ў Тамаша. ён наперарэз цераз пляц хутка пайшоў, каб паглядзець кароў. Зайшоўшы на двор «За-

готмяса», Тамаш зусім нечакана для сябе ўгледзеў мясцовай пароды — чырвоных — двух цялушак і бычка. Загарэліся вочы ў Тамаша, ён меркаваў як-бы іх адкупіць, або ў крайнім выпадку выменяць; якая ім розніца, абы вага мяса была. Ён тупаў каля цялят, разглядаў іх рогі, гладзіў, і на ўсё забыўся. Адна ў яго думка была: «Як-бы ўвабраць гэтых цялят у калгас».

— Што ты тут, чалавеча, выглядаеш? — спытаўся загадчык «Заготмяса» Чарняўскі, вышаўшы на двор. Ён быў без шапкі, на галаве, як страха, узвышаліся чорныя кудры. У яго аж сінелі пасля галення шчокі, бегалі невялічкія, як гузікі, вочкі. Ён быў апрануты ў поўвайсковую, колеру хакі, гімнасцёрку, падпяразаны афіцэрскім рамянём, у наглянцаваных да бляску ботах.

Тамаш акінуў з галавы да ног хлопца, які крыху накульгваў на левую нагу, а потым спытаўся:

— З кім-бы тут пагаварыць, каб абмяняць вось гэтых пару цялушак і бычка?

— Абмяняць?—здзівіўся Чарняўскі.—Хіба тут абменны пункт? Дый што ты, дзядзька, у іх знайшоў? Звычайныя цялушкі, мясцовай пароды, нічога ў іх асаблівага...

— Як-бы ўсё-ж мне пабачыць загадчыка? — настойваў Тамаш.

— Я загадчык,—паведаміў Чарняўскі.—А толькі з абменам нічога не выйдзе...

— Чаму? — спытаўся Тамаш.

— А як я ўсё гэта афармлю?—запярэчыў Чарняўскі.— Не, не! Навошта мне гэты клопат...

— Ты савецкі чалавек, ці чыноўнік? — загарачыўся Тамаш. — Хіба льга глуміць на мяса цялят чыстакроўнай пароды...

— От ты мяне не вучы, — ускіпеў Чарняўскі. — Чорт ведае што такое, дзе вартаўнік, чаго сюды пускаюць няма ведама каго...

Чорнабрывая маладзіца ішла на базар. Убачыўшы на дварэ «Заготмяса» брата, зайшла туды, і зноў спат-

кала таго чалавека, які ёй з першага знаёмства, калі абменьваў бульбу, спадабаўся. І з вёдрамі з хаты сёння яна выскачыла сумысля, каб хоць двума словамі перакінуцца з мілым сэрцу чалавекам.

— Як гэта няма ведама каго, я Шышка, старшыня калгаса «Наша жыццё»,—рашуча запярэчыў Тамаш.

— «Шышка» ты ў сябе ў калгасе, а не тут, — іранічна заўважыў Чарняўскі, у яго ад нездаволення раздзімаліся ноздры на войстрым носе.

— І там я Шышка, і тут Шышка, — гарачыўся Тамаш. — Кім чалавек народзіцца, тым і памрэ...

— Зачыні, чалавеча, з таго боку весніцы...

— Што-о? — зазлаваў Тамаш, збіраючыся ісці. — Добра, я знайду на цябе ўправу... пагаворым у Райвыканкоме...

Да Чарняўскага хутка падыйшла маладзіца і нешта яму сказала, Чарняўскі скрывіўся, але ўсё-ж спыніў Тамаша, і другім тонам загаварыў:

— Пачакай! Ты сапраўды старшыня калгаса «Наша жыццё», ці іх прадстаўнік...

— Вось мой дакумент, — паказаў паперку Тамаш.

— «Шышка Тамаш Рыгоравіч», — чытаў сам сабе Чарняўскі, ён памякчэўшы прагаварыў: — Як-жа гэта зрабіць?.. Ну і што ты знайшоў у гэтых цялятах?..

— Бачыў, — паказаў рукою Тамаш, — у цялушак белыя рогі — добрыя будуць да малака...

— Што з табою зробіш, з такім упартым, прыводзь заўтра замену...

— Я сёння цялят забяру...

— Як гэта? — паглядзеў на яго Чарняўскі, а потым перавёў погляд на сястру.

— А так, пячатка ў мяне з сабою, аформім, а то яшчэ збаёдаеце, — гаварыў Тамаш. — А заўтра прывяду табе карову, вага большая за гэтых трох цялят... Не карова, а бугай... У плуг да вала падпрагаем... Два гады перадойка...

— Правільна, не згаджайцеся, — загаварыла чарнявая маладзіца, звяртаючыся да Тамаша.

— Дзякую за добрае слова, — задаволена ўсміхнуўся Тамаш, паглядзеўшы на маладзіцу.

— Ад цябе, відаць, не адчэпішся — бяры, — згадзіўся Чарняўскі, ён паглядзеў у бок сястры і дадаў: — Адваката добрага займеў... Цераз яе вымяняў бульбу, цялят... Што-ж, зойдзем тады ў кантору...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Узрушаны Тамаш вёў па вуліцы цялушак і бычка, яны вырываліся, паразазалі яму рукі. Падганяла цялят Галіна, яна махала пустою карзінаю. На ганку Райвыканкома стаялі Рыбалка і Чарняўскі. Старшыня РВК Рыбалка, заўважыўшы Тамаша, усміхаючыся крыкнуў:

— Таварыш Шышка!

— Зараз іду, — сказаў Тамаш, і спытаўся: — Паседжанне яшчэ не пачалося?

— Якое там не пачалося, гадзіны дзве назад як скончылася, — паведаміў Рыбалка, выставіўшы рыжую бародку. — Табе за няяўку зроблена заўвага...

— От, чорт! — Тамаш пачухаў патыліцу, ён паглядзеў уверх і схапіўся за галаву, сонца ўжо садзілася за лес.

— Галка! — гукнуў Чарняўскі, ледзь стрымліваючы ўхмылку. — Сёння мы з таварышам Рыбалка ў нас абедаем.

— Ой, — ускрыкнула Галіна, паглядзеўшы на парожнюю карзіну. — Калі-ж я паспею згатаваць абед...

Рыбалка з Чарняўскім голасна зарагаталі.

— Таварыш Рыбалка! — гукнуў Тамаш. — А як-жа будзе з пяцігадовым планам калгаса?..

— Прыходзь, разгледзім на прэзідыуме...

— А інтарэс, мусіць, прыдзецца адкласці? — загадкава пытаўся ў Рыбалкі Тамаш.

— А навошта адкладваць: адклад не ідзе на лад,— адказаў Рыбалка.—Зойдзеш, абмяркуем...

— Добра, — узрадаваўся Тамаш, а потым, звяртаючыся да Галіны, загаварыў: — Інтарэс я да цябе, Галюся, маю вялікі... Хочам з Рыбалкам прыйсці ў сваты...

— Калі ласка, — адказала ўсміхнуўшыся Галіна.

Задаволены Тамаш падкруціў вусы і пайшоў да воза. А Галіна, не адчуваючы пад сабою ног, пасляшыла да хаты, трэба было падрыхтавацца спаткаць жаданых гасцей.

* * *

Позна ўвечары вярнуўся Тамаш дадому, натузаўшыся ў дарозе з цялятамі. Але раніцаю, як заўсёды, ён раней за ўсіх устаў, каб паглядзець, што за дзень без яго зроблена. Каля хлява сабраліся праўленцы, агледзеўшы, што за дабро прывёў старшыня, заспрачаліся.

— Зусім не пазнаю цябе, Тамаш, нібы хто падмяніў,— разважаў Лукаш, які ўвесь аброс нейкай каштанавага колеру густой барадою. — Некалі мы з табою былі серадняками, не вельмі пнуліся наперад, але і не адставалі...

— Так, Лукаш, мы з табою былі серадняками, але ў цябе заўсёды быў дух кулацкі, — запярэчыў Тамаш. — Памятаеш, як ты мне прапанаваў заарандаваць млын...

— І дарэмна ты не згадзіўся, добра-б зарабілі...

— А што да серадняка, — працягваў Тамаш, — дык калі ён угледзеў, што Савецкая ўлада трывалая, то ён рашуча павярнуў да яе...

— Ты маеш на ўвазе сябе, ці каго іншага?..

— Няўжо-ж цябе,—усміхнуўся ў вус Тамаш.—Людзі з кулацкім душком, яшчэ і цяпер хістаюцца... Яны хочуць жыць з працы рук другіх...

— Што ты вярзеш, кум, — Лукаш зусім не чакаў, што Тамаш так паверне справу, у яго ад злосці аж пабагравеў твар. — Ну хіба я не праўду на сходзе сказаў, што трэба раней дбаць, каб калгаснікі набылі кароў, дапамагчы ім у гэтым, а потым ужо і фермы заводзіць...

— Не праўду, куме, — прагаварыў Тамаш. — Калі

будзе ў агульным хляве поўна кароў, дык і ў калгаснікаў яны будуць...

— Камандаваць намі хочаш?..

— Не камандаваць, а кіраваць... паколькі вы мяне абралі за старшыню...

— Дык скінем з старшыні, — гарачыўся Лукаш, і звяртаючыся да праўленцаў, ахрыплым голасам сказаў:—Мужчыны, што-ж вы маўчыце?..

— Не ведаем, чаго ты гарланіш, — аказаўся Ігнат Лучына. — Тамаш дбае пра гаспадарку, а ты...

— Што я, кажы, — крычаў Лукаш. — Хіба я ліхадзей сабе...

— Вось у тым і справа, што сабе не ліхадзей, а другім...

— Калі выбралі мяне старшынёю, дык і слухайцеся, а не хочаце—скідайце, — гаварыў Тамаш. — А толькі я затычкай не буду...

— І скінем, — не ўнімаўся Лукаш. — Камандзёра нам не патрэбна... Лепей ужо чужога чалавека ўзяць за старшыню, усёроўна мы самі кіравацьмем... І без цябе не блага жылі...

— А трэба дамагчыся, каб яшчэ лепей жылося,—разважаў Тамаш. — У комуну мы павінны прыйсці не толькі ў дастатку, але і з чыстымі душамі... А паскрабі іншага мужыка, колькі на ім усялякай іржы... Трэба нам у саміх сябе вытравіць уласніцкі дух...

— Ой, кумок, зломіш ты сабе галаву. Распарадзіўся перамераць прысядзібныя ўчасткі: навошта ўсё гэта? Не давяраеш мне?

— Так. Трэба вярнуць незаконна захопленую зямлю калгасу. Не будзем-жа мы чакаць, каб нас зверху выпраўлялі, калі мы самі можам гэта зрабіць...

— Як хто, — гарачыўся Лукаш, — а я ў свой агарод нікога не пушчу... Гэта маё і нікому да гэтага няма ніякай справы... Як на добры лад, дык варта было-б яшчэ крыху прырэзаць зямлі... Пераабраць!..

— Аднак, здорава ён табе наступіў на твой уласніцкі мазоль, — усміхнуўшыся, паглядаючы на Лукаша, сказаў Ігнат, — калі так крычыш... І ёсць чаго, ты з сялібы і без калгаса можаш жыць...

— Добра, вось прыедзе Рыбалка, каб на месцы азнаёміцца з пяцігадовым планам калгаса, дык з ім аб усім і паталкуем...

— Рыбалка, — здзівіўся Лукаш. — А навошта выносіць смецце з хаты...

— Не толькі вынесем смецце з хаты, — гаварыў Тамаш, — але і хату падмяцем... каб не было бруду...

— Мужчыны, дык ён не на жарты за нас узяўся,—гаманіў Лукаш. — Хлеў заснаваў... Цялят прыгнаў... Зямлю абразае.

— І правільна робіць, — зазначыў Ігнат. — Люблю справядлівых людзей... Трэба ў цябе першага адабраць лішнюю зямлю на агародзе...

— От што я скажу, Лукаш, калі не хочаш ісці з людзьмі плячо ў плячо, — развважаў Тамаш, — дык не замінай...

— А куды-ж мне тады,—перабіў яго Лукаш.

— Куды хочаш,—сказаў Тамаш і, паглядзеўшы, дадаў:—От і Рыбалка прыехаў, збірайцеся на сход, там аб усім паталкуем... Падабаецца вам пяцігадовы план калгаса — прымайце, а не падабаецца... Там вырашым: быць калгасу «Наша жыццё» сапраўдным калгасам, ці не быць...

Паволі разыходзіліся мужчыны, кожны хацеў сам-на-сам пабыць, падумаць. Яны разумелі, калі прыехаў Рыбалка, дык спрэчкі зайшлі далёка, а таму кожны павінен быў вырашыць, як яму быць. У баку тут не застанешся, бо вырашаецца кроўная справа, па якім шляху павінен ісці калгас, якая яго будучыня.

Аж да самай раніцы цягнуўся сход, ён ускалыхнуў не толькі калгас «Наша жыццё», але і навакольныя калгасы. Лукаш так павярнуў справу, ён прапанаваў свой план—

перш адбудаваць хаты калгаснікам, дапамагчы ўсім пры-
дбаць кароў, а потым арганізаваць ферму, што план
Тамаша з трэскам праваліўся. Спатрэбілася Рыбалку
самому засесці за план, прыцягнуць да справы выпра-
цоўкі плана калгаса раённага агранома, актыў калгаса,
каб план абгрунтаваць, але думкі Тамаша аб арганіза-
цыі ў першую чаргу калгаснай фермы, калектыўная адбу-
дова хат, асушка балота, леглі ў аснову плана, — і толь-
кі на другі дзень сход прыняў план. У выніку Лукаш
быў «пабіты», ён застаўся ў меншасці, толькі два чала-
векі яго падтрымалі.

Чарняўскі, які не дачакаўся пакуль Тамаш прывядзе
карову ў абмен на цялят, сам прыехаў у калгас.

— Які-ж ты пасля гэтага гаспадар свайго слова, —
гаварыў нездаволена Чарняўскі, — што не выконваеш
умоўленасці...

— А тут адбылася такая завіруха, — апраўдваўся
Тамаш, — што не да гэтага было... хоць ты гані цялят
назад...

— То прывязвай карову да воза і я паехаў, — гаварыў
Чарняўскі. — У мяне там рэвізія ідзе...

— Я сам завяду, — вінавата апраўдваўся Тамаш. —
Мне там абавязкова трэба быць...

— Навошта табе лішні клопат блізкі свет плесціся
пешкі, — угаварваў Чарняўскі.

— І сапраўды, — пераглянуўшыся, падтрымаў яго
Рыбалка.

— У мяне там ёсць справа, — настойваў на сваім
Тамаш.

— Якая? — захоўваючы ўхмылку, пытаўся Рыбалка.

— Трэба купіць газы, дый соль вышла, і няма тыту-
ню, — хітрыў Тамаш.

— А я па дарозе заходзіў у сельсовецкую краму, дык
там усё гэта ёсць, — паведаміў Чарняўскі.

— Надоечы ў местачковага каваля я пакінуў сякеру
загартаваць і забыўся ўзяць, — успомніў Тамаш. — Без

яе мне, што без рук... Дый трэба набыць пілу, неабходна пачынаць будавацца...

— Ну, калі справа зайшла аб піле, тут нічога не скажаш, без яе не абыйдзешся, — усміхнуўся Рыбалка.

— Галка прыслала і пілу, і сякеру, — паведаміў Чарняўскі. — На цэлую гадзіну мяне з-за гэтага затрымала...

— Прыслала, — апусціў галаву Тамаш, ён выглядаў, як школьнік, які зрабіў віну, і раптам успомніў: — А пра склюд, пэўна, забылася...

— А гэтага я ўжо не ведаю...

— Ну што-ж, — прыйшоў на выручку Рыбалка. — Без склюда ў будаўніцтве не абыйдзешся... Тады едзем!..

— Едзем, — узрадваўся Тамаш. — Я толькі насыплю ў капшук мультану...

— Дык ты-ж казаў, што ў цябе няма тытуню, — усміхнуўся Рыбалка.

— А там каліва-другое знойдзецца...

Як сват я табе дарую гэтую паездку, а як старшыня РВК не, — весела гаварыў Рыбалка. — Цяпер столькі работы ў калгасе...

— Усё будзе зроблена ў час, — запэўніў Тамаш. — У нас залатыя людзі, з імі можна цуды тварыць...

Хутка Рыбалка, Чарняўскі і Тамаш рушылі ў дарогу.

* * *

Пасля таго, калі ў калгасе «Наша жыццё» адсеяліся, адразу пачалося будаўніцтва. Такой будоўлі яшчэ вёска ніколі не бачыла. Дзяржава дапамагла лесам, крэдытамі, аўтамашынамі. Прыйшлі на дапамогу людзі з суседніх вёсак, якія не былі пагарэльцамі. Калгаснікі «Нашага жыцця» адчулі клопаты аб чалавеку. Добра пастаўленая арганізацыя справы будаўніцтва адразу дала аб сабе знаць. Не прайшло і двух тыдняў, як то ў адным баку вёскі, то ў другім сталі ўзвышацца зрубы новых

дамоў. У першую чаргу будавалі хаты сем'ям воінаў, якія загінулі на франтах і ў партызанах.

На будаўніцтве хаты маці Героя Совецкага Саюза, сержанта Серады, працуе брыгада Ігната Ламакі. Завіхаецца Ігнат, аж звініць сякера. Бервяно за бервяном, смалістыя, кладуцца ў вянок зруба. Па пояс раздзеты, загарэлы, з моцна развітымі мускуламі, не разгінаючыся, працуе Ігнат. Цераз усю левую шчаку ў Ігната прайшоў шрам, які не загараў, — Ігнат быў паранены на Вісле, — іскрыліся шэрыя вочы, моцна былі сціснуты тонкія губы. Калі Ігнат рабіў, ён нікога не заўважаў, так аддаючыся справе. Брыгада Ігната па соцыялістычнаму спаборніцтву абавязалася першай здаць хату.

— Што я такога зрабіла, каб заслужыць такую ўвагу, хіба-ж у мяне адной загінуў сын,—несучы ў руках збанок, узрушаная, гаварыла Серадзіха. — Чым я аддзячу? Брыгадзір, можа вып'еш бярозавага соку? Хлопцы ўжо напіліся. Халодненькі!

— З прыемнасцю, — адказаў Ігнат, ён залпам выпіў сок. — А пра аддзяку, маці, не клапаціся, усім нам налічваюць працадні.

— Зусім не пазнаю людзей, — гаварыла Серадзіха, маленькая, худая, з маршчыністым тварам, невялікімі вачыма і спрацаванымі рукамі. — Што з імі сталася? Калі мы некалі будаваліся, дык нават браты мужа яму не дапамагалі, кожны жыў сваім жыццём. Гэта-ж я меркавала, што мне давядзецца векаваць у зямлянцы і раптам такая навіна. Я так рада! Каго-ж мне тады дзякаваць?

— Сталіна, — адказаў Ігнат. Яму мы абавязаны нашым жыццём.

— Сталіна я і кладучыся спаць і ўстаючы ўспамінаю, і кожны раз яму дзякую, — гаварыла ўсхвалёвана Серадзіха. — Няхай ён доўгія годы жыве, на шчасце і радасць людзям.

— Правільна, цётка Серадзіха,—падыйшоўшы са склюдам, сцвердзіў Тамаш. — Каб не Сталін, не бачыць·

бы нам больш свабоды... Капіталісты ўсіх краін рыхтавалі нам ланцугі... А толькі нічога ў іх не вышла... Сталін разгадаў іх планы... Сталін наперад глядзіць і далей за ўсіх бачыць...

— Проста не верыцца вачам, што гэта для мяне хата, — гаварыла Серадзіха.

— Яшчэ і цялушку, цётка Серадзіха, сёння на праўленні вырашылі табе даць, — паведаміў Тамаш. — Ты ў нас лепшая стаханаўка...

— Дзякую, дарагія мае! — у Серадзіхі ад радасці з'явіліся слёзы, і яна, набраўшы трэсак, хутка пайшла ў бок зямлянкі. У старой час-ад-часу ўздрыгвалі плечы. А Тамаш узяўся склюдаваць хату. Каля яго сабраліся цесляры, яны глядзелі, сцяна ў яго атрымоўвалася роўнай, гладкай, што другі і рубанкам такой не зробіць.

— Залатыя рукі ў цябе старшыня, — сказаў Ігнат.— Я табе зайздрошчу! Чалавек, які мае талент у руках, нідзе не прападзе.

Па дарозе, з рэвам, цяжка нагружаныя, ішлі грузавыя машыны, яны павярнулі ў бок калгаса «Наша жыццё». Тамаш спыніўся склюдаваць, ён ніяк не мог уцяміць, што за машыны маглі сюды прыйсці, якія пры ўездзе ў вёску спыніліся. Ён вышаў наперад, са склюдам у руках, не разумеючы, што здарылася. Да Тамаша хутка падыйшоў малады хлопец, у яго з-пад шапкі бачны быў чуб, ён спытаўся:

— Дзе мне тут пабачыць Тамаша Рыгоравіча Шышку?

— А што вам трэба? З дарогі збіліся?

— Я прадстаўнік калгаса «Зара комуны», — бойка гаварыў хлопец. — Праўленне нашага калгаса даручыла мне перавесці і паставіць пяцісценку нашай былой лепшай брыгадзіршы Галіне Міхайлаўне Чарняўскай. Прашу адвесці месца. Галіна Міхайлаўна просіць, каб паставіць дом вокнамі да рэчкі. Вось ад яе запіска... А гэта ад Рыбалкі...

— Нічога не разумею, — выпусціўшы склюд, беручы

дрыжачымі рукамі запіскі, прагаварыў Тамаш. — Што гэта, казка, ці сон...

— Наша совецкае жыццё, мудрэй любой казкі, — бойка гаварыў хлопец. — Галіна Міхайлаўна сваёю працаю заслужыла гэты дом... Яна ў нас і да вайны і цяпер была лепшым жывёлаводам... А яшчэ мы выклікаем вас на соцспаборніцтва па жывёлагадоўлі...

— Выклік на соцспаборніцтва прымаем, — сказаў Тамаш. — А дом...

— Прачытайце запіску старшыні РВК...

«Разглядай гэты дом як дапамогу аднаго калгаса другому, — чытаў Тамаш. — А можа ваш калгас калі-небудзь дапаможа ім...».

— Чаго там, разгружай, — загаманілі мужчыны.

І калгаснікі гуртам пайшлі, каб паказаць пляц, дзе ставіць прывезены дом.

* * *

Прайшло тры кіпучых гады. Ішоў тысяча дзевяцьсот сорак восьмы год. Шмат было ўжо загоена ран, усе калгаснікі «Нашага жыцця» да гэтага часу перайшлі з зямлянак у новыя дамы, але працы яшчэ засталося непачаты край.

Не раз было, калі Тамаш, прыйшоўшы стомлены ўвечар з работы, засынаў, што нельга было дабудзіцца вячэраць. Не так лёгка яму было ў людзей вытраўляць дапражыткі старога. Праўда, у яго рабоце шмат яму дапамагалі не толькі Рыбалка, але і Чарняўскі, які цяпер працаваў старшынёю сельсовета.

Па плану калгас «Наша жыццё» у гэтым годзе павінен быў адваяваць у балота першыя восемдзесят гектараў зямлі. Яшчэ з восені Тамаш рыхтаваўся да гэтай справы. А вясною, пасля таго як у асноўным была скон-

чана сяўба, аднойчы, у нядзелю, узяўшы сына на рукі, Тамаш рашыў наведаць дальнія палеткі і заадно прайсціся на балота, паглядзець, з чаго пачаць справу. З панядзелка Тамаш меркаваў прыступіць да асушкі, усім калгасам выйсці на гэтую работу.

Ідучы цераз сад, які зацвітаў, Тамаш любаваўся працай сваіх рук. Прыгожа было глядзець на ўбраныя ў белы цвет, з ружовымі адценнямі, маладыя яблыні. На душы ў Тамаша была вясна. Паглядзеўшы на сына, Тамаш прагаварыў:

— Усё гэта для вас робіцца, каб вы ў шчасці жылі...

Малы махаў ручкамі, цягнуўся, каб сарваць цвет, але бацька яго стрымліваў.

Узыйшоўшы на ўзгорак перад Тамашом, як на далоні, раскінуліся новыя будовы калгаса, відаць былі дамы калгаснікаў, якія выстраіліся стройнымі радамі. Тамаш падумаў: «Не дурны чалавек сказаў, што з гары лепш відаць». Не ўсе будовы былі прыведзены ў парадак, часамі тырчэлі непадраўняныя бярвенні вуглоў, што не лашчыла вока, каля некаторых хат не было агарожы, а гэта нагадвала прахадны двор, але ўжо можна было сказаць, што справа з будаўніцтвам скончана.

У лагчыне, сярод паплавоў, якія заселянелі, вілася поўнаводная балотная рэчка, потым ішла яна паміж дрыгвы. На даляглядзе — прасторы шырокай балотнай раўніны з хмызнякамі і пералескамі, з сінімі азёрамі, пакатымі ўзгоркамі, на якіх узвышаліся падлескі, а далей раслі дрымучыя лясы. Вось туды, на адваёву ў прыроды гэтых багаццяў і быў накіраваны розум людзей. А толькі аднаму чалавеку не пад сілу было падпарадка-

ваць, завалодаць прасторамі дрыгвы,—гэта мог зрабіць толькі калектыў, які кіравалі комуністы.

— Глядзі, сын, добра ўглядайся ў гэтую дрыгву, якая некалі душыла чалавека, — гаварыў Тамаш, — бо яе хутка не будзе... Глядзі і запамінай, каб, як падрасцеш, шанаваў зробленае людзьмі...

Тамаш нагнуўся, узяў у руку кавалачак зямлі, расціснуў у пальцах, яна рассыпалася, у бок аднесла лёгкі пыл. Тамаш падумаў: «Хоць для пасеваў блага, але для асушкі балота добра». Трэба неадкладна брацца за гэтую справу». Потым Тамаш перавёў погляд на выган, там Лукаш пасвіў кароў, якія разбрыліся па пашы.

Хлопчык, убачыўшы кароў, пацягнуўся ў той бок. Яго пухлыя ручкі нібы былі перавязаныя тонкай нітачкай, на іх відаць былі складкі. На ружовых шчочках хлопчыка акрэсліліся ямкі, забегалі вочкі.

— Му-у, — вымавіла дзіця.

Тамаш паціху пайшоў у той бок, ён па дарозе разглядаў палеткі, спыніўся каля пасеянай яравой пшаніцы, паглядзеў на ўсходы. На гасцінцы загула машына, Тамаш прыслухаўся, машына набліжалася. Яна павярнула ў калгас і спынілася каля Тамашовай хаты. Тамаш вагаўся, вярнуцца яму дадому, ці ісці сваёю дарогаю, ён баяўся, што забавіцца дома і папярэдне не агледзіць заўтрашнія работы. І ўсё-ж ён павярнуў назад і неўзабаве ўбачыў тры чалавечыя постаці, якія да яго ішлі. Адна, гэта была яго жонка, Галіна, у другім па паходцы Тамаш пазнаў Чарняўскага, які падцягваў нагу, а трэці быў Рыбалка, ён шырока крочыў, цвёрдаю і ўпэўненаю хадою. Узрадаваны Тамаш паспяшыў да іх на спатканне.

— І што ты сабе думаеш, — бубніла Галіна. — Не паспела я адвярнуцца, як ён за хлопца і ў поле... Усюды яго цягае... Дзіцяці трэба хутка спаць... Ідзі сынок да мяне...

— Мы да яго ў госці, а ён наўцёкі, — вітаючыся гаварыў Рыбалка, якога Тамаш лічыў сваім настаўнікам і

старэйшым сябрам. — І ў свята не можа пабыць у хаце... Трэба ўмець не толькі працаваць, але і адпачываць...

— Прызнацца па праўдзе, з вас бяру прыклад...

— Благога не трэба пераймаць...

Па ўсяму відаць было, што Рыбалка паважае Тамаша. Нават праязджаючы па другіх справах, Рыбалка ніколі не мінаў калгаса «Наша жыццё», часта раіўся з Тамашом па розных справах, але заўсёды трымаў сябе афіцыйна. А сёння вёў сябе зусім іначай, па-сяброўску, яму хацелася пахваліць Тамаша за гаспадарлівасць. Рыбалка паспеў ужо аб'ехаць палеткі калгаса «Наша жыццё», усюды быў узорны парадак. Да таго-ж калгас «Наша жыццё» ў спаборніцтве з калгасам «Зара камуны» даганяў па жывёлагадоўлі. І ўсё-ж Рыбалка стрымаў свае пачуцці, баючыся, каб Тамаш не заспакоіўся на дасягнутым.

— Дык што-ж, вернемся дадому, пасядзім крыху, а то нешта ў мяне ногі забалелі, — прапанаваў Тамаш.

— О, не-е, — запярэчыў Чарняўскі. — Мы прыехалі, каб паглядзець, адкуль лепей павесці наступленне на дрыгву...

— Добра, — хутка згадзіўся Тамаш, у яго заіскрыліся вочы, ён аж неяк павесялеў, не прападзе дарэмна дзень. — І я таксама хацеў туды прайсціся...

— То я пайшла дадому,—сказала Галіна.

— Ідзі, — адказаў Тамаш, і ён цмокнуў хлопчыкаву ручку. Маці ўзяла на рукі дзіця. Тамаш паглядзеў на сябе і ўсміхнуўся.—Ой, базэрнік, што ты бацьку зрабіў...

— Так табе і трэба, — засмяялася Галіна. — Хацеў сына... Гэта-ж, мусіць, ён ад радасці, што на поле ўзяў... — а потым дадала: — То вы не баўцеся!..

— Добра.

І яны разышліся.

— А чые гэта каровы? — ідучы, спытаўся Рыбалка.

— Нашы, — адказаў Тамаш.

— Пройдзем каля іх, паглядзім, якія яны пасля

зімы, — прапанаваў Чарняўскі. — А памятаеш, Тамаш Рыгоравіч, як ты ў мяне цялушак выменьваў?..

— Чаму-ж не, добра ў памяць урэзалася заўвага, — паглядаючы на Рыбалку, адказаў Тамаш. — А толькі нічога не скажаш, па заслугах.

І мужчыны голасна зарагаталі.

На выгане пасвіліся каровы, статак разбрыўся па пашы, здавалася ён вялікі, і такі на ферме ўжо было больш за сотню галоў. Вылучаліся каровы мясцовай пароды, цёмна-чырвоныя, падобныя да колеру спелай вішні, па ўсяму відаць, што за імі быў лепшы догляд, яны былі гладчэйшыя. У бугая гэтай-жа пароды была прывязана дошчачка, якая закрывала вочы. Пачуўшы людскую гамонку, бык стаў раўсці, ён высока падкідаў капытамі зямлю.

— Будзьце асцярожнымі, — папярэдзіў Тамаш. — Прывучылі бычка ў маленстве біцца, дык цяпер з ім няма ратунку... Прыдзецца, мусіць, у хляве трымаць забіяку, а то яшчэ скалечыць каго...

— Здароў, Лукаш! — падыйшоўшы, прывітаўся Рыбалка з пастухом. — Ну, як жывеш?

— Так сабе, — адказаў Лукаш.

— Чаму? — здзівіўся Рыбалка. — Крыўдзяць цябе?

— Яго пакрыўдзіш! — запярэчыў Тамаш. — Такі мужчына, у пастухі пайшоў, ніяк не мог яго адгаварыць, упёрся, як бык... А ўсё таму, каб не лезці з рыдлёўкаю ў дрыгву...

— Не веру я, што яе можна асушыць, — разважаў Лукаш, — зноў заплыве гразёю...

— А ты не верыў таксама ў пяцігодку калгаса, што за такі кароткі час можна будзе і адбудавацца, і завесці столькі кароў,—зазначыў Чарняўскі.—Праўду кажа Тамаш Рыгоравіч, што Лукаш ні ў што не верыць...

— А як ён, ці добра хоць пасе кароў?—спытаўся Рыбалка.

— Каб-жа добра, тады-б і гаворкі не было,—зазначыў Тамаш.

— І калі ты ўжо мяне пакінеш у супакоі?—звяртаючыся да Тамаша, спытаўся Лукаш. — Летась ты мне жыцця не даваў, што я не выпрацаваў нормы працадзён, а сёлета, — блага пасу быдла...

— А няўжо-ж добра,—зазначыў Тамаш.—Дый не твая гэта справа кароў пасвіць, калі ёсць за цябе слабейшыя людзі, якім сапраўды будзе цяжка на балоце, але яны ідуць... а ты ў кусты...

— Пры начальніках кажу, Тамаш, не крой мне сэрца,—зароў Лукаш.—Іначай я...

— А я пры людзях табе адказваю, Лукаш, што няма дурных на цябе працаваць,—сурова загаварыў Тамаш.—Хто не дбае пра калгас, той яму шкодзіць... Калгаснікі даўно парываліся цябе выключыць...

— Кумок...

— Нават не прасіся,—працягваў Тамаш.—Даю табе час да заўтра абдумаць... Разам з людзьмі пойдзеш, ці супроць іх...

— Ая-я-яй!—заенчыў Лукаш.—З маімі нагамі, лезці ў дрыгву...

— Чакаю заўтра на рабоце,—сказаў, як адрэзаў Тамаш, ён яшчэ ніколі так не размаўляў.—Абрыдала мне з табою валаводзіцца... А гавяду пагоніць пасвіць Канцавы Іван, куды яму з адной рукою ў дрыгву лезці, але і ён збіраецца ісці кусты цярабіць... Чалавек клапоціцца пра заўтрашняе... А з цябе ўжо нават дзеці смяюцца, яны іначай і не кажуць, як: «Лукаш, які ні ў што не верыць»...

— Дык што-ж, ты наважыў выкінуць мяне з калгаса?

— Так.

— Куды-ж мне дзецца?

— Куды хочаш: на ўсе чатыры бакі; свет вялікі. Ідзі пашукай лягчэйшага хлеба...

— Што ты са мною робіш... Дзеці малыя...

— Дзядзька Лукаш!—заспакойваў Чарняўскі.—Яшчэ ёсць час абдумаць... А можа сход не згодзіцца вас выключыць...

— Што-о?—запярэчыў Лукаш, і ён паказаў на Тамаша.—За ім людзі пойдуць у агонь і ваду... Калі ён сказаў, быць гэтаму... Пашкадуй!..

— Не,—цвёрда сказаў Тамаш.—Гультаям і абібокам няма месца ў калгасе...

І мужчыны, не развітаўшыся з Лукашом, пайшлі ў бок спрадвечнай дрыгвы, каб агледзець як да яе падступіцца.

— Мы ўнеслі некаторыя змены ў першапачатковы план: вось тут будзе пракладзены магістральны канал; мы адхіляемся ў бок метраў на дзвесці,—узбуджана размы адхіляемся ў бок метраў на дзвесці,—узбуджана разважаў Тамаш.—А астатняе застаецца як і было... Бачыце азярко, потым другое... Мы іх злучым... Калі ўдасца сёлета асушыць гэтую дзялянку, значыць можна будзе заверыць, што ў будучым годзе мы вырашым пытанне жывёлагадоўлі... Я мяркую на лета не толькі дагнаць калгас «Зара комуны»...

— Але і перагнаць,—усміхнуўся Рыбалка.—А толькі ці ўдасца...

— Падкапваюцца яны пад мяне,—сказаў Тамаш.

— А што?—запытаўся Рыбалка.

— Адзін іх хлопец да лепшай даяркі, Грыпіны, сватаецца,—адказаў Тамаш.

— То ты-ж да іх раней падкапаўся, — засмяяўся Рыбалка.—Што-ж, відаць, прыдзецца пяцісценку ставіць...

— Для Грыпіны мы не пашкадуем паставіць дом пад чарапічным дахам,—з гонарам сказаў Тамаш.—Няхай ведаюць нашых... Між іншым, гэта не мая прапанова, а людзей... Грыпіна ў спаборніцтве па жывёлагадоўлі падняла гонар нашага калгаса...

— Хвалю,—не ўтрымаўся Рыбалка.—У вас ёсць размах...

І яны спыніліся, моўчкі разглядаючы дрыгву, якая да сябе вабіла і палохала, тут быў непачаты край работы.

А ў Лукаша, які застаўся адзін, змагаліся два пачуцці: адно—скарыся непакорны, а другое—няўжо ты, Лукаш, схілішся перад моцным. Лукаш хлопнуў даўжэзнаю пугаю, нібы адганяючы ад сябе думкі, мяркуючы: «хоць дзень, але мой», і стаў выкіроўваць статак кароў у бок лесу, што вабіў сваім хараством, у якім можна хоць на час на ўсё забыцца.

* * *

На другі дзень раным-рана сабраліся калгаснікі «Нашага жыцця» каля праўлення на мітынг. Пасля кароткай гарачай прамовы Тамаша, які гаварыў аб неабходнасці павесці рашучае наступленне і адваяваць у прыроды дрыгву, зрабіць там шырокія калгасныя палеткі, людзі з песнямі рушылі ў паход. На ўскраіне вёскі іх дагнаў Лукаш, які задыхаўшыся бег з рыдлёўкаю ў руках, баючыся, каб не адстаць.

Праменні яркага вясенняга сонца лашчылі радасныя твары людзей, якія ў працы бачылі сваё шчасце і сваю будучыню. Яны ішлі зары насустрач.

*Жнівень, 1949 г.*
*Ліцвяны.*

## Чаму-ж мне не пець

Ужо каторы дзень было цёпла, зазелянела рунь, на паплавах адскочыла трава. Высока ў небе без стомы спяваў жаваранак. Ледзь ўлоўны арамат расцвіўшага саду перамешваўся з густым пахам, які ішоў з калгаснага хлява, дзверы ў якім былі насцеж паадчыняны. Сёння ў першы раз выпусцілі на пашу цялят, з якімі пасцяжка было саўладаць, і яны таўкліся ў садзе. Іх пасвілі дзеці, якіх тут набралася цьма-цьмушчая, што высыпалі з хат на сонца.

З новай хаты, якая стаіць паблізу саду, з кіем у руках, выйшла старэйшая цялятніца, Юстына Гарбун, яна ў апошні час занядужала. Ёй хацелася паглядзець на цялятак, якія толькі вучыліся скубсці траву.

— Бабка, Гарбуніха!—узрадаваліся дзеці, якім яна расказала не адну казку, былі і жартаўлівыя, і страшныя, пасля якіх дзеці баяліся разыходзіцца дадому.

Хутка разнеслася гэтая навіна. Дзеці акружылі Гарбуніху, яны з прагнасцю чакалі ад яе апавяданняў.

— Блага я адчуваю сябе, дзеткі, нешта ногі падкашваюцца, цягне да зямлі. Падбілася я ў доўгай дарозе.

— А вы прысядзьце і адпачніце.

— Добра,—згадзілася Юстына, майструючыся каля маладзенькай вішні.—А толькі сёння я раскажу пра сябе. Вы павінны ведаць, як жылі людзі даўней, тады вы будзеце шанаваць здабытую вашымі бацькамі свабоду.

— Раскажыце!—зашчабяталі на ўсе галасы дзеці.

— Нарадзілася я ў тым годзе, — пачала слабым голасам апавядаць Юстына,—калі цар Александр II, як гэта гаворыцца, вызваліў сялян. Першы раз падала я голас у сенакос, пад капою на лузе. Маці мая была родам з вёскі Караеды (так вёску назвалі таму, што ўвесну людзі елі кару), а бацька з вёскі Мохаеды (там елі мох). У маленстве лепшым для мяне ласункам быў лёк (гэта такая юшка ад селядцоў) з бульбай. У васемнаццаць год вышла я замуж за Міколу Гарбуна. От з тых пор, бязвыезна, так і жыву ў Кнігаўцы, цяпер калгасе «Маяк комунізма».

Мела я трох сыноў і сем дачок. Прызнацца па праўдзе—гаравала пакуль гадавала, а як падраслі, то крыху лепей стала.

У вайну з Вільгельмам II, узялі Саўку і Мікіту ў салдаты. Ну, а меншы Юрка ў рэволюцыю сам пайшоў у чырвонагвардзейцы.

У часе голаду ў 1919 годзе ўбіўся ў хату сыпняк. Пахавала дачок, дый Гарбуна старога. Ой, сколькі я выплакала тады, ажно слепнуць стала.

Затое-ж колькі радасці было, калі вярнуўся Саўка з вайны. А неўзабаве і Мікіта прыйшоў, што быў у матросах. Ды на табе, зноў немач, паны нахлынулі. От тут і рабі што хочаш! Хоць ты лажыся і памірай. Як чалавек угару, то чорт за нагу. Адным словам, як гэта гаворыцца: «не жыві як хочацца, а жыві як прыдзецца».

Мікіта мой на другі дзень знік, ну як скрозь зямлю праваліўся. Доўга не было дома. Пра яго бывала казалі: «як гол, так і войсцер». Потым з'явіўся накрыж абвешаны лентай з патронамі. Да яго сталі прыходзіць незнаёмыя мне людзі. Яны аб чымсьці падоўгу гаварылі.

Гэтыя людзі былі такія-ж простыя, як і мае сыны, Мікіта з Саўкам, і такія-ж добрыя.

Аднойчы, калі ўсе выйшлі з хаты, я сказала:

— Слухай, Мікіта! Баюся я за цябе. Мала што можа здарыцца. Не хачу я на старасці год ісці з торбамі па свеце.

Усміхнуўшыся, ён адказаў:

— Мама! Ад сумы і турмы не заракайся.

А потым дадаў:

— Ты баішся за нас? Так? Няма чаго. Калі з намі што здарыцца, у цябе будзе не адзін сын. У цябе будзе іх многа.

Заўважыўшы, што ў мяне навярнуліся слёзы, ён сказаў:

— Мама! Зразумей. Настаў такі момант, калі нельга заставацца ў баку. Ведаеш, чырвоныя ўжо блізка. Мы павінны ім дапамагчы.

Як не балела сэрца, але я ўзяла сябе ў рукі, прышлося згадзіцца, што трэба дапамога.

А ён гэтага толькі і чакаў. Не паспела я аглянуцца, як ён знік.

Позна ўвечары прыйшоў Саўка дадому. А ў хаце ні скарыначкі. Ставячы на стол бульбу, я спыталася:

— Як-жа будзе з хлебам?

Падумаўшы ён адказаў:

— Для таго, каб быць з хлебам, трэба мець зямлю. Зямлю-ж сам ніхто не аддасць, яе трэба ўзяць. Зямля павінна належаць тым, хто на ёй працуе.

А гэта зямля, дзеці, на якой мы цяпер сядзім, раней была памешчыцкай. Яе трэба было адваяваць. Нутром я і тады адчувала, што Мікіта праўду казаў, а толькі страх браў. Доўга ў той вечар мы гаварылі, аж пакуль не праспявалі другія пеўні. Мікіта расказаў мне, што ён у Піцеры бачыў Леніна і Сталіна, і што яны сказалі браць у памешчыкаў зямлю.

А па вёсках гойсалі белякі, польскія паны і іх найміты, гойсалі і ўдзень і ўночы, да ніткі абіраючы селяніна. А мужык ныў, стагнаў, енчыў, пакуль не разагнуўся. А як разагнуўся, то і пашло і пашло. Страшныя нашы людзі ў гневе.

Неяк цёмнай ноччу ўварваліся белякі ў нашу вёску. Тады-ж сярод другіх былі схоплены і Мікіта з Саўкам. Раніцою, на ўсходзе сонца, іх расстралялі. Не плакала я тады, не было слёз, толькі сэрца крывёю аблілося. У тойжа дзень на магіле я пасадзіла бярэзінку. Яна прынялася. А толькі, як ні рвецца бярэзінка ў вышыню, кволае вецвійка яе нізка гнецца да долу. Яна плаксухай стаіць над магілай.

Прыйшлі чырвоныя. Сустракалі з хлебам і соллю. Хадзілі на магілу расстраляных. Горача тады гаварыў камісар палка Сокалаў. Ён назваў мяне Юстынай Мартынаўнай. Упершыню тады адчула, што я чалавек.

Прыкандыбаў Юрка дадому. Гэта быў жывы нябожчык. На яго грудзях красаваўся ордэн «Чырвонага сцяга». А грудзі нылі, гэта-ж не жартачкі, адзінаццаць ран. Па вачах відаць было, што дрэнныя яго справы.

— Сынок!—кажу.—А што, каб фельчара паклікаць?

— Эт, дапаможа,—гаворыць,—як кашаль хваробе.

— Усё-ж!

— Так і быць, пакліч.

Прыйшоў фельчар, хоць які ён фельчар, на вайне быў санітарам і каля дактароў крыху абцёрся.

— На што скардзіцеся?—пытаецца.

— Нешта ў грудзях ные.

Паглядзеў, пастукаў, паслухаў, пакруціў галавою.

— Нічога няма. На вайне ў нас такіх хворых рыцынай лячылі.

— Ці не застаўся толькі асколак?—пытаўся Юрка.

— Ніякага асколка няма.

— А пухліна?

— Пухліна разыйдзецца.

— Усё-ж, каб паглядзець.

— Здаровы!..

І так, як гэта гаворыцца, з чым прыйшоў, з тым і пайшоў. Толькі дарэмна страціла дзялянку сала.

Не паспела я правесці фельчара за калітку, як мой Юрка прымайстраваўся каля люстэрка з брытвай у руках. Разрэзаўшы сабе грудзі, ён дастаў адтуль асколак. Як гэта кажуць: «стаў лекарам па-няволі». Рана хутка загаілася. Пабег мой Юрка падскакваючы.

От з таго часу неяк і мы акрыялі. Далі зямельку, лесу на хату. Але ўсё нешта не клеілася. Не хапала чагосьці. Чалавек шукаў лепшага.

Прыйшоў 1930 год. Пачалі арганізоўвацца калгасы. Не адну ночку сядзелі напралёт. Былі прылівы і адлівы. То разам усёй вёскай запішуцца ў калгас, то разам выпішуцца. І каб не было ні першага, ні апошняга. Доўга валтузіліся. Нарэшце мой Юрка адважыўся.

— Я першым падаю заяву і назад больш яе не вазьму.

Ну, а я, што грэх таіць, доўга хісталася, як яно там будзе. І так арганізаваўся ў нас калгас, і назвалі мы яго «Маяк комунізма», і мой Юрка быў у ім першым старшынёю. А я стала цялятніцай.

— А за што вам далі ордэн Леніна?—пыталіся дзеці.

— За цялят, шмат я іх выгадавала. Спорна ў нас ішла праца. Цяляткі мае заўсёды былі ў доглядзе. Ды што казаць. Са мной таварыш Сталін, калі я ездзіла ў Маскву на з'езд калгаснікаў, за руку вітаўся. Ён называў мяне Юстынай Мартынаўнай. Распытваў пра наш калгас, пра нашых людзей, пра тое, як я гадую цялятак. Потым ён параіў расказаць з'езду пра мой вопыт. Праўду сказаць, я крыху мулялася, як гэта выдаць сакрэт, а потым самой сорамна стала. І я расказала.

Ой, як добра мы ўжо сталі жыць. Ды раптам Гітлер пайшоў вайною, пракляты фюрэр нарабіў бяды, наш калгас дашчэнту спляжыў, толькі коміны тырчэлі. Не

вытрымаў мой Юрка, пайшоў у партызаны, і ўсе ў нас пайшлі, каб ратаваць свабоду-матухну.

— І мой тата быў у партызанах! І мой! І мой!—ажывіліся дзеці.

І Юрка Гарбун быў за камандзіра,—прадаўжала Юстына.—Далёка ішла слава партызан. Але адзін неасцярожны крок і сам камандзір трапіў у кіпцюры звяроў. Яго доўга дапытвалі, а толькі ён не сказаў ні слова пра сваіх арлоў, як ён іх зваў. Тады немцы яго павесілі.

Пагаравала я, паплакала, як і кожная маці, якая страціць сваё дзіця, а потым адзела торбы і пайшла па свеце. Не падумайце толькі, што пайшла жабраваць, пайшла сеяць помсту. Я стала сувязнай атрада, якім Юрка камандаваў. Траціць мне не было чаго, а магла дапамагчы вярнуць свабоду. Я трымала сувязь з патрэбнымі атраду людзьмі, разносіла лістоўкі.

А калі прагналі немца, мае сыны, іх цяпер у мяне многа, мне першай пабудавалі хату.

Яе невялічкія вочкі нечакана заміргалі. Абвёўшы вачыма дзяцей, Юстына Мартынаўна, з усёй шчырасцю сказала:

— Я так рада, што перажыла навалу і дажыла да сённешняга дня.

Па яе маршчыністаму твару пацяклі слёзы.

— Бабка! Ад радасці не плачуць!

— Ад радасці і плачуць, унучак, і скачуць. Ад радасці пяюць.

Засароміўшыся, узяўшы рог белае хусткі, яна выцерла слёзы.

— Я рада, што жыву на свеце. Хочацца доўга жыць. Хочацца спяваць. Чаму-ж мне не пець?..

Юстына Мартынаўна заспявала:

Чаму-ж мне не пець,
Чаму-ж не гудзець,
Калі ў маёй хатачцы
Парадак ідзець?..

— Раскажыце нам, бабуля, яшчэ што-небудзь,—прасілі дзеці.

— Не магу больш, нешта ў мяне сэрца моцна стала біцца. Стамілася я...

Яна абаперлася на кій і хацела ўстаць, у яе пацямнела ў вачах, закружылася галава. Старая-б упала, каб яе не падтрымалі дзеці. Страсянулася маладая вішня, пасыпаліся белыя пялёсткі яе першага цвету.

— А дзе-ж цыляткі? Я хачу на іх паглядзець...

Дзеці кінуліся, каб завярнуць цылят. І Юстына Мартынаўна пайшла ў той бок.

Ужо добра прыгрэла сонца. Усё неба было блакітным, на ім не было ні адной хмаркі. Нястомна шчабяталі: і жаваранак, і дзеці; яны славілі жыццё.

*Жнівень, 1948 г.*
*Ліцвяны.*

## Сляпы музыка

— За маю памяць, унучак, тут садзілі гэтыя бярэзіны, — апавядаў Тарас, згорбіўшыся, ідучы па бальшаку, са скрыпкай пад пахаю і торбамі за плячыма. — Колькі войн прайшло, а дрэвы ўсё стаяць. Яны, пэўна, цяпер зялёныя?

— Ага, — сказаў Сымонка, ведучы дзеда за руку. — А куды мы ідзем?

— У Заходнюю, — адказаў Тарас. — Паднімаць людзей на змаганне. Пяройдзем Коласава, — там некалькі год таму назад праходзіла граніца з палякамі, — потым будуць Стоўбцы. Некалі, яшчэ твайго бацькі не было на свеце, дык мы ездзілі ў Стоўбцы на кірмаш, — а потым ужо нас туды не пускалі, прайшла мяжа. Нам, унучак, толькі пераправіцца цераз Нёман, і мы выратаваны. Там ніхто нас не ведае і ніякі прусак нам не страшны.

Па знаёмай дарозе няўпэўненаю хадою сунуліся Тарас з Сымонкам да Нёмана, каб пачуць, што робіцца на свеце. З даўных часоў на пераправе, каля парома, можна было сустрэць здалёку чалавека, даведацца, пачым на кірмашы коні, колькі каштуе газа і соль. Да долу гнуліся спелыя жыты, шапацелі, пераліваліся на

сонцы шырокімі хвалямі. Але Тарас назаўсёды пазбаўлен быў магчымасці любавацца гэтым хараством, толькі добры і да гэтага Тарасаў слых яшчэ больш абвастрыўся і ўлаўліваў самыя найтанчэйшыя гукі. Высока, неяк штучна, падняўшы галаву, крочыў Тарас. Белая доўгая зрэбная кашуля вісела на ім, як на калу. Туга падпяразаны саматканым поясам, Тарас здаваўся худым і вялізным.

— Давай збочым, унучак, нямецкія самалёты ляцяць, — устрывожыўся раптам Тарас.

— Што ты, дзеду, нідзе іх не відаць.

— А ты добра прыгледзься.

— І праўда ляцяць, а колькі-ж іх! Мне, дзедка, страшна.

Яны сыйшлі ў бок і сталі пад купчастаю бярэзінай, каб схавацца ад напасці. Цяжка нагружаныя бомбамі, парывіста гудучы, самалёты праплылі над іх галовамі на ўсход, несучы на сваіх крыллях людзям смерць. Тарас з Сымонкам перачакалі навалу і моўчкі, кожны заняты сваімі думкамі, падаліся на захад.

Некалі Тарас быў майстрам на ўсе рукі. Бывала, ён што ні возьме, тое і зробіць. Работа ў яго руках кіпела. Шмат ён пабудаваў хат за сваё жыццё. Не налюбуешся яго «вуглом». А калі кадушку змайструе, хоць на выстаўку пасылай.

Яшчэ ў маладосці Тарас зрабіў сабе скрыпку. У вольныя часіны ён, бывала, іграў на скрыпцы для сваіх дзяцей. А іх у яго была цэлая чарада. Чатырнаццаць нарадзіла яму жонка: восем хлопчыкаў і шэсць дзяўчатак; дзевяцера з іх выгадаваліся. Дзеці Тараса былі дагледжаны, абмыты, абшыты і раслі, як на дражджах, і кожнае знаходзіла спосаб жыцця, мела свой кірунак. Былі ў сям'і Тараса і дактары, і настаўнікі, і інжынеры, і афіцэры.

Цэлы пераварот адбыўся ў жыцці Тараса, калі пачалася вайна з немцамі. Яны з старой засталіся адны,

усе сыны былі ў войску, а дочкі параскіданы па свету. Плакала скрыпка ў руках Тараса, галасіла, крычала, надрывалася. Старой часта здавалася, што Тарас іграе пра лёс такіх-жа самых людзей, як і яна, што ён перадае іх пачуцці і паказвае іх жыццё. Часам яна злавалася на Тараса, што ён не дае ёй спакойна ўправіцца каля печы. Бо калі ён пачынаў іграць, асабліва ў святочныя дні, тады ў хаце не зачыняліся дзверы, — яна загаворыцца з кім, а аладка падгарыць.

У 1943 годзе немцы чорнай хмарай навалiліся на вёску Астравок, у якой жыў Тарас. Вёска стаяла пры лесе і часта ўначы наведвалася партызанамі. А ў хаце Тараса заўсёды спыняўся камандзір партызанскага атрада, ён любіў пагаварыць з старым, заглянуць у заўтра, паслухаць музыку, пачуць песню. Немцы доўга мучылі Тараса, дапытваючыся пра партызан, выкалолі яму перш адно вока, а потым другое, але ён маўчаў — не сказаў ні слова, дзе стаяць партызаны. Тады нейкая рыжая бестыя нечым так паласанула Тараса, што ён і асунуўся, страціў прытомнасць. Пад вечар усю вёску Астравок і амаль усіх астраўчан спалілі. Толькі на другі дзень апамятаўся Тарас.

— Дзе я?—запытаўся Тарас.

— У садзе, — адказаў яму Сымонка, які, скурчыўшыся, ляжаў каля дзеда, трымаючы нейкім цудам выратаваную скрыпку.

— Што цяпер, дзень ці ноч?

— Дзень.

— А чаму я... Дзе-ж бабка... маці... сястрычка?..

— Згарэлі...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Сымонка ўжо не мог плакаць, а толькі ўсхліпваў.

— Не трэба так убівацца, унучак, от неяк-жа будзем жыць. Наша вёска стаіць на скрыжаванні дарог і шмат чаго бачыла. Але нікому не ўдалося і ніколі не ўдасца

ў нашых людзей душу вырваць. Шмат хадзіла па нашых дарогах чужаніцаў, але назад мала хто з іх вяртаўся. Перажывем і гэту навалу. Немцы таго не ведаюць, што лягчэй мне ў магілу пайсці, чым пазбавіцца роднага кутка. А як мая скрыпка, мусіць, і яна...

— Я яе выхапіў, калі хата ўжо была ў агні. Немцы па мне страляць, а я ў жыта.

— Падай мне, унучак, скрыпку, — Тарас правёў дрыжачаю рукою па скрыпцы і крыху супакоіўся. — Уцалела... Добра. Яна яшчэ паслужыць нам службу. А ты што еў?

— Еў, дзядуля. Даставаў зерня з каласоў, смачнае, паспрабуй...

Праз некалькі дзён немцы блакіравалі ўвесь раён. У мяшку апынулася ўся брыгада Дуброўскага. На партызан былі пушчаны дзесяткі танкаў, самаходныя гарматы, самалёты. Немцы прыціснулі партызан да балота і ўзялі агонь на поўнае іх знішчэнне. У лесе было шмат жанчын і дзяцей, якія паўцякалі з вёсак пад ахову партызан. Трагічны быў іх лёс. Як толькі дзе пачуецца дзіцячы плач, немцы па тым месцы адкрывалі ўзмоцнены агонь.

На астраўку быў размешчаны штаб Дуброўскага. Сціскаемыя з усіх бакоў партызаны, а таксама мірныя людзі згрупаваліся навокал свайго камандзіра, чакаючы ратунку. Немцы ўжо білі з усіх гармат па невялічкаму кавалачку зямлі.

— Што-ж я вам магу сказаць?—задумёна пачаў гаварыць Дуброўскі, яшчэ малады чалавек, гадоў пад трыццаць, не больш. Ён сядзеў на пні, потны, без шапкі. Шэрыя вочы глыбока запалі і ад недасыпання пачырванелі. — Выйсця нам ніякага няма. Застаецца памерці, як салдатам. А толькі трэба зрабіць так, каб наша смерць як мага больш каштавала немцам. Будзем прабівацца. Хто выжыве, дык няхай раскажа людзям, што мы біліся да апошняга патрона, а пасля пайшлі ў рукапашную.

Будзем трымацца ўсходней... — І ён паказаў рукою, куды трэба ісці.

У гэты час блізка разарваўся снарад і асколкам забіла камандзіра. Усе кінуліся ўрассыпную. Пабег і Сымонка, цягнучы за руку Тараса. Каля балотца зноў сабраліся людзі. Ужо чутна была чужая гамонка. Людзі кінуліся ў розныя бакі. Тарас з Сымонкам зашыліся пад нейкі корч.

Калі блакіроўка скончылася, Тарас з Сымонкам прайшлі ўвесь раён і нідзе не спаткалі ні адной жывой душы. Усюды руіны і папялішчы. Пустыня. Яны некаторы час блукалі па суседніх вёсках, а цяпер падаліся ў заходнюю частку Беларусі.

Тарас, ідучы па гасцінцу, спатыкнуўся і да крыві збіў на назе палец, стаў кульгаць, але не спыніўся, а яшчэ прыбавіў кроку. Яго нядаўняе мінулае прымушала хутчэй выбірацца з пекла, у якім ён апынуўся. Да таго-ж, Тарас адчуў свежы подых рэчкі і пачуў людскую гаворку з пераправы.

— Ты адкуль, чалавеча, і куды ідзеш? — запытаўся ў Тараса падводчык, які з канём чакаў парома, бо мост праз Нёман быў узарваны і вісеў над вадою.

— З-пад Гродні, — хітра адказаў Тарас.

— Кім будзеш?

— Яго вялікасць, селянін. А самі хто?

— Я ў цябе пытаю. Чаго тут апынуўся?

— Вайна закінула. Шукаю добрага сэрца, каб да радзімы дабрацца. Дашчэнту ў дарозе падбіўся.

— Не з-пад Гродні ты, хоць і гаворыш па-тутэйшаму. Не люблю, калі людзі няпраўду кажуць. Але калі з добрай душою, то садзіся на воз, падвязу. А там і заначаваць у мяне можаш. Прысмакаў не будзе, а кавалка хлеба для добрага чалавека не пашкадую.

— Дзякую, — сказаў Тарас і палез з Сымонкам на воз, падумаўшы: «Нешта ты мякка сцелеш»...

— Ты што, з маленства са скрыпкі жывеш? — запытаўся падводчык.

— Як вам сказаць?.. Каб так, дык не зусім. Але-ж і наверадзіў я, унучак, ногі.

— Ты, мусіць, мяне баішся?

— Не тое, каб сказаў баюся, але... на свеце ідзе такая калатня, што часам свой свайго не пазнае.

— Ты богам пакрыўджаны, ці людзьмі?—настойліва дапытваўся падводчык.

— Злыя людзі мяне пакаралі, — сказаў цяжка Тарас. — Я не жыў-бы, але дзіця... у хлопца наперадзе жыццё...

— Украў што? — выпаліў падводчык.

Тарас скрывіўся і адмоўна паківаў галавою, нічога не сказаўшы, а толькі сам сабе падумаў: «Злодзей заўсёды выдасць сябе».

— Давай! — крыкнуў магутным голасам паромшчык. — Чаго рот разявіў? Варона ўляціць!

— Но-о, — піскнуў тоненька спадарожнік Тараса. Голас гэтага чалавека не адпавядаў яго грузнай постаці. Ён махнуў пугаю, і падвода цяжка кранулася з месца, заскрыпелі колы. — Варушыся, каб цябе ваўкі!

Яны ўз'ехалі на паром. Падводчык моўчкі засунуў у воз руку, дастаў адтуль паўлітра і даў паромшчыку. Той моўчкі абвёў з галавы да ног падводчыка.

— А закусваць чым, языком? — загаварыў паромшчык. У яго інтанацыі адчувалася насмешка над падводчыкам. — Няўжо ўсё сала ў Мінску прадаў?

— Ая-я-яй, колькі таго сала, а ўжо і за рэчкаю чутно,—залемантаваў тоненькім галаском падводчык і зноў палез у воз. — На-а, а толькі абы ціха было. Не столькі таго сала, як звону. І ўсё зайздросць! Пакуль заробіш якую капейку, дык усе вантробы вытрасе... Але да гэтага нікому ніякай справы...

Цяпер толькі Тарас здагадаўся, што яго спадарожнік гандлюе салам. Паром адчаліў. Сымонка залюбаваўся

прыгаствам срабрыстага Нёману. Наляцелі хвалі на паром, абмылі каню капыты. Буланы спудзіўся і, захропшы, ірвануў калёсы так, што Тарас ледзь не скуліўся з воза. Сальнік спрытна ўхапіў каня за вуздэчку, сціснуў храпу і падаў назад.

— Стаяць, воўчае мяса! — на высокай ноце крыкнуў сальнік і заперхаўся. — Чаго цябе калоціць трасца!

— То што чутно на свеце?—лагодна пытаўся паромшчык.—Як там у Мінску?

— Мінск у руінах, — з выглядам знаўца адказаў сальнік. — І не скора ён, мусіць, паднімецца. Ушчэнт спляжылі. Ведама, такая сілішча! Супраць яе цяжка выстаяць. А тут як? Ціха на дарогах? Ва ўсходняй неспакойна. І чаго людзям трэба?

— Якое там ціха, але каб вельмі, дык не.

Гаворка паміж імі яўна не клеілася і яны неўзабаве змоўклі, не было пра што весці гутарку. Паром падыходзіў да берага.

— А цябе, хлопча, я недзе бачыў, — прамовіў нарэшце сальнік. — І скажы ты, як змяніўся, калі пасталеў? Ну, так, свержанскі дзяцюк да нас на вечарынку прыходзіў. А казалі, што ты ў гэтыя самыя... падаўся. Мне і тады не верылася, каб такое гаспадарлівае дзіця пайшло ў лес. А можа... а-а-а... ведаю... паромшчык для прыліку...

— Калі ведаеш, то і маўчы, — адрэзаў паромшчык. У яго густым прыгожым барытоне адчувалася папярэджанне і суровая пагроза. — А што, па-твойму, партызаны не людзі? Гэта ты на іх так клеплеш, што яны ў цябе ўзялі падсвінка? Але-ж людзі жыццё аддаюць, а ты нажываешся. Чуеш ты? Ці я сцяне кажу? Дык глядзі-ж, калі дзе хоць слова скажаш, дык не будзе табе месца пад сонцам.

— Маўчу, маўчу, — заенчыў сальнік пісклівым галаском і паказаў на жабракоў. — Хіба толькі яны?..

— Яны-ы? — многазначна перапытаў паромшчык. — Хіба ты не бачыш, як у старога спрацаваны рукі? А што стала з дзіцем? Жоўтае, як воск. Не з дабра людзі торбы адзелі. Пакорміш іх: дасі хлеба, сала; а вы, людзі добрыя, калі вам цяжка будзе, звернецеся да паромшчыка. Не буду я, то будзе другі. У бядзе чалавека не кінем. Гэта наша зямля і мы тут гаспадары.

Паром прычаліў. Затарахцеў воз. Сымонка з вялікай цікавасцю і пашанай глядзеў на паромшчыка. Калі воз уз'ехаў на гару, сальнік павярнуўся, зняў шапку і некалькі разоў пакланіўся паромшчыку.

Яны паволі праязджалі каля крыжа, на якім было распяцце з падвязанымі пад ім фартушкамі. Адсюль разыходзіліся дарогі ў чатырох напрамках. Сальнік пяцярнёю перахрысціўся на крыж і стаў закурваць. Конь сам узяў управа, уніз па цячэнню Нёмана. Сальнік адвярнуўся ад ветру, прыкурыў, дагнаў воз, яшчэ трохі прайшоў поруч, кракнуў, падскочыў і лоўка сеў у драбіны. Галава ў сальніка была круглай, як качан капусты, налітыя чырванню шчокі, пляскаты нос, абвіслыя рыжыя вусы, тоўстыя мясістыя губы і маленькія мышыныя вочкі. На твары і ілбе выступіў пот. Ён сцебануў пугаю каня, буланы рвануў і трушком пабег па прасёлкавай дарозе, паднімаючы пыл, які адносіла ў бок. Праязджаючы цераз лес, сальнік увесь час напалохана аглядаўся, ён уздрыгваў нават ад узлёту птушкі. Неўзабаве яны апынуліся каля невялікай рэчкі, што ўпадала ў Нёман і за якою стаяла вёска Лысая Гара, хат на пяцьдзесят, калі не болей. Сальнік, не даязджаючы да маста, звярнуў буланага ўбок, каб крыху папасвіць каня, дый самому падсілкавацца. Ён распрог каняку і пусціў яго на пашу.

— Можа будзеце есці?—аказаўся нарэшце сальнік, які пасля размовы з паромшчыкам прамаўчаў усю дарогу. Яму, відаць, ужо не патрэбны былі гэтыя людзі, бо ён пераехаў лес у якім мог спаткаць незнаёмых, ён ха-

цеў цяпер пазбавіцца ад сваіх спадарожнікаў, а таму і спыніўся на папаску.

— Ды яно не шкодзіла-б,—сказаў Тарас.—Хлопчык мой зусім змізарнеў, гаруе дзіця, а праз каго?..

Сальніка чужое гора не кранала. Ён думаў пра свой жывот. Дастаўшы торбу, ён адрэзаў Тарасу і Сымонку па лусце хлеба, пасыпаў соллю і даў, а сам пацягнуў добра з бутэлькі і стаў аплятаць сала з хлебам. Ён еў сала на поўную губу, а хлеб кусаў толькі для прыліку. У Сымонкі пацяклі слюнкі, калі ён угледзеў, як сальнік увіхаўся каля торбы.

— І скажы ты, як людзі псуюцца вайною,—загаварыў тоненькім галаском сальнік, завязваючы торбу.—Гэта-ж я ведаў бацьку гэтага хлапца, што на пароме трэцца, такі быў ціхі і паслухмяны, памяркоўны чалавек, ніколі, бывала, не выпрацца наперад, а сын—лайдак, у гэтыя... падаўся. Скруціць ён сабе галаву!

Тарас ужо раскусіў свайго спадарожніка, але не хацеў з ім спрачацца, а таму нічога і не гаварыў яму наўпоперак. Старому хацелася як мага далей ад'ехацца ад свайго раёна, на яго думку ў гэтым ратунак дзіцяці, дый ён павінен жыць, каб помсціць. А таму стары гадзіў сальніку, як благой скуле. Тарас верыў, што немцаў хутка турнуць, аж пыл закруціцца, ён не раз пра гэта гаварыў і ў гэтым быў глыбока пераконаны. Толькі, каб выжыць і дачакацца таго часу, калі немцы без аглядкі пабягуць назад.

— То што ты маўчыш, як вады ў рот набраў?—незадаволена запытаўся сальнік.—Можа-б хоць сыграў? Пагляджу, ці варта цябе везці на сваім возе?!

— Магу,—ажывіўся Тарас. У яго ўжо стала спакайней на душы і яму самому хацелася зайграць.

Сляпы музыка асцярожна дастаў з чахла сваю скрыпку, пакратаў струны пальцамі, правёў некалькі разоў смыкам па каніфолі, прымайстраваўся на купіче і зайграў. Гэта была музыка яго самога, яна была ад

сэрца, у яе ён уклаў столькі самабытнасці, што яна гучэла, як вялікае нацыянальнае тварэнне. Тут самародкавы талент мастака заблішчэў усімі фарбамі.

Перш музыка іграў і сам усміхаўся. Спакойна цякло жыццё. Іграў пастушок на берасцянай трубе. Адчувалася раніца ў калгасе, пераклікаліся пеўні паміж сабою, чуцен быў скрып калодзежа. Недзе заліваўся салавей. Траплялі матывы знаёмых песень, спевы дзяўчат і касцоў. Раптам усё гэта абарвалася. Уварваўся нейкі цягучы аднастайны матыў чужое музыкі. Перадавалася трывога, пракідаўся плач, галашэнне і крыкі. Трывога нарастала. Лязгала жалеза, ламала, крышыла. Усё гэта выконвалася з такой сілай, што страшна было слухаць.

Сымонка, які з замілаваннем слухаў пачатак музыкі, раптам напалохана, вялізнымі вачыма паглядзеў на дзеда. Перад ім паўстаў малюнак перажытага, крыкі і стогны людзей, якія паміралі ў страшэнных пакутах. Ён успомніў, як на яго вачах абвуглілася маці, згарэла сястрычка. Яны ўвесь час стаялі ў яго перад вачыма.

Высыпалі людзі з вёскі. Спыняліся спадарожнікі. Яны ціханька садзіліся каля прыдарожнай канавы і слухалі. Каля сляпога музыкі сабраўся цэлы натоўп, тут былі і старыя і малыя, кожны з іх па-свойму ўспрыймаў музыку, і ўсе яны з прагнасцю лавілі гукі.

А сляпы музыка ўсё іграў і іграў. Не чутно стала ў музыцы знаёмых матываў, усё было нейкім чужым, незнаёмым. Рэзаў вуха нейкі марш, аднастайны і надаедлівы, як камарыны звон. Чуўся плач, пакуты разгубленага чалавека па страчанай радзіме. Пачуўся заклік, спакойны, упэўнены. Потым пачалі адчувацца ноткі гневу, паволі паднімаўся чалавек на змаганне, гнеў нарастаў, білі громы; недзе далёка-далёка пачулася мелодыя знаёмай песні, яна набліжалася, чалавек паўставаў, ішла барацьба; усё часцей і часцей траплялі знаёмыя матывы. Ішло змаганне з аднастайным цягучым матывам чужое музыкі, знаёмыя матывы перабівалі, перамагалі.

Ад усяго гэтага павеяла такім цяплом, столькі было ўкладзена тэмпераменту ў выкананні, што людзі слухалі, як зачараваныя. Сляпы музыка не паспеў сыграць заключнага акорду, як пачуліся воплескі. Тарас ад нечаканасці аж падскочыў, ён не ведаў, што каля яго сабралася столькі народу. Людзі пасыпалі яму ў шапку грошы.

— От што, стары,—сказаў сальнік, калі людзі разышліся,—табе з тваёю музыкаю не памерці сваёю смерцю. У цябе ўсё ўсходнія матывы і на захад з імі не патыкайся. Далей я цябе не павязу. Досыць! А я і не ведаў, што на сваім возе і вязу сабе смерць.

— А ты што-ж думаў,—загаварыў гнеўна Тарас,— калі на тваім возе еду, дык каб і тваю песеньку спяваў? Не выйдзе!

— Гм... Торбы на плячах,—упікнуў сальнік,—а гонару не абярэшся. З кім маю гонар гаварыць? Перад табою пан Шмігельскі! Устаць!

— Адвык я ад гэтага, паночку,—усміхнуўся Тарас.—А размаўлялі вы з мужыком, Тарасам Вяршыніным, які даўно скінуў з свайго гарба пана...

— Плача па табе вяроўка,—працадзіў скрозь зубы Шмігельскі.

— А па табе горкая асіна, — сказаў злосна Тарас і падняўся.—Зноў на карак мужыку, ягамосцю, не ўдасца сесці. Прайшоў той час і ён больш ніколі не вернецца. Колькі, унучак, мы з табою зарабілі?

— На пуд хлеба будзе.

— Ну, то і добра, пакуль хопіць з нас, а там паглядзім. Застанемся ў гэтай вёсцы. Свет не без добрых людзей. Можа хто пусціць у хату, а не, дык цяпер і на дварэ не страшна.

Так і разышліся сляпы музыка з сальнікам, таму што ў кожнага з іх быў свой кірунак у жыцці. Сымонка абрадаваўся, што яны тут спыняюцца, бо яму ўжо абрыдла цягацца па свеце. Ён быў у нейкай падранай шапцы, праз якую тырчэлі выгарэўшыя на сонцы ва-

ласы. Твар яго быў худы і мурзаты, нос завастрыўся, губы пасінелі, толькі блакітныя вочкі гарэлі, іскрыліся жыццём. Сымонка ўзяў дзеда за руку, і яны моўчкі пайшлі проста ў вёску.

Сальнік хутка запрог каня, бо сонца ўжо было нізка, а яму яшчэ далёка ехаць, агледзеў воз, ці не ўкралі чаго жабракі, выбраў у буланага грыву з хамута, накрэсліў перад канём пугаўём крыж, узяў у рукі лейцы і тузануў каняку, на што той і вухам не павёў. Тады сальнік са ўсяе сілы з'ездзіў каню пугаўём па спіне, ускочыў на калёсы, яшчэ некалькі разоў сцебануў пугаю пад жывот і па нагах буланага і паімчаўся. «Ну і ён,— падумаў сальнік, гледзячы ў бок сляпога музыкі.—Такія людзі яшчэ больш небяспечны, чым паромшчык. Я яго ўпяку!»

Дзён з пяць жылі Тарас з Сымонкам на ўскраіне вёскі Лысая Гара ў хаце ўдавы Хрысціны, якая за абскарынкі (у яе не было хлеба) іх крыху агледзела, абмыла хлопчыка і абшыла, залатала старому кашулю і порткі. Яны крыху акрыялі і збіраліся пакінуць Лысую Гару. Але раніцаю, у той дзень, калі Тарас з Сымонкам намерваліся ісці ў суседнюю вёску, да двара Хрысціны пад'ехалі немцы. Яны схапілі Тараса з Сымонкам, выправадзілі Хрысціну, каб не было лішніх вачэй, доўга дапытвалі Тараса і Сымонку, моцна іх білі, адлівалі вадою і зноў білі, пакуль у саміх не забалелі рукі. Немцы змагліся б'ючы. Але Тарас з Сымонкам ні слова не сказалі, хто яны, адкуль і чаго сюды прышлі. Потым немцы вывелі іх за вёску, загадалі над абрывам выкапаць самім магілу і жывых засыпалі зямлёю.

---

Праз год у вёску Лысая гара, дзе былі замучаны Тарас з Сымонкам, прышла Совецкая армія. Першым увайшоў у вёску полк маёра Вяршыніна і спыніўся на прывал. Вяршынін апошнія дні страшэнна нерваваўся і шмат перажываў. Ён праходзіў крыху лявей сваёй

вёскі Астравок, але ўсё-ж туды заскочыў. Там дзе стаяла іх хата, парос быльнёг. Ад людзей ён даведаўся, што недзе павінен быць яго бацька і сын, што яны жабравалі. Выпадкам да яго ў полк трапіў партызан, які расказваў маёру, што, будучы па заданню камандавання паромшчыкам-сувязным, ён аднойчы перавозіў свенцянскага сальніка Шмігельскага і з ім на возе ехаў сляпы музыка з хлопчыкам. Вяршынін усюды іх шукаў. У вёсцы Лысая Гара сказалі маёру, што ва ўдавы Хрысціны некалі стаялі жабракі, стары іграў на скрыпцы, а хлопчык спяваў, потым іх схапілі немцы, доўга мучылі і жывымі пахавалі. У Хрысціны нават засталася скрыпка сляпога музыкі, але што скрыпка без душы, яна маўчыць. Прабавалі неяк мясцовыя музыкі на ёй іграць, дык яна толькі брынчыць, а ў сляпога музыкі плакала і спявала, выклікала гнеў і нянавісць, звала на змаганне.

Калі маёр Вяршынін зайшоў у хату да Хрысціны і пачаў распытваць пра жабракоў, яна кінулася ў сенцы і паказала яму скрыпку. На тыльным баку скрыпкі былі майстэрскі выгравіраваны дзве літары: «Т. В.». Скрыпка была яго бацькі.

— Тарасам звалі сляпога музыку? — запытаўся маёр.

— Ага.

— А хлопчыка?

— Пачакай, як-жа хлопчыка звалі, дай божа добрую памяць, — тужылася ўспомніць Хрысціна. — Хлопчыка звалі Сымонка. Ён казаў, што яго бацька ў войску, і ён ім надта ганарыўся.

— Мой бацька і сын, — прагаварыў цяжка маёр Вяршынін. Ён грузна апусціўся на лаву, моцна прыціснуў да грудзей скрыпку, а потым падняў уверх і пацалаваў. Некаторы час ён памаўчаў, а потым устаў і запытаўся: — А дзе яны пахаваны?

— Унь там, недалёчка, дзе расце бярэзінка, гэта я яе пасадзіла,—сказала Хрысціна, паказваючы ў акно.—

Жывымі... жывымі... хлопчык плакаў, так дзіцяці не хацелася паміраць, але не прасіўся, не, не...

Хрысціна, ідучы з маёрам да магілы, расказала яму пра апошнія дні жыцця яго бацькі і сына, іх пакуты і спадзяванні, аб іх чароўных песнях.

— Некалькі дзён не зачынялася ў нас хата, — апавядала Хрысціна. — Шмат потым нашых дзяцюкоў, якія церліся каля дзявочых спадніц, пайшлі ў лес...

— А як хлопчык, што ён гаварыў? — дапытваўся маёр.

— Хлопчык усё называў нейкага Валодзю і казаў, што ён адпомсціць і за маму, і за яго, і за сястрычку, і за ўсіх-усіх.

— Валодзем ён мяне зваў, — сказаў Вяршынін, — я яго так з малых год прывучыў.

Хрысціна паказала маёру магілу, якая амаль што была зраўнавана з зямлёю і зарасла ўжо травою. Каб не бярэзінка, цяжка было-б пазнаць, дзе тут была магіла. Маёр Вяршынін зняў шапку і стаў на калені. На яго абветраным, загарэлым салдацкім твары каціліся буйныя слёзы. Ён моўчкі рукамі нагроб на магілу зямлі, потым устаў, крыху пастаяў, схіліўшы галаву, узяў скрыпку і хутка пайшоў у бок вёскі Лысая Гара, каб паднімаць полк і зноў ісці ў паход.

*Люты, 1945 г.*
*г. Мінск.*

# Ганульчына гора

Чатыры доўгіх гады чакала Ганула звароту мужа з вайны. Не было таго дня, каб Ганула не ўспомніла пра Яўхіма, па якім сумавала. Марудна цягнуліся дні. Ганула нікому і ніколі не скардзілася на свой лёс (цяжка жанчыне адной гадаваць трое дзяцей!), яна цярпліва пераносіла нястачу і другіх суцяшала. А здаралася ўсялякае, часамі не было на стале кавалка хлеба і дзеці перабіваліся на бульбе з саладухаю.

— Гануля ўмее несці крыж пакуты, — казалі пра яе людзі, дзівячыся яе трываламу характару. Яна з малых год прывыкла да працы, у працы яна бачыла шчасце. Гануля была ў бацькоў адной дачкою і, яшчэ будучы дзіцем, дапамагала маці ў цяжкай сялянскай працы. Ганулі не страшна была аніякая работа, і каб не было яе, дык яна мусіць-бы горш сябе адчувала. А калі яна працавала, то забывалася на гора, якое было прынесена вайною.

Толькі пяць год пакрасавала Гануля за Яўхімам. Не паспела яна аглянуцца, як яны прайшлі. За гэты час у іх з'явіліся на свет дзве чарнявыя дзяўчынкі, якія былі падобны на бацьку, і ўжо напярэдадні вайны Гануля адчула пад сэрцам трэцяе дзіця. Белагаловы хлоп-

чык нарадзіўся, калі бацька быў у войску. Дзеці былі ўцехай для маці. Дзеля іх яна не разгінаючыся працавала. Ганула выхоўвала ў дзяцей павагу да бацькі, які недзе змагаецца за іх, каб імі ў жыцці ніхто не панукаў і каб жылі яны ў дастатку. Ва ўяўленні дзяцей іх бацька—герой, дый сама Ганула такім яго бачыла, ён-жа з першых дзён вайны быў на фронце.

Ганула і Яўхім па натуры былі маўклівыя і панурыя. Жартуючы пра іх казалі: «Чорт сем пар лапцей стаптаў, пакуль такую пару сыскаў», але яны адчувалі сябе добра і жылі ў шчасці. Яўхім быў заўзяты да работы, цягавіты. Яўхімаў бацька некалі меў зямлі—курыца гоні пераступіць,—у іх да каляд нехапала свайго хлеба, і жылі яны з заработкаў. Дарваўшыся ў калгасе да зямлі, Яўхім працаваў за двух. Пра яго гаварылі: «Яўхім ліпне да працы, як мухі да мёду». Дзеці таксама цягнуліся да работы. «Якое, — кажуць, — дрэва, такі і клін, які бацька, такі і сын». Але бацька не вымагаў ад дзяцей працы, наадварот, ён часта гаварыў: «Я не меў маленства, дык няхай хоць дзеці пабачаць... Пагуляйце, яшчэ паспееце напрацавацца... Ваша ўсё наперадзе...».

Ганула часта ўспаміналa словы Яўхіма і праганяла дзяцей, калі яны браліся за цяжкую працу. Яўхім быў вельмі акуратным чалавекам; яго ніколі не бачылі расхлістаным, калі ён яшчэ хадзіў у школу, а ўжо будучы бацькам, прывучаў дзяцей да акуратнасці. Помнячы гэта, Ганула глядзела за дзецьмі і сама заўсёды была ў чыстай, хоць часамі і палатанай, адзежы. Асабліва гэта кінулася ўсім у вочы, калі прышла Совецкая Армія; Ганула не толькі па-святочнаму адзелася, але людзі нават угледзелі прышпіленую палявую кветку да белай кофты. Ганула, якую ў Балатнянцы паважалі, першая паднесла совецкаму салдату букет, а за ёю дзяўчаты засыпалі вызваленцаў кветкамі.

Скончылася вайна, прыходзілі дадому пераможцы.

Іх сустракалі жонкі і дзеці, суседзі, імі ганарыліся і плакалі ад радасці. Усюды да іх адносіліся з пашанай, яны былі першымі гасцямі, іх запрашалі сесці ў кут. Шмат у Балатнянцы было мужчын у войску, і большасць з іх ужо вярнулася. І не было ні аднаго з балатнянскіх мужчын (ці то яны былі ў войску, або ў партызанах), якія-б не былі ўзнагароджаны. А Яўхіма Залескага ўсё не было, дый лістоў ён у апошні час не слаў. Ганула, і кладучыся спаць і ўстаючы, успаміпала Яўхіма, з дня на дзень чакаючы яго звароту.

І вось аднойчы, перад нядзеляй, цёмнай восеньскай ноччу вярнуўся Яўхім з паходу. Ганула па ўмоўленаму даўно стуку ў шыбу пазнала, што гэта ён, але ўсё-ж спыталася: «Хто-о?» і пачула блізкі сэрцу голас. Яна хутка адчыніла дзверы і запаліла лямпу. Яўхім і так быў чорным, а тут яшчэ адгадаваў вялізныя вусы (гонар салдата!), да таго-ж загарэлы, абветраны ўсімі вятрамі твар — зусім змянілі аблічча чалавека. Але карыя вочы былі ўсё тыя-ж, яны, здавалася, усміхаліся. Забілася сэрца ў Ганулі, затрапяталася, як не вырвецца з грудзей. З рук выпаў пачак запалак, забразгацеў. Ганула і не заўважыла, што не прыкруціла кноту, языкі агню пацягнуліся ўверх, пацямнела шкло.

— Яўхімка! — толькі і сказала Ганула, яна цалавала яго ў губы і бровы, вочы і шчокі. — Мой родны!

Яўхім абняў Ганулю, прыціснуў да грудзей і пацалаваў, потым падняў запалкі і падкруціў кнот ў лямпе. Яўхім гладзіў ганулінны русыя валасы, якія пасмамі аблеглі шыю, і нібы ўспамінаў, ці такія яны былі, калі ён Ганулю пакінуў, паглядзеў у яе адкрытыя сінія вочы, прыціснуў яе да сябе і яшчэ пацалаваў.

Ганула, нібы апамятаўшыся, кінулася распранаць Яўхіма, сцягнула салдацкія боты і падала валёнкі. У хаце было крыху халаднавата, і Яўхім застаўся ў безрукаўніку. Спалі дзеці. Ганулі прыемна было, як Яўхім углядаўся ў твары дзяцей, а потым іх асцярожна,

каб не разбудзіць, цалаваў. А хлопчыка Яўхім нават не ўтрымаўся, каб не крануць рукою. Ён гладзіў яго попельнага колеру валасы.

— Яўхімка! — шаптаў бацька, ён быў задаволены, што маці назвала сына яго імем. — Свісь на дуба! — ён часта без дай прычыны гаварыў гэтыя словы, а таму ў вёсцы гэта была яго мянушка.

— Яўхімка стары! — задаволеная, турбуючыся каля печы, гаварыла Ганупя. — Не будзі Яўхімку малога. А каб ты ведаў, татка, які ён у нас смешны. Калі ў яго запытаюць, дзе бацька, дык ён адказвае: «юе, ёй»; гэта значыць — ваюе, герой.

І шчаслівыя бацькі засмяяліся.

— А ты што, маці, хочаш рабіць?

— Спяку яешню.

— Не трэба, — гаварыў Яўхім, распакоўваючы рэчы. Ён дастаў падарункі жонцы і дзецям. — Сёння як бог даў, а заўтра... А гэты скрутак, маці, схавай...

— Добра, — узяла скрутак Ганупя і палажыла ў сундучок, яе радасці, што прышоў муж жывы і здаровы, не было межаў. — А сала, бацька, будзеш есці?

— Свісь на дуба! — пасміхаючыся, гаварыў Яўхім. — Хто гэта з тутэйшых людзей не есць сала, гэта, можна сказаць, апірышча сілы, а трываласць ад яго якая. Ого, сала! А як, можна есці на поўную губу? Ці можа яно ў цябе толькі дзеля закрасы? На затаўку ў капусту?

Сёлета ў хаце не зводзілася. А тыя гады, але што казаць... горшае перажылі... каб яно болей ніколі не вярнулася...

— Дык у мяне недзе было поўкварты.

— Няхай твая на потым... Я для цябе прыпасла «Беларускай застольнай»... Кажуць, ніштаватая на смак і мацунак мае...

— Сапёр любіць мацунак... Неяк, па пояс у ледзяной вадзе, я наводзіў пераправу... Меркаваў, выйду са строю... Падышоў генерал і загадаў даць спірытусу...

Цяпнуў гэта я, пайшло цёплае па жылах... І ці паверыш, нават не было катару...

Ганулярэзала сала, пакроіла хлеб, паставіла пляшку; яны выпілі па чарцы, па другой і гаварылі, пакуль месяц не выглянуў у другое акно, што было ад вуліцы. Ганулярасказала, як яна жыла пры немцах, часам зацірцы была рада, але не гэта страшна, горш за ўсё, што немец здзекваўся з чалавечай годнасці. «Як настане дзень, — гаварыла Ганулю, — дык уся перакалоцішся. Як толькі скажуць: «немцы!», хапаеш дзяцей і ў лес. Туды ўсе бягуць: і людзі, і каровы, і коні. Усё жывое ўцякае. І так тры з паловай гады, сёння жывеш і не ведаеш, што з табою будзе заўтра». Яўхім падумаў: «Цяжкі шлях тутэйшай жанчыны, але яна прайшла яго з гонарам». Трэція пеўні праспявалі, калі яны леглі спаць.

Раніцаю Ганулю першай праснулася і адразу ўстала, бо ўжо сонца паднялося і свяціла ў чалесніку. Ганулю шкадавала, што ўвечары больш яна гаварыла, ёй хацелася, каб Яўхім расказаў усё-усё, дзе ён быў і што бачыў, як людзі жывуць на свеце. Ганулю падышла да лавы, там ляжала прапітаная потам і пракураная махоркай салдацкая гімнасцёрка. Калі Ганулю ўзяла яе ў рукі, дык заўважыла, што на грудзях не тое, што якой узнагароды, а нават і знаку ніякага не было.

«Вось табе і герой! — падумала сама сабе Ганулю, відаць, ён блага ваяваў, калі нічым не адзначаны, а потым усміхнулася. — Толькі таго клопату, добра, што сам жывы і здаровы. Навошта простаму чалавеку слава?»

І ўсё-ж, — у яе запала сумненне, — розум гаварыў адно, а сэрца другое. Яна скамячыла гімнасцёрку і кінула пад лаву. Неяк крыўдна стала, няўжо ён горшы за другіх? Хоць і не ўсе ўзнагароджаны, а можа чалавеку не пашанцавала. Яе непакоіла, як успрымуць гэта дзеці, яны чакалі бацьку-героя. Колькі ў Балатнянцы

гаварылі, што «Свісь на дуба» прыдзе з вайны ўвесь у ордэнах і медалях. Выходзіць — ён не ваяваў, а так недзе аціраўся. «— Як-жа тады зразумець, — думала Ганулля, — што ён пісаў: «Нарэшце наша часць дасягнула Мамаева ўзвышша, а там Сталінград... уварваліся ў цэнтр горада... горы фрыцаў натрушчылі... Самога Паўлюса ўзялі ў падвале Цэнтральнага ўнівермага з усім яго штабам і бэбахамі... Наш полк узнагароджаны... Пераплыў з двума таварышамі Дняпро, трэці моўчкі пайшоў на дно, але не крыкнуў і гэтым не выдаў нас немцам... Атрымаў ад таварыша Сталіна падзяку... Фарсіравалі Віслу, ідзем у абход Варшавы... Штурмам узялі Берлін...» Ганулля кінула погляд на Яўхіма, ён спакойна спаў. Яна мімаволі зноў падняла гімнасцёрку, пакруціла ў руках, з кішэні выпаў мядзяны пятак, бразнуўся аб падлогу, зазвінеў і пакаціўся пад ложак. Ганулля са злосцю кінула гімнасцёрку. Яна дастала чыстую бялізну, касцюм і палажыла на лаве. «Во-о-ой, будзе ў мяне па гэтым балець галава, — падумала Ганулля. — Простаму чалавеку не да гонару. От добра, што будзе дзецям бацька». Аднак, усё-ж рупіла Ганулі даведацца, няўжо-такі яе муж быў апошнім чалавекам на вайне, што нават медалю не заслужыў. Яна перавярнула ўсе рэчы і так-такі нічога не знайшла. Ганулля падумала:

«Каб ведаў чалавек дзе ўпадзе, падаслаў-бы саломы... Дзецям-бы ў вушы не ўводзіла... Ніколі я не думала, што буду па гэтым пакутаваць... Я-ж чакала толькі яго... А прышоў ён, дык каб яшчэ...».

Прачнуўся Яўхім і спытаўся:

— Як у цябе, маці, з дровамі?

— З воз галля ёсць і сухое, але ненасечанае, — суха адказала Ганулля.

— То што-ж ты мяне не будзіш? — ён хутка ўстаў і адзеў боты. — А дзе-ж мая гімнасцёрка?

— Унь! — паказала Ганулля пад лаву.

— Чаму яна там апынулася? — беручы гімнасцёрку, спытаўся Яўхім.

— Брудная, — адказала Ануля, гледзячы ў другі бок. — От, адзявай лепей касцюм.

— Я ад яго адвык.

— Дык трэба прывыкаць.

— Эт, потым пераадзенуся.

— Як сабе хочаш.

Яўхім адзеў гімнасцёрку, падперазаўся і збіраўся ісці на двор. Прачнулася старэйшая дзяўчынка, яна пазнала бацьку і кінулася да яго ў абдымкі.

— Ну добра, дачушка, я толькі маці дроў накалю і прыду, — Яўхім узяў сякеру і вышаў. На дварэ быў замак. За ноч сцягнула ваду, за рэчкай пабялела трава. У падпаветцы не было парадку, валяліся карчы, якіх жаночыя рукі не маглі рассекчы, на іх было шмат метак ад сякеры. Яўхім некалькі разоў спрытна сакануў, і корч разляцеўся напалам.

Ануля дастала з-за коміну карчагі, адкрыла засланку і стала чыркаць запалку, якая адсырэла і не загаралася.

— Мама, а чаму ў нашага таты няма ніякіх заслуг? — спыталася, як старая, дзяўчынка.

— Бо такі наш тата, — адказала Ануля, у яе закалаціліся рукі і патухла запалка. Маці потым паправілася: — Салдатаў шмат, дачушка, усе не могуць быць заслужанымі.

Анулі запытанне дачкі проста было непрыемным. Не клеілася ў Анулі каля печы, перш паляцела качарга, потым пляснулася чапяла і нарэшце зазвінела засланка. У хату, з бярэмем дроў, увайшоў Яўхім, ён заўважыў, што жонка нечым нездаволена, але падумаў—можа ў печы не ладзіцца.

— От добра, а то ў мяне дровы не гараць, а пішчаць, — захоўваючы ўсхваляванасць, сказала Ануля.

Яна хацела выціснуць усмешку, але ў яе нічога не вышла.

Падняўся хлопчык, дзіця вялізнымі вачыма глядзела на незнаёмага яму чалавека. Яўхім падышоў да сына і хацеў узяць на рукі. Хлопчык пацёр кулачкамі вочы і скрывіўся.

— Гэта твой бацька, — сказала Гануля.

— Ну, ідзі да мяне, — гаварыў Яўхім, беручы дзіця. Ён спытаўся ў сына. — Дык хто твой бацька?

— Ей, — нясмела адказаў хлопчык.

Бацька зарагатаў, а Гануля адвярнулася да чалесніку, яна не хацела сустрэцца вачыма з мужам, каб не ўпікнуць, што ён дрэнна ваяваў.

«І чаму гэта на свеце так робіцца? — думала сама сабе Гануля. — Чакала яго, радавалася сустрэчы, а цяпер сумую. Чалавек мусіць ніколі не бывае задаволены. Добра, што ён прышоў, дык хацелася-б яшчэ... Хоць у гэтым няма нічога дрэннага, мне-ж таксама хочацца за ім пакрасавацца. А простаму чалавеку хіба нічога не трэба для душы? Мы-ж вышлі цяпер у людзі!» Хлопчык хутка з бацькам падружыў і ўжо цягаў яго за вусы. Яўхіму, які наглядаў за Гануляй, ясным стала, што ў яе нешта большае, чым нелады каля печы. «А можа яна незадаволена падарункамі, — падумаў Яўхім, — дык дзе я ёй лепшых вазьму?»

Яўхіму хацелася загаварыць з Ганулян, каб высветліць у чым справа, але ён не ведаў з чаго пачаць.

Дык кажаш ва ўсіх у Балатнянцы ўжо ёсць каровы? — добра.

— Добра, але не зусім,—запярэчыла Гануля, яна дадала: — А калгасны хлеў усё яшчэ пусты. Калі не будзе жывёлы, то не будзе і хлеба. А ў нас некаторыя толькі дбаюць пра сябе, ужо займелі па другой карове...

Яўхім не пазнаваў жонку, у яе адбыліся нейкія змены, якія ён яшчэ і сам не ўяўляў.

На вуліцы пачулася гамонка, збіралася радня, суседзі.

---

— Хоць-бы пераадзеўся, — перамагаючы боль, гаварыла Ануля. — Сорамна будзе перад людзьмі... Такі-ж ты з перамогай вярнуўся... Адзявай, Яўхімка, касцюм...

— Сёння яшчэ пабуду ў вайсковай адзежы, — гаварыў Яўхім.—Няхай людзі паглядзяць...

— Няма чым хваліцца, — не вытрымала Ануля, каб не папракнуць яго.

— І чаго ты пстрыкаеш? — загарэўся Яўхім. — Ануч мала прывёз? Дык-жа я, можа, не ў заработках быў.

— Толькі таго клопату — анучы... Будзе ў мяне па іх балець галава...

— Дык чаго цябе дрэнчыць?.. — Яўхім незадаволена паглядзеў на Анулю і вышаў у камору, каб пераадзецца, бо ўжо людзі былі на дварэ.

Збіраўся народ, як на ігрышча, так у Балатнянцы было заведзена, што кожны лічыў за абавязак наведаць салдата, пагаварыць, пачуць, што робіцца на свеце, даведацца, як людзі жывуць.

Жартавалі мужчыны:

— Нешта сёння гаспадыня спазнілася?

— Вядома, гаспадар з'явіўся.

— Дый аладкі чамусьці не пякуцца?

— Нечым Яўхім не дагадзіў!

— А такі сёння Ануля не такая, як заўсёды... дзе толькі дзеўся яе спрыт...

— Па вачах бачу, — загаварыў стары, — што ў Анулі нейкае гора...

— Дровы доўга не ўгараліся, — апраўдвалася Ануля. — Аладкі не пякуцца.

У сенцах пачулася хада Яўхіма. Ануля ўздрыганулася, яна падумала: «Ну чым мае дзеці горшыя за

другіх, каб пахваліцца, што іх бацька—герой». Погляды родных і суседзяў былі накіраваны да дзвярэй, адчувалася нейкая ўрачыстая цішыня. Адчыніліся дзверы, Яўхім паклікаў Ганулю і нешта стаў ёй гаварыць.

— Скрутак? — перапытала Ганула. — А я сама не ведаю, куды палажыла. А-а-а! Я меркавала, што там бялізна і кінула ў сундучок.

Ганула хутка дастала скрутак і падала Яўхіму, яна спяшалася ісці ў хату, каб не нагаварыць чаго-небудзь непрыемнага мужу. Яўхім разгарнуў скрутак, там былі тры салдацкіх ордэны «Слава» і некалькі медаляў, якія ён атрымаў перад самай дэмабілізацыяй і не хацеў адзяваць на старую гімнасцёрку. Ганула вялізнымі здзіўленымі вачыма глядзела на Яўхіма, прайшлася па твару радасная ўсмешка, густа пачырванелі шчокі.

— Даруй мне, Яўхімка, — гаварыла ўсхвалёваная Ганула, дапамагаючы мужу прымацаваць ордэны і медалі, — дрэнна я пра цябе падумала... А мне здалося, што ты быў не сапёрам, а абознікам... І як часам бывае на вайне, выхваляўся — мы ваявалі!..

— Прызнацца па праўдзе, што і я пра цябе не лепш падумаў, — усміхнуўся Яўхім. — Мне на момант здалося, што ты належыш да тых жанчын, якія бачаць шчасце ў анучах... Выходзіць, колькі мы разам пражылі, а яшчэ добра не ведаем адно другога... Не дарэмна людзі кажуць: «Каб чалавека пазнаць, трэба пуд солі з'есці...»

Яны зайшлі ў хату.

— Ей, — махаў хлопчык ручкамі, — на юі Імку...

— Што ён кажа? — спытаўся бацька.

— Герой, вазьмі на рукі Яўхімку, — растлумачыла, пасміхаючыся, маці.

— Ну, свісь на дуба, хадзі! — беручы на рукі сына, гаварыў Яўхім.

— Дык вось яно якое, ганульчына гора, — сказаў

стары. — Я то гляджу, такая гаспадыня і аладкі не пякуцца, а смажацца.

— І скажы ты, — прадаўжаў барадаты мужчына, — якія ў нас пайшлі жанчыны... Паспрабуй каторы ў навальніцу ў кустах адседзецца, то цябе і на парог не пусцяць...

— Дый пра калгасных кароў яна ўчора праўду сказала, — разважаў стары. — У калгасным хлеве ні хваста... трэба нам гэтую памылку як найхутчэй выправіць...

Гануля, завіхаючыся, рыхтавала снеданне. У хаце было поўна гамонкі. Людзі меркавалі як наладзіць гаспадарку, каб зажыць яшчэ лепей, чымся да вайны.

*Люты, 1946 г.*
*г. Мінск.*

## Сям'я Белавуса

Нас было пяць чалавек, што ў адзін з ліпеньскіх дзён сорак чацвертага года, у нядзелю, пасля трох з паловай год вайны, сустрэліся ў родным горадзе Мінску. Мы былі ўзрушаныя,—вядома, адчулі пад нагамі хоць параненую, але сваю зямлю, якая нам стала яшчэ даражэйшай. У горадзе было ціха, як пасля навальніцы. Па цэнтральнай вуліцы прагналі некалькі чалавек палонных немцаў, іх канваіравала русакудрая дзяўчына з ружжом.

— Вось яны, «вышэйшая раса»!..—заўважыў адзін наш сябра.

— Даваяваліся! — сказаў другі.

— Так будзе з кожным, хто не ўлічыць урокаў гісторыі,—разважаў трэці.

— Надзейка!—крыкнуў чацверты. Ён зняў капялюш, пакланіўся дзяўчыне і спытаўся:—Адкуль вы іх выпаралі?

— З сутарэнняў, зашыліся, як мышы,—адаказала дзяўчына з ружжом. Усміхнуўшыся, яна паказала свае белыя, як часнок, зубы.

Мы прайшлі ў гарадскі сквер і селі на лаўцы. Усё тут нагадвала аб вайне. Увесь сквер быў перакапаны,

павыварачваны, павыразаны таўшчэзныя дубы, клёны і ліпы, пабіты статуі; а навокал, на руінах, паміж цаглін прабівалася трава. Недалёка ад цэнтральнай плошчы горада расло жыта, якое хвалямі пераліваласяна сонцы. Прайшоўся лёгкі ветрык, апаў скарабачаны дубовы лісток, яго падхапіў вецер і пагнаў па алеі, на якой, акрамя нас, нікога не было. На вачах у маіх сяброў была заклапочанасць і нейкая захаваная туга. Мы пачулі гудок і ўстрапянуліся, на тварах маіх сяброў паказаліся вясёлыя ўсмешкі,—гэта прышоў у горад першы цягнік. Мы гаварылі пра аднаўленне народнай гаспадаркі, пра адбудову гарадоў і вёсак, пра недахоп рабочай сілы, выказвалі меркаванні, што патрэбна будзе не менш пятнаццаці год, каб адбудаваць толькі стольны горад.

— А ведаеце, гэта будзе значна раней,—раптам загаварыў адзін наш сябра, ужо ў гадох мужчына.—Народ наш працавіты, ён здольны рабіць цуды! Хочаце, я раскажу вам пра адну сям'ю?

— Будзьце ласкавы,—прасілі мы яго.

І наш сябра пачаў апавядаць.

* * *

— Я прыехаў у горад на трэцюю ноч пасля яго вызвалення ад немцаў,—пачаў ён.—У маёй кішэні ляжала паперка, што я прызначаюся галоўным інжынерам завода, на якім я і раней працаваў. Злезшы з папутнай машыны на ўскраіне горада, я падаўся ў напрамку да свайго завода. Дарога мне была знаёмая, але я адразу заблытаўся: так усё стала непадобным да таго, што я ведаў, як уяўляў сабе свой горад. Страшна чалавеку ноччу ў разбураным горадзе, горш, чым у лесе ці на моры. У каробках дамоў, што, як шкілеты, параскіданы, завываюць вятры, пастуквае і ляскаціць бляха, якая завісла на сценах. Калі-ні-калі пройдзе чалавек, сям-там бліснеў сутарэннях агеньчык, які напамінае, што горад не зусім мёртвы, што ў ім яшчэ цяпліцца жыццё.

— Можа-б я ўсю ноч праблукаў паміж руінамі,— працягваў ён далей апавядаць,—але выплыў месяц, і я сяк-так—аднаўляючы ў памяці ўжо не выгляд вуліц, але іхнія напрамкі—дабраўся да таго месца, дзе колісь быў завод. Гэтае месца было абгароджана калючым дротам у адну столку, а за дротам узвышаліся горы шчэбню і цэглы, і толькі нейкім цудам на заднім плане ўцалелі два карпусы. Завод, на якім прайшлі мае лепшыя годы, нагадваў мне разбуранае гняздо. Не ведаючы, куды дзецца нанач у незнаёмым зараз і разбітым горадзе, я рашыў пераначаваць на тэрыторыі завода: усё-ж такі гэта сваё прадпрыемства. Я пайшоў уздоўж агарожы, спадзеючыся дзе-небудзь пералезці на той бок, і тут я заўважыў, што насустрач мне ідзе чалавек з ліхтаром «лятучая мыш», і я падышоў да гэтага чалавека.

— Хто вы і што тут робіце?—спытаўся я.

— Як што?—здзівіўся ён і навёў на мяне ліхтар.— А-а-а, Віктар Андрэевіч! Няўжо мяне не пазналі? Я правяраю варту завода. Вы адкуль? Чаму ў такую позняю пару не спіце?

— Калі не памыляюся, Сцяпан Захаравіч Белавус?— няўпэўнена пытаюся я.

— Так,—сцвердзіў ён, і мы абняліся і пацалаваліся.

Я адчуваў сябе няёмка, што яго не пазнаў. Гэта быў майстра завода. Мы зайшлі ў будку. Пры святле ліхтара я яго разгледзеў. У яго звісалі каштанавага колеру вусы, адгадаваныя за вайну, на ілбе і каля вачэй былі глыбокія маршчыны. Як высветлілася, гэта ён, Сцяпан Белавус, абараніў уцалелыя карпусы завода ад немцаў, не даў ім узарваць, ці спаліць іх, а потым паставіў варту і штоноч сам правяраў, каб вартаўнікі не спалі, бо па горадзе яшчэ бадзяліся пераадзетыя немцы. У будцы стаяла бляшаная нямецкая печ, а пад лаўкамі ляжала безліч розных дробных дэталяў, асобна ўзвышаліся грудкі шруб, раскладзеных па калібрах, ляжалі паіржа-

велыя цвікі, усё гэта было сабрана стараннымі рукамі майстра.

Шмат на якіх заводах я працаваў, багата бачыў людзей, але такія, як Сцяпан Захаравіч, не часта мне траплялі. Гэта чалавек адменны. Яго дзед яшчэ ў прыватных майстэрнях быў кавалём, бацька—на заводзе слесарам, а сам майстра на ўсе рукі: што ні возьме, тое і зробіць.

Сцяпан Захаравіч робіць без крыку і мітусні. Ён ведае, чаго хоча, а таму не спыніцца і не апусціць рук пры першай няўдачы. Ён кажа, што: «лёгка нічога не даецца», і не любіць рабіць тандэтна. Сцяпан Захаравіч у другі раз паспрабуе зрабіць, у трэці, але даможацца свайго. Будучы ў лесе, у майстэрнях па рамонту зброі, Сцяпан Захаравіч даведваецца, што яго старэйшы сын, Максім, філолаг па адукацыі, ідзе ўзарваць завод, дзе немцы наладзілі рамонт танкаў, міна аказалася сапсутай, і Максім гіне, не выканаўшы задання, гіне, як салдат. Тады Сцяпан Захаравіч робіць сам міну і пасылае сярэдняга сына, Барыса, студэнта-медыка, гэты бліскуча выконвае пастаўленую перад ім задачу.

— Ага, цікава, — успомніў наш апавядальнік, — як сям'я Белавуса апынулася ў лесе. У першыя месяцы вайны ў іх быў своеасаблівы шпіталь. Чатырнаццаць нашых воінаў у іх лячыліся, доктарам быў сярэдні сын, Барыс, сёстрамі—маці і дачка, Надзейка, а бацька клапаціўся, каб быў кавалак хлеба на стале. І вось аднойчы па горадзе гналі партыю палонных чырвонаармейцаў, а тых, хто не мог ісці, немцы прыстрэльвалі. Уся Савецкая вуліца аж да Дома друку была ўслана трупамі. Сям'я Белавусаў жыла на ўскраіне горада, да іхняй суседкі шмыгнуў адзін ваеннапалонны. Суседка бачыла, што ён схаваўся ў агародзе. На двор да яе ўскочыў немец, прыставіў да грудзей аўтамат і патрабаваў, каб яна сказала дзе ўцякач. Напалоханая суседка махнула рукой у той бок, дзе падняўся чырвонаармеец. Ваеннапалонны, прыгінаючыся, пабег далей. Немец даў чаргу з аўтамата і

хутка пайшоў даганяць калону. Сям'я Белавуса падабрала смяртэльна параненага чырвонаармейца і, як высветлілася, гэта быў сын суседкі, але ён, калі прышоў у сябе, прасіў нічога не казаць маці, што яна выдала немцам свайго роднага сына. З таго часу сям'я Белавуса стала асцерагацца суседкі, старалася не мець з ёю ніякіх спраў. Гэта паказалася суседцы крыўдным і яна, калі «паліцаі» сталі дапытвацца, куды дзеўся труп забітага палоннага, сказала, што яго падабрала сям'я Белавуса. Адчуўшы пагрозу, сям'я Белавуса хутка пакінула горад, і яны ўсе падаліся ў лес.

— А што з суседкай?—не вытрымаў адзін наш сябра, каб не запытацца.

— Калі суседка даведалася, што гэта быў яе сын, яна звар'яцела, доўга блукала па горадзе, а потым бясследна знікла, мусіць, яе немцы знішчылі,—адказаў апавядальнік.—А чырвонаармейцы разышліся хто куды, але ўмовіліся, хто застанецца жывым, сустрэцца.

Я з Сцяпанам Захаравічам працаваў на заводзе да вайны каля дзесяці год, але добра не ведаў гэтага чалавека. У нас з ім было шапачнае знаёмства, а шкада. Упершыню мы з ім у будцы, ядучы з кацялка бульбу, па душах пагаварылі. Гэта чалавек вялікага сэрца і чыстай душы. Па-праўдзе сказаць, я інжынер, дырэктар завода, багата ўзяў ад яго і, што грэх таіць, у аснову адбудовы завода пакладзены думкі гэтага простага чалавека.

Мы з Сцяпанам Захаравічам за размовамі прасядзелі ў будцы аж да самай раніцы, а потым пайшлі да яго на кватэру. Я ахвотна прыняў яго прапанову, бо мне не было дзе дзецца. Сцяпан Захаравіч цяпер жыве за вакзалам, па Бондараўскім завулку, у невялікім драўляным асабняку. Кругом яго дома расце сад, абгароджаны шчыкетам, каля якога шмат кветак. Ветліва нас сустрэла гаспадыня, маці васьмярых дзяцей, лічачы і старэйшага забітага сына. Кватэра іх не багата абстаўлена, але ўтульна і чыста.

З апавяданняў ваеннага часу мне больш за ўсё спадабалася, як сын Сцяпана Захаравіча, Барыс Белавус, студэнт апошняга курса Медыцынскага інстытута, які быў у лесе хірургам, аднойчы, пераадзеўшыся ў афіцэрскую форму, у Шкадарэвічах арыштаваў нямецкага падлізніка і загадаў яго павесіць. І яго сястра, Надзейка, малады педагог, была тады пры ім нібы за перакладчыцу. Немцы доўга не ведалі, што гэта быў за маёр, які самых надзейных іхніх людзей пакараў. А гэта добрая навука была для іншых, ніхто не хацеў больш ісці да іх на службу.

Па зросшыхся на пераноссі густых рыжых брывях відаць, што Сцяпан Захаравіч цвёрдай волі чалавек. І гэта адчуваецца ва ўсім: у яго паходцы, укладу жыцця, звычаях; ён бязмежна любіць сваю сям'ю і ганарыцца ёю. У хаце яго слова—закон, дзеці любяць і паважаюць яго. І мне здалося, што яго сын Барыс нават імкнецца так хадзіць, як ходзіць яго бацька і так з людзьмі размаўляць, як яго бацька размаўляе. Крокі ў Сцяпана Захаравіча шырокія, цвёрдыя, гаворка разважлівая. Сцяпан Захаравіч цікавы субяседнік і ўмее другіх слухаць.

На снеданне была мачанка з блінамі і чарка. Прызнаюся, ці то мне моцна хацелася есці, але я ніколі не еў такой смачнай ежы. Пасля снедання, акрамя бацькі і маці, якія былі заняты мною, уся сям'я Белавуса, як мурашкі, працавалі. Меншыя дзеці капашыліся на агародзе, большыя—пілавалі, калолі і складалі дровы. Спорна ішла праца, што я пазайздросціў, і мне захацелася выйсці да іх размяць косці.

Я заўважыў, што ў сям'і Белавуса шмат розных інструментаў і, як высветлілася, усе старэйшыя іх дзеці да вайны вучыліся, але ў вольны час працавалі фізічна і мелі сваю прафесію, якую, па словах Сцяпана Захаравіча, за плячамі не насіць. Філолаг адначасова быў

столярам, медык працаваў некаторы час слесарам, і так усе меншыя дзеці. Кожны з іх меў спосаб жыцця.

— Ці мала што на вяку чалавека здарыцца, трэба, каб чалавек умеў усё рабіць, тады ніякія выпрабаванні не страшны,—гаворыць Сцяпан Захаравіч.—Чалавек павінен ведаць, на чым хлеб расце, як цяжка яго здабываць, тады ён будзе паважаць працу другіх людзей.

Сцяпан Захаравіч, будучы ў партызанах, схадзіў уздоўж і ўпоперак усю Беларусь. Каб вы паслухалі, з якой любасцю і замілаваннем ён расказвае пра дрымучыя лясы Беларусі, яе сінія азёры і ціхія рэчкі. Ён бачыць гарады свайго краю ўсе ў зелені, дарогі абсаджаныя пладовымі дрэвамі. Усюды, на яго думку, павінны быць пастаўлены помнікі людзям, якія гэтага варты, што ў зацятай барацьбе з шматлікімі ворагамі адстойвалі сваю свабоду. А іх шмат, яны праз вякі пранеслі сваю культуру, змагаліся, каб людзьмі звацца, і адстаялі сваё права.

— Мы не Іваны, якія нічога не помняць,—разважае Сцяпан Захаравіч.—У нас былі і ёсць людзі, якімі мы павінны ганарыцца.

Ён бачыць узвышэнне нашых людзей, асабліва ў часе гэтай вайны, дзе паказана іх нацыянальная гордасць і веліч. Людзі пазнаюцца не на парадах, а ў барацьбе з ворагам,—там праяўляецца веліч духу народа.

— І чаго-б мы былі варты седзячы ў лесе, каб нас не падтрымалі людзі?—пытаецца Сцяпан Захаравіч і сам адказвае:—Нас-бы немцы перабілі, як курапатак. Народ ваяваў з немцамі, карміў нас, паіў і адзяваў. Дзякуй яму!

— Нашы людзі ўмеюць не толькі ваяваць, але і будаваць,—разважае Сцяпан Захаравіч.—Яны з маленства прывыклі да працы. Паглядзіце, колькі ў часе аднаўлення краіны з'явіцца новых герояў! Нашага чалавека толькі заахвоціць трэба, ён здольны рабіць цуды.

Слухаючы яго, я захапляўся веліччу нашых людзей, хараством свайго краю, уяўляў тыя сямісотгадовыя

дубы, якім ніякія навальніцы не страшны; гонкія сосны, верхавіны якіх амаль не ўпіраюцца ў сонца; прасторы палёў, што вокам не акінеш; роўныя, як струна, дарогі, абсаджаныя яблынямі і ігрушамі; сінія азёры, запруджаныя залацістым карпам; асушаныя балоты, дзе вышэй чалавечага росту калышацца пшаніца; тлустыя статкі кароў; белыя камяніцы ў калгасах; электрастанцыі, гмахі заводаў, зялёныя гарады. Я паверыў яму, што хутка нашы гарады будуць найпрыгажэйшымі ў свеце. Гэта такі будзе. Я веру, што яшчэ наша пакаленне ўгледзіць наш стольны горад ва ўсёй яго красе і славе. Гэту веру ў мяне ўсяліла сям'я Белавуса. І я скажу: дзякуй ёй! Яна мяне навучыла, што неабходна вучыцца ў мас.

— Кожны, каму што даручана, рабі добра, — гаворыць Сцяпан Захаравіч,—і раны, нанесеныя вайною, хутка будуць загоены і шмат раней, чымся мы думаем. Наша партыя вывела народ з найвялікшай у гісторыі вайны пераможцам, яна справіцца з аднаўленнем народнай гаспадаркі і прывядзе народ да вышыні славы— комунізма.

І сапраўды, калі я сюды ехаў, дык меркаваў, што для таго, каб пусціць завод, патрэбны будуць годы, а мы ўжо яго пусцілі. А пусцілі мы яго таму, што ў нас такіх, як Сцяпан Захаравіч Белавус, мільёны. Праўда, яшчэ ёсць такія, што перашкаджаюць нам, яны і ў часе вайны былі,—бо хуткі струмень заўсёды і шчэпкі нясе,—але ніхто і нішто не спыніць рух чалавека ў светлае заўтра.

* * *

Мы яшчэ-б сядзелі, але па вуліцы з гоманам прайшоў натоўп, сярод іх было шмат людзей у вайсковай форме. Наш сябра падняўся і сказаў:

— Гэта і будзе сям'я Белавуса. Яны аглядаюць горад. Мы ўмовіліся тут сустрэцца.

— Дык там-жа цэлая рота, — здзівіліся мы.

— А гэта ў іх на сёння прызначаны злёт усіх, хто ў жывых застаўся, якіх яны ад смерці ўратавалі. Усе яны завуць Сцяпана Захаравіча і яго жонку, Барбару Адамаўну, бацькамі... Між іншым, і сын суседкі тут...

Наш сябра зняў капялюш і пакланіўся нам. Ён пайшоў да іх. І мы ўсталі і пайшлі ў той бок, каб паглядзець на сям'ю Белавуса, гутарка пра якую так узварушыла нашы думкі.

*Кастрычнік, 1945 г.*
*г. Мінск.*

ЗМЕСТ

| | Стар. |
|---|---|
| Перад бурай | 3 |
| Партбілет | 21 |
| Максімка | 27 |
| Сымоніха | 42 |
| Дзве сястры | 48 |
| Зары насустрач | 67 |
| Чаму-ж мне не пець | 91 |
| Сляпы музыка | 98 |
| Ганульчына гора | 112 |
| Сям'я Белавуса | 123 |

---

*На белорусском языке*

*Илья Гурский*

**ЗАРЕ НАВСТРЕЧУ**

Государственное издательство БССР
Минск 1949

Рэдактар *М. Чаускі*
Тэхрэдактар *Л. Прагін*
Карэктар *А. Даніловіч*

АТ 02244 Падпісана да друку 27/X-49 г. Тыраж 10000 экз.
Папера 70×108/32 Вуч. выд. арк. 5,7 Друк. арк. 4 1/8 Зак. 300.

Друкарня імя Сталіна, Мінск, Пушкіна, 55.

30

Цана 4 руб. 45 кап.